ARCHE Зьмест № 1’2001 СКАРЫНА

1. Зьмест / Уводзіны
2. Найбольшае інтэлектуальнае ашуканства. Юрась Лаўрык у ARCHE 1(15)-2001. "...Калісьці, падлеткамі, мы зь сябрамі часам пакеплівалі з чыйгосьці прэтэнцыёзнага маўленьня фразай: „З пункту гледжаньня банальнай эрудыцыі ніводзін здаровадумны індывідуум ня ў стане ігнараваць тэндэнцыі парадаксальных эмоцыяў“. Тады нам гэты сказ здаваўся вяршыняй непатрэбнай надуманасьці ды завумнасьці…"
3. Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму. Валерка Булгакаў у ARCHE 1(15)-2001. "Перад намі парадаксальная сытуацыя: набыцьцё Беларусяй незалежнасьці напачатку толькі аддаліла Беларусь ад Эўропы. Наколькі зацягнецца гэтая камунікацыйная паўза, залежыць ня толькі ад палітычных, але і ад..."
4. Жыцьцё з новай Эўропай. Зьбігнеў Бжазіньскі ў ARCHE 1(15)-2001. "Эўраатлянтычны альянс для Амэрыкі — найважнейшы глябальны хаўрус. Гэта трамплін для актыўнасьці Амэрыкі ў сьвеце, які дае ёй магчымасьць выступаць у ролі арбітра ў Эўразіі — геапалітычна цэнтральным рэгіёне сьвету; гэта і кааліцыя, якая ў сусьветным маштабе дамінуе ўва ўсіх ключавых сфэрах улады і ўплыву. Саюз Амэрыкі з Эўропай стварае ў сьвеце вось стабільнасьці і стаецца рухавіком сусьветнае эканомікі й базай для…"
5. Пошукі радзімы. Вінцэсь Мудроў у ARCHE 1(15)-2001. "Кожны раз увесну, калі прылятаюць птушкі і высокае неба скаланаецца ад птушынага граю, калі ў гарадзкіх парках і на гародах паляць зімовае сьмецьце і жоўтыя лапы дыму цягнуцца, нібыта кітайскія цмокі, да дрыготка-зьвінючага сонца, памяць мая абуджаецца, і я вяртаюся ў тую далёкую, немаведама якога году вясну…"
6. Кіёск Эўразія, альбо Бэрлін як пэрспэктыва і цэнтар. Карл Шлёгель у ARCHE 1(15)-2001. "Усе ведаюць пра Бэрлінска-Варшаўскую нізіну, але мала хто ведае пра Metropolitan

Corridor, у якім таксама знаходзіцца Бэрлін. Калі глядзець звонку, ён ідзе з захаду на ўсход і расьцягваецца больш як на дзьве тысячы кілямэтраў. Ягоныя найважнейшыя станцыі — Бэрлін—Познань—Варшава—Берасьце—Менск—Смаленск—Масква…"

7. Літоўская пастараль. Дэн Якабсан ў ARCHE 1(15)-2001. "Няма такога іншага падманліва-нявіннага краявіду, як літоўскі. Я наведаў краіну ў чэрвені, калі лета ў самай сіле і літаральна ўсюды буяе расьліннасьць. Аднак незвычайнае ўражаньне даверлівасьці й адкрытасьці, характэрнае для літоўскага краявіду, ствараласяня гэтым…"
8. Час і месца, альбо Мая апошняя тэрыторыя. Юры Андруховіч у ARCHE 1(15)-2001. "Я жыву ў спакон вякоў падазронай і зняважанай частцы свету. Гэтая частка свету называецца Галіччынаю. Магчыма, таму мне не застаецца нічога іншага, як назваць сябе постмадэрністам. Гэта, безумоўна, жарт, але не надта вясёлы. Ёсць рэгіёны праўдзівыя, цэласныя нават у сваёй зруйнаванасці ды пачварнасці. Галіччына — наскрозь штучная, сшытая ў цэлае белымі ніткамі псеўдагістарычных домыслаў і палітыканскіх інтрыгаў…"
9. Resistant Culture. Андрэй Дынько ў ARCHE 1(15)-2001. "Чаму беларускую культуру так кепска ведаюць у сьвеце? Чаму яна застаецца нават для суседзяў такой безаблічнай? Пры словах „польская культура“ адукаваны эўрапеец узгадвае Шапэна і Кесьлёўскага, пры словах „дацкая культура“ — Мунка і Андэрсэна. Пры словах „беларуская культура“ масквіч узгадае хіба фольк-рокераў з папулярнага ў савецкі час гурту „Песьняры“…"
10. Сто беларускіх кніг XX стагодзьдзя. Паводле апытаньня чытачоў газэты „Наша Ніва“ ў ARCHE 1(15)-2001. "Паводле апытаньня чытачоў газэты „Наша Ніва“…"
11. Мэзальянсы, або Юрлівыя санэты. Юрась Пацюпа у ARCHE 1(15)-2001. "Кожны, хто закаханы ў санэт, ведае, што гэта найбольш складаная, дасканалая і выкшталцоная форма вершу. Але мала хто задумваецца над тым, што санэт паводле свае прыроды і найпарадаксальнейшы жанр. Эстэтычныя рэчы, супраць этычных, як ведама, імкнуцца да разнастайнасьці. Санэт жа, наадварот, у самой сваёй

існасьці абапіраецца на норму. І невыпадкова першым аўтарам санэту быў натарыюс. Як жа ў такім разе ён спраўджвае сваё эстэтычнае наканаваньне?..."

[illegible]

[image]

A R C H E **S k a r y n a** **№ 1 (15) – 2001**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]’[image]2001

аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

З ь м е с т

Юрась Лаўрык

Найбольшае інтэлектуальнае ашуканства

„Калісьці, падлеткамі, мы зь сябрамі часам пакеплівалі з чыйгосьці прэтэнцыёзнага маўленьня фразай: „З пункту гледжаньня банальнай эрудыцыі ніводзін здаровадумны індывідуум ня ў стане ігнараваць тэндэнцыі парадаксальных эмоцыяў“. Тады нам гэты сказ здаваўся вяршыняй непатрэбнай надуманасьці ды завумнасьці…“ {далей}

Валерка Булгакаў

Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму

„Перад намі парадаксальная сытуацыя: набыцьцё Беларусяй незалежнасьці напачатку толькі аддаліла Беларусь ад Эўропы. Наколькі зацягнецца гэтая камунікацыйная паўза, залежыць ня толькі ад палітычных, але і ад…“ {далей}

Зьбігнеў Бжазіньскі

Жыцьцё з новай Эўропай

„Эўраатлянтычны альянс для Амэрыкі — найважнейшы глябальны хаўрус. Гэта трамплін для актыўнасьці Амэрыкі ў сьвеце, які дае ёй магчымасьць выступаць у ролі арбітра ў Эўразіі — геапалітычна цэнтральным рэгіёне сьвету; гэта і кааліцыя, якая ў сусьветным маштабе дамінуе ўва ўсіх ключавых сфэрах улады і ўплыву. Саюз Амэрыкі з Эўропай стварае ў сьвеце вось стабільнасьці і стаецца рухавіком сусьветнае эканомікі й базай для…“ {далей}

Вінцэсь Мудроў

Пошукі радзімы

„Кожны раз увесну, калі прылятаюць птушкі і высокае неба

скаланаецца ад птушынага граю, калі ў гарадзкіх парках і на гародах паляць зімовае сьмецьце і жоўтыя лапы дыму цягнуцца, нібыта кітайскія цмокі, да дрыготка-зьвінючага сонца, памяць мая абуджаецца, і я вяртаюся ў тую далёкую, немаведама якога году вясну…“ {далей}

Карл Шлёгель

Кіёск Эўразія, альбо Бэрлін як пэрспэктыва і цэнтар

„…Усе ведаюць пра Бэрлінска-Варшаўскую нізіну, але мала хто ведае пра *Metropolitan Corridor*, у якім таксама знаходзіцца Бэрлін. Калі глядзець звонку, ён ідзе з захаду на ўсход і расьцягваецца больш як на дзьве тысячы кілямэтраў. Ягоныя найважнейшыя станцыі — Бэрлін—Познань—Варшава—Берасьце—Менск—Смаленск—Масква…“ {далей}

Дэн Якабсан

Літоўская пастараль

„Няма такога іншага падманліва-нявіннага краявіду, як літоўскі. Я наведаў краіну ў чэрвені, калі лета ў самай сіле і літаральна ўсюды буяе расьліннасьць. Аднак незвычайнае ўражаньне даверлівасьці й адкрытасьці, характэрнае для літоўскага краявіду, ствараласяня гэтым…“ {далей}

Юры Андруховіч

Час і месца, альбо Мая апошняя тэрыторыя

„…Я жыву ў спакон вякоў падазронай і зняважанай частцы свету. Гэтая частка свету называецца Галіччынаю. Магчыма, таму мне не застаецца нічога іншага, як назваць сябе постмадэрністам. Гэта, безумоўна, жарт, але не надта вясёлы. Ёсць рэгіёны праўдзівыя, цэласныя нават у сваёй зруйнаванасці ды пачварнасці. Галіччына — наскрозь штучная, сшытая ў цэлае белымі ніткамі псеўдагістарычных домыслаў і палітыканскіх інтрыг…“ {далей}

Андрэй Дынько

Resistant Culture

„…Чаму беларускую культуру так кепска ведаюць у сьвеце? Чаму яна застаецца нават для суседзяў такой безаблічнай? Пры словах „польская культура“ адукаваны эўрапеец узгадвае Шапэна і Кесьлёўскага, пры словах „дацкая культура“ — Мунка і Андэрсэна. Пры словах „беларуская культура“ масквіч узгадае хіба фольк-рокераў з папулярнага ў савецкі час гурту „Песьняры“…“ {далей}

Сто беларускіх кніг XX ст.

Паводле апытаньня чытачоў газэты „Наша Ніва“ {далей}

Юрась Пацюпа

Мэзальянсы, або Юрлівыя санэты

„Кожны, хто закаханы ў санэт, ведае, што гэта найбольш складаная, дасканалая і выкшталцоная форма вершу. Але мала хто задумваецца над тым, што санэт паводле свае прыроды і найпарадаксальнейшы жанр. Эстэтычныя рэчы, супраць этычных, як ведама, імкнуцца да разнастайнасьці. Санэт жа, наадварот, у самой сваёй існасьці абапіраецца на норму. І невыпадкова першым аўтарам санэту быў натарыюс. Як жа ў такім разе ён спраўджвае сваё эстэтычнае наканаваньне?…“ {далей}

[image]
[image]

№ 1 (15) – 2001

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **08-04-2001**
[image]

Юрась Лаўрык

Найбольшае інтэлектуальнае ашуканства

ЮРАСЬ ЛАЎРЫК гісторык кнігі, супрацоўнік Скарынаўскай бібліятэкі ў Лёндане, асабльвэнт тэалёгіі і гісторыі Люблінскага каталіцкага ўнівэрсытэту.

Апошнія публікацыі - Autograph Dedication in the Skaryna Library, London (Belarusian Chronicles/ Winter 1999, #9-10) і „Даведнік з памылкамі" ў ARCHE (№8-2000).

Алена Яскевіч. Абранне вечнасці: універсалізм традыцыі і гістарызм сучаснасці. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999.

Калісьці, падлеткамі, мы зь сябрамі часам пакепліваліся з чыйгосьці прэтэнцыёзнага маўленьня фразай: „З пункту гледжаньня банальнай эрудыцыі ніводзін здаровадумны індывідуум ня ў стане ігнараваць тэндэнцыі паралаксальных эмоцыяў". Тады нам гэты сказ здаваўся вяршыняй непатрэбнай надуманасьці ды завумнасьці. Сёньня моладзь, дзякуючы кнізе Алены Яскевіч „Абранне вечнасці", мае для ўжываньня некалькі ўзорчыкаў значна больш выразных ды кваліфістых. Напрыклад, гэты: „Пасля працяглага працэсу ўнутрыкаліновае дыферэнцыяцыі пастаноўка пытання аб інтэграцыі на ўжо ўзбагачаным узроўні ведаў — зусім заканамерная для этапу новай эксплікацыі — разгортвання найстаражытнейшай з навук " (с.5). Калі ўрэшце да мяне дайшло, пра што гаменка, дык вельмі зьдзівіўся: гэта ж усё можна было сказаць людзкай мовай! Праўда, чытаючы далей, я ўсьвядоміў, што, бадай, не —

ня можна было. Бо „людзкай“ мовай аўтарка ў прынцыпе не валодае. Ані навуковай, ані літаратурнай. Яна абсалютна не адчувае розьніцы паміж навуковым і публіцыстычным стылямі, на вынік чаго ў нібыта навуковай працы ўвесь час скочваецца на звычайную газэтчыну. Вось напрыклад: „У медыявістыцы *што ні вазьмі — усё пераходна…*“ (с.5, тут і далей падкрэсьленьні мае). А працяг гэтага сказу набывае ў такіх умовах проста прарочую двухсэнсоўнасьць: „моўныя стылі амбівалентна абарочваюцца праблемамі рыторыкі…“.
Аднак яшчэ большай праблемаю абарочваецца няўменьне аўтаркі падбіраць адпаведныя словы. Я ўжо ня буду засяроджвацца над тым, якія асацыяцыі паўстаюць у сувязі з ужытым у першай цытаце выразам пра „найстаражытнейшую з навук“ ані чапляцца да формаў кшталту „зьдзіўляючая“ — усё ж „наркомаўка“ падобныя суфіксы лічыць нармальнымі для літаратурнай мовы. Бог зь ёй, „наркомаўкай“ — і бяз гэтага колькасьць недарэчна ўжытых словаў ды выразаў аграмадная. Возьмем, да прыкладу, сказ са с.8: „Да ліку першых спроб стварэння Бібліі на старабеларускай мове належыць аднесці феномен знакамітай Шарашоўскай Бібліі каралевы Сафіі Гальшанскай *на кангламераце* старабеларускай і старапольскай моў“. Чытаеш, і перад вачыма паўстае той самы канглямэрат (камень такі, па-геалягічнаму, складзены зь некалькіх іншых). Мы можам сказаць, напрыклад, што мова помніка зьяўляецца канглямэратам пэўных моваў; але „тэкст, напісаны на канглямэраце“?.. Тое самае датычыць, напрыклад, вельмі часта сустраканага ў кнізе выразу „пашкоджаны тэкст“ (гл., напр., с.17: „Тырнаўская і Рэсаўская школы (…) асаблівую ўвагу звярталі на *выпраўленне пашкоджанняў тэкстаў богаслужбовых кніг, непазбежных пры неаднаразовай перапісцы*“). А вось таксама вельмі цікавы сказ: „адной з найбольш надзённых праблем, якія задавальнялі (!) азбукоўнікі, быў *працэс славянізацыі старарускай мовы (…)*“ (с.22).

Думаю, тут будзе дарэчы зазначыць, што сказы ў рэцэнзаванай кнізе вельмі часта набываюць падсэнс, цалкам адрозны ад задуманага аўтаркай (цяжка дапусьціць, што ён мог быць закладзены сьвядома). Як, напрыклад, у сказе „(…) бо нават прэпадобны (лепей было б *вялебны* або *пачэсны* — **Ю.Л.**)

Максім Грэк, *якога перакладчыцкая праца пераканала ў неабходнасці добрага валодання граматыкай грэчаскай* і славянскай, назваў граматыку „пачаткам уваходу“, „вратамі“ філасофіі“ (с.11). Так і хочацца спытаць, няўжо ж гэта Максім Грэк, прадстаўнік бізантыйскае арыстакратыі, ня ведаў свае роднае грэцкае мовы і мусіў адмыслова авалодваць ейнай граматыкай? Дый зрабіў гэта толькі пасьля таго, як троху паперакладаў?! А тут, да таго ж, ніжэй па тэксьце, аўтарка ўжо сама сабе супярэчыць сутнасна: „відаць, *у часе навучання* (...) *нараджаецца цікавасць да граматыкі* і лінгвістыкі ўвогуле“ (с.20). Дарма, што вучэньне і перакладаньне адлеглыя між сабой амаль на 30 гадоў — гэта ж мізэр у параўнаньні зь вечнасьцю! А яшчэ „славуты афонец імкнуўся *правесці асабліва чыстую плынь* хрысціянскага Рэнесансу“ (тамсама). Ну што гэта за „правесьці плынь“?..

Да слова, чытач, пэўна, ужо заўважыў, што большасьць прыведзеных цытатаў насычаныя, з аднаго боку, русізмамі ў той ці іншай форме, а з другога — стылёвымі неадпаведнасьцямі. Яны прысутнічаюць, бадай, у кожным абзацы, і то шматкроць. Аднак, для цікаўных задам загаданку: колькі разоў сустракаецца корань *-слав- / -слаў-* у наступным фрагмэнце, які выклікае непаразуменьне: „Не абмяжоўваючыся пастаўленай перад ім задачай па перакладу (*sic*) з грэчаскай мовы багаслоўскіх кніг, (...) ён *з манаскім аскетызмам* разгортвае справу адраджэння ўсходне**слав**янскага права**слаў**я, якое ў будучым бачыў апорай усяго **слав**янства, галоўным абаронцам візантыйскай права**слаў**най веры, звязваючы свае спадзяванні з усім усходне**слав**янскім светам“. Аскетызм азначае, перадусім, устрыманасьць. Ці аўтарка хацела сказаць, што Максім Грэк быў вельмі стрыманы, то бо, малаактыўны, у „справе адраджэньня ўсходнеславянскага праваслаўя“?! Здаецца, з кантэксту мусіла б вынікаць цалкам процілеглае. Хоць, шчыра кажучы, цягам усяго пасажу пра гэтага дзеяча мяне не пакідала ўражаньне, што Алена Яскевіч, нягледзячы на пяныя дытырамбы, прагне скампрамэтаваць небараку Максіма, і закід у малаактыўнасьці пры „адраджэньні праваслаўя“ — не найгоршае. Чытаеш: „Святло дабрадатнай самаахвярнасці, запаленае ў душы Максіма Грэка, потым прымусіць яго абараняць *бязвінную цярплівіцу і прыгажуню* царыцу Саламонію Сабураву“ (там жа) — і ўжо ў тваёй душы

неўпрыкмет пачынае радзіцца сумлеў: дык ён абараняў яе, бо яна была „бязьвіннай цярплівіцай“ ці бо „прыгажуняй“? І ўвогуле, хіба цытаваныя словы — адпаведная лексыка для навуковай працы? Мне такі тэкст хутчэй нагадвае мяшанку расейскай папулярнай агіяграфіі XIX стагодзьдзя зь няўдалай спробай мастацкай прозы. Якая, на дадатак, месцамі пераходзіць у гумарэску: „Да таго ж святы выказваўся супроць разводу Васіля III *з яго святой (як стала вядома пазней)* жонкай Саламоніяй“ (с.20). Бедны Васіле! Ён і падумаць ня мог, якая ў яго сьвятая жонка!

А чаго варты абзац са с.22, дзе аўтарка сьпярша ўзносіць да нябёсаў Максімаву эрудыцыю, а пасьля цытуе найбанальнейшыя рэчы: „Здзіўляюць багатыя этымолага-гістарычныя экскурсы, якія дае ў слоўнікавых артыкулах Максім Грэк. Разважаючы аб „краегранесехъ“, святы Максім піша:
“В[image]ждь убо, яко н[image]цыи творцы каноном… умыслиша сугубу глаголему по гречески акростихиду, еже есть по русски краесторечие, или краегранесие, и ово убо сотворено ес ими по алфавиту, сир[image]ч (*sic*) по азбуке, ово еже по строкъ сложенъ м[image]рою иамвикою, еже являет и силу всего канона или хвалу содержит певаемому святому”“.
Дальбог, я б хутчэй зьдзівіўся, калі б Максім Грэк, чалавек з эўрапейскай рэнэсансавай адукацыяй, ня ведаў, што такое акраверш; але ж ён ведае — дык у чым тут праблема?
І наступны сказ: „Сапраўды энцыклапедычную дасведчанасць дэманструе афонскі пісьменнік, асабліва ў, здавалася б, далёкай ад яго геалагічнай навуцы, характарызуючы камень ізмарагд: „….камень измарагдъ зеленъ есть и св[image]тель, еж (*sic*) и лице человече видети в нем, аки в зерцале, его копают в горах инд[image]йских““. Авохці, зноў дзіва-дзіўнае: Максім Грэк (арыстакрат з паходжаньня) бачыў ізумруд і ведаў, адкуль яго прывозяць!
Але Максім Грэк не самотны ў сваіх „тэкстуальных“ злыбедах, што сустракаюцца ў дадзенай кнізе. Не нашмат менш, чым яму, дасталося, напрыклад, „нямецка-малдоўскай Адзігітрыі“ на сс.19–20. „Гэтую ікону падараваў малдаўскаму гаспадару Аляксандру Ваяводзе (*sic*) грэчаскі імператар Андронік Палеалог у 1399 г. *як сродак абароны ад пагрозы турэцкай*

агрэсіі“! — Я так і бачу, як гаспадар Аляксандар адмахваецца абразом ад турэцкіх агрэсараў. Хай даруе мне Дзева Марыя, гэта ня я блюзню, а Алена Яскевіч, якая так піша. Дый тое яшчэ ня ўсё: *„Нямецкая Адзігітрыя паклікала Грыгорыя Цамблака, каб здабыць духоўнае заспакаенне*“! Гэтага я нават не магу камэнтаваць! Ікона так моцна ўзрушылася, што, каб супакоіцца, мусіла некага да сябе паклікаць?! Я ня веру, што можна нагэтулькі не адчуваць мовы; бадай, гэта сьвядомае блазнаваньне!
Але, здаецца, усё ж не: аўтарка скрозь падкрэсьлівае сваю праваслаўнасьць — дзе трэба і дзе ня трэба. Дакладней, калі гэта ўсё-ткі мела быць навуковая праца (аб чым сьведчыць надпіс „Навуковае выданьне“ ў канцы кнігі, а таксама часта сустраканыя прэтэнзіі на „звышнавуковасьць“ у мове), дык ня трэ было б ёю выстаўляцца нідзе, бо веравызнаньне навукоўца не павінна ўплываць на тэкст ягонага дасьледаваньня. Тут, аднак, мы на кожнай старонцы сустракаем непатрэбныя апэляцыі да маскоўскай царкоўнай традыцыі, і вельмі часта насуперак фактам. Чаго варты адзін прыклад мітрапаліта Пятра Магілы, якога аўтарка ўпарта называе „светачам веры“ (напр., с.9), не зважаючы ані на тое, што ён быў аўтарам Унійнага ўнівэрсалу і плянаваў далучыцца да Уніі з Рымам, ані на ягоныя вялікамагнацкія звычаі ў паўсядзённым жыцьці, часта так ня згодныя з хрысьціянскай маральлю.

Тут, бадай, час ужо і месца перайсьці ад мовы разгляданага твору (хоць гэтую тэму можна працягваць на матэрыяле кнігі бясконца) да пытаньняў больш істотных для навуковай працы: паняткаў, фактаў ды іхнай інтэрпрэтацыі.
Паколькі паняткі наўпрост зьвязаныя з мовай, лягічным будзе пачаць акурат зь іх. Тэрміналёгія, якой карыстаецца аўтарка, мякка кажучы, дзіўная. Алена Яскевіч вельмі часта існыя ўжо найменьні напаўняе зусім іншым зьместам, чым гэта прынята ў навуковай літаратуры; а яшчэ часьцей яна стварае новыя. Ды не было б вялікай бяды, каб гэта ўсё служыла большай дакладнасьці азначэньняў ці дапамагала б лепей зразумець думку аўтаркі. На жаль, аднак, гэта толькі ўносіць яшчэ большую блытаніну.
Складаецца ўражаньне, што сп-ня Яскевіч ня толькі слаба ведае, што азначае той ці іншы тэрмін, але і часьцяком сама не

разумее, пра што піша. Пачну браць узоры зноў ужо зь першых старонак. С.6: „У прыватнасці, вытлумачэнне *дзелавой і агіяграфічнай літаратур: летапісаў, хронік, жыцій, хаджэнняў* і інш., нават прыёмаў красамоўства сродкамі развітой паэтыкі наколькі знешне эфектнае, настолькі не прыносіць пажаданага эфекту *ў інтэрпрэтацыі пачатковага стану мастацкага слова*“. З чатырох пералічаных жанраў толькі адзін адпавядае пададзенаму папярэдне абагульненьню — бо ад якога часу летапісы ды хронікі (іншая назва таго самага) сталі „дзелавой“ літаратурай, а хаджэньні — агіяграфічнай? Незразумела, і на якой падставе сп-ня Яскевіч так вызначае. Няхай яшчэ выраз „агіяграфічная літаратура“ паходзіць ад грэцкага слова (αγιοσ — сьвяты), дык можна дапусьціць, што ягоны сэнс недастаткова для аўтаркі ясны; але ж „дзелавая“ — гэта калька з расейскай, дык тутака ніякіх ужо сумлеваў паўставаць не павінна. Што ж да падкрэсьленага мной заканчэньня гэтага сказу, дык я пакідаю шаноўнаму чытачу самому вырашаць, што ў той складанай вэрбальнай канструкцыі мелася на ўвазе. Хай гэта будзе яшчэ адна загадка для цікаўных.
Пасьля шэрагу падобных недарэчнасьцяў перастаеш ужо зьдзіўляцца, калі бачыш, што тэрміны іншамоўнага паходжаньня, асабліва тэалягічныя, аўтарка спрэс ужывае без найменшага ўяўленьня аб іхным рэальным значэньні. Асабліва дакучае пры чытаньні слова „патрыстыка“ і вытворныя ад яго. У тэалёгіі так называецца дысцыпліна, якая вывучае жыцьцё і дзейнасьць Айцоў Царквы (поруч з патралёгіяй, якая вывучае іхныя творы). Назва гэтая паходзіць ад грэцкага πατηρ — айцец. Ува ўяўленьні ж Алены Яскевіч патрыстыка раптам ператварылася ў азначэньне духоўнае спадчыны гэтых Айцоў (параўн., напр., с.22: „У азбукоўніках шмат цытат са Святога Пісання, *патрыстыкі*, якія і з’яўляюцца літаратурнымі крыніцамі азбукоўнікаў“), а саміх Айцоў Алена Яскевіч чамусьці няўхільна называе патрыстамі (с.30: „*Патрысты* пераканаліся, калі ведаеш, што можна пазнаць вопытам, а што можна ўзяць на веру, гарызонты пазнання застаюцца адкрытымі і ёсць менш магчымасці ўпасці ў спрашчэнне (...)“).

Такога слова, як „патрыст“, калі я не памыляюся, у навуковым абыходку няма зусім, але нат каб яно і было, дык, згодна з законамі беларускай (і ня толькі беларускай) мовы, яно б

азначала не айца-„патэра“, а дасьледніка, які займаецца патрыстыкай. (Не называем жа мы трактар трактарыстам.)
Што да яшчэ аднаго вытворнага ад таго ж кораню — „патрыстычная літаратура“, дык сьпярша гэты выраз не выклікаў маіх падозраньняў, аж пакуль я не напаткаў на ўсё той жа часта цытаванай мною 30-й старонцы сказ: „Найбольш яркімі і манументальна значнымі праявамі „залатога веку“ айчыннай літаратуры, на думку даследчыкаў, былі палемічная і патрыстычная лініі кніжнасці (...)“.
„Якіх дасьледчыкаў?“ — захацелася мне адразу спытаць, бо тут Алена Яскевіч, спасылаючыся на чужую думку, чамусьці забылася даць адсылку хаця б да прозьвішча аўтара ідэі, ня кажучы ўжо пра крыніцу. І, баюся, невыпадкова. Па-першае, таму, што „патрыстычная літаратура“ — гэта азначэньне ня столькі жанравае, колькі храналягічнае. У бачаньні заходняй навукі пэрыяд патрыстычнае літаратуры канчаецца на Ізыдору з Сэвільі і Яну Дамаскіну. Усходняя (праваслаўная) тэалёгія часам падаўжае яго да Паламы і Міколы Кавасіла, то бо да XIV ст., але ўсё роўна, пры чым тут „“залаты век” айчыннай літаратуры“, то бо беларускае пісьменства XVI–XVII стст.?
Далей, патрыстычная літаратура ўключала ў сябе большасьць вядомых сёньня жанраў хрысьціянскае літаратуры, у т.л. і жанр палемічны. Як, такім чынам, можна процістаўляць і параўноўваць літаратуру патрыстычную і палемічную? Першая ж зьява ў вялікай ступені ахоплівала другую.
Ну і, нарэшце, хто ж прадстаўнікі гэтае „патрыстычнае лініі кніжнасьці“ ў „айчыннай літаратуры“? Згаданыя сп-няй Яскевіч Палама і Арэапагіт (па вялікім рахунку, Псэўда-Арэапагіт, але аўтарка, здаецца, гэтага ня ведае) *айчыннымі* тэолягамі *для беларусаў* быць ня могуць — яны тут ані нарадзіліся, ані працавалі. Іншых жа імёнаў не названа, хіба што толькі Максім Грэк, якому аўтарка аддае столькі ўвагі. Але, зноў жа, ён быў запрошаны працаваць не ў Беларусь, а ў *Маскоўшчыну*! Тое ж, што ў ВКЛ часам выходзілі ягоныя творы, яшчэ не нагода залічаць яго да беларускіх пісьменьнікаў, як мы не залічваем да іх Яна Залатавуснага толькі на падставе таго, што ягоныя „Павучэньні“ неаднаразова выдаваліся ў Вільні.
Падобныя дзівосы адбываюцца і з тэрмінамі сьцісла гістарычнымі. Напрыклад, найменьне знакамітае чэскае княскае дынастыі, на думку сп-ні Яскевіч, па-беларуску павінна

гучаць як Пшэмыслоўцы (с.26). У славянамоўнай літаратуры найчасьцей сустракаецца форма „Пшэмысловічы“; у заходняй — Пшэмысьліды (*Przemyslides*). Чаму было не скарыстацца з гэтых, даўно ўкаранёных у навуцы найменьняў? Няўдалае „Пшэмыслоўцы“ выклікае перш за ўсё недарэчныя асацыяцыі.

Цяпер пару словаў пра факты і іхную інтэрпрэтацыю. Складаецца ўражаньне, што аўтарка, нават калі прыводзіць нейкі факт, дык сама ня ведае, навошта; цьверджаньні яе часта супярэчлівыя. Напрыклад: „Альгерд адразу быў гатовы прызнаць дзяржаўнай рэлігіяй праваслаўе, а ў Вільні праводзіць палітыку “трэцяга Рыму”“. Па-першае, калі ён „адразу быў гатовы прызнаць дзяржаўнай рэлігіяй праваслаўе“, дык чаму за ўсё сваё больш чым трыццацігадовае панаваньне так гэтага і не зрабіў? Па-другое, „трэці Рым“ — гэтая канцэпцыя не належыць да шырокавядомых у сусьветным маштабе зьяваў, а таму ўжываньне гэтага выразу ў пераносным сэнсе ўяўляецца не зусім карэктным, тым больш для ВКЛ. Па-трэцяе, калі нават згадзіцца на ўжываньне гэтага тэрміну ў пераносным значэньні, дык паўстае супярэчнасьць зь іншым месцам у тэксьце, трыма абзацамі ніжэй, дзе гаворыцца пра мітрапаліта Кіпрыяна, якому „належыць гонар кананізацыі віленскіх мучанікаў Антонія, Іаана, Яўстафія (...)“. Але ж немагчыма прытрымлівацца дзьвюх працілеглых думак адразу! Перад тым як брацца пісаць кнігу, аўтарка мусіла хаця б для сябе вырашыць: або Альгерд быў паганін ды барбар, вораг хрысьціянства і замучыў за веру трох ні ў чым не вінаватых праваслаўных, або ён быў прыхільнікам праваслаўя і, такім чынам, тыя трое былі пакараныя за нешта іншае, але ніяк не за веру — а значыць, ня могуць быць мучанікамі!
Увогуле належыць прызнаць, што дзякуючы Алене Яскевіч можна даведацца шмат новага і цікавага. Аказваецца, напрыклад, што сталіцай ВКЛ, і то старажытнай, быў... думаеце, Наваградак? Не! І нават ня Вільня з Трокамі — Кракаў! „Спрадвеку *Кракаў як старажытная сталіца* Кароны і *Княства* быў апірышчам славянскай (у тым ліку і беларускай) асветы“ (с.25).
А Канстанцін Астроскі быў „*першым пасля караля* ў гіерархіі свецкіх феадалаў Княства і Кароны“ (с.9). Я дык і наконт Княства не магу адназначна пагадзіцца, бо што рабіць з

Гаштольдамі, Радзівіламі, Хадкевічамі і шэрагам іншых родаў, якія мелі ўплывы, ня меншыя за Астроскіх? А пра Карону і ўвогуле мовы быць ня можа! Выглядае на тое, што для аўтаркі выраз „Карона і Княства“ (*et vice versa*) — проста прыгожы набор словаў.
І далей: „(...) астрожскі звод-пераклад Бібліі стаўся адзіным кананічным тэкстам, які абслугоўваў літургічныя патрэбы праваслаўнага славянства на працягу амаль чатырох стагоддзяў“ (там жа). Як Астроская Біблія магла абслугоўваць літургічныя патрэбы насельніцтва, калі яна ніколі не ўжывалася ў літургіі? Яна належала да т.зв. „чэційнага“ тыпу і прызначалася, перадусім, для прыватнага чытаньня.
У літургічнай жа практыцы Ўсходняе Царквы (дзе, дарэчы, старазапаветныя тэксты ўжываюцца даволі рэдка) звычайна выкарыстоўваліся *Парэмійнікі* — кнігі, якія зьмяшчалі чытаньні са Старога Закону, а таксама *Тэтраэвангельлі* і *Апосталы* (у т.л. у выглядзе *апракос*) — з тэкстамі Новага Закону.
А вось яшчэ адно „адкрыцьцё“: „У 863 г. уладар Маравіі Расціслаў запрашае з Візантыі святых роўнаапостальных братоў Кірыла і Мяфодзія, якім належыць гонар стварэння самага старажытнага *шрыфту* (глаголіцы) сярод славянскага племені (...)“ (с.26). Ці гэта мае значыць, што Кірыла і Мятод вынайшлі кнігадрукаваньне за 600 гадоў да Гутэнбэрга? Або мо яны вынайшлі толькі шрыфт, а той шрыфт захоўваўся ў народзе, перадаваўся ад айца сыну, аж покуль ня трапіў да Гутэнбэрга, які ўжо і прыдумаў, як зь ягонай дапамогай друкаваць кніжкі? У „ранейшай“ навуцы было прынята думаць, што Кірыл і Мятод „усяго толькі“ распрацавалі азбуку.

26-я старонка тут паказальная (хоць і не нашмат горшая за іншыя). Яна спрэс у фактаграфічных, інтэрпрэтацыйных ці моўных хібах. Зацытую некалькі пачатковых абзацаў.
Абзац 1-ы (заканчэньне пасажу з папярэдняй старонкі): „Усе свае каштоўнасці, уласныя багацці, родавыя дыяменты гэта жанчына незвычайнага хараства (каралева Ядвіга — **Ю.Л.**) ахвяравала на стварэнне Ягелонскага універсітэту ў Кракаве, які павінен быў мець у сваім складзе, звыш трох традыцыйных факультэтаў, па (*sic*) запавеце каралевы, абавязкова чацвёрты — багаслоўскі“. Па-першае, зноў гэтая надзвычайная прыгажосьць. Няўжо яна ахвяравала свае багацьці, бо была

такая прыгожая?! (Каб хоць аўтарка напісала, што каралева была „надзвычайнае душэўнае прыгажосьці“, дык гэта б, прынамсі, адпавядала лёгіцы сказу.) Далей, на падставе чаго сп-ня Яскевіч робіць высновы пра выгляд усіх згадваных у тэксьце жанчынаў? Бо як чытаеш гэтую кнігу, дык у вачох ажно роіцца ад „прыгажунь“ — царыцаў, каралеваў і іншых мілых стварэньняў жаночага полу. Ну проста „Казкі народаў сьвету“!
Па-другое, тэалягічны факультэт таксама быў „традыцыйны“ для эўрапейскіх унівэрсытэтаў. А быў ён ці не было яго ў той ці іншай вучэльні, сьведчыла толькі пра ранг гэтае канкрэтнае вучэльні, але не пра ейную традыцыйнасьць або нетрадыцыйнасьць.
2-гі абзац: „Ідэя звароту, адраджэння „залатога веку“ прысутнічала нават у часы антычнасці, напрыклад, у творчасці рымскага паэта Вергілія (Эклога IV), як абнаўленне-ачышчэнне ў чаканні прыходу Бога. Нават у Бібліі ідэя Адраджэння прысутнічае, на думку медыявістаў, найперш, безумоўна, у Евангеллі ад Іаана: „Пакуль хто не народзіцца ад вады і Духа (Сьвятога. — **А.Я.**), ён не можа ўвайсці ў Царства Божае“.
Найперш, я ня бачу сувязі паміж Кракаўскім унівэрсытэтам і ідэяй „адраджэньня “залатога веку”“ ў творах Вэргілія. Тут варта было альбо гэтую сувязь неяк выразна пазначыць (калі яна ў прынцыпе існуе), альбо нейкім чынам аддзяліць гэты пасаж — напр., чыстым радком, падобна як на с.23.
Па-другое, увесь гэты абзац нейкі недарэчны. Бо калі аўтарка хацела зрабіць экскурс у гісторыю разьвіцьця ідэі, дык двух прыкладаў яўна недастаткова і пачаць трэ было як мінімум з грэкаў, а ня зь іхных культурных нашчадкаў рымлянаў, а лепей увогуле зазірнуць яшчэ глыбей у старажытнасьць. Калі ж гэты абзац меўся быць уводным да пасажу пра „славянскі „залаты век ““, дык ён свае ролі ня выканаў, бо „ня вяжацца“ ані з папярэднім абзацам, ані з наступным.
Далей. Гаворачы пра біблійныя ідэі, больш лягічна было б спасылацца на думку біблеістаў, чым мэдыявістаў — бо мэдыявісты вывучаюць *Medieval Ages* — Сярэднія Вякі. *Біблія* ж, у т.л. і кнігі *Новага Закону*, паўстала яшчэ ў эпоху, якая звычайна завецца Старажытнасьцю. Баюся, што аўтарцы варта вярнуцца да школьных падручнікаў, каб навучыцца адрозьніваць гістарычныя эпохі. І яшчэ, са спасылкі да абзацу не зусім зразумела, ці аўтар *Полного церковно-славянского*

словаря Г.Дьяченко і зьяўляецца гэтымі загадкавымі „мэдыявістамі“; калі так, дык чаму ў множным ліку?
Да таго ж недарэчна тут ужыты і ўводныя словы — „нават“, „безумоўна“. „Нават“ звычайна выкарыстоўваецца, каб выказаць зьдзіўленьне або падкрэсьліць парадокс. У сувязі з гэтым мяне ўражвае здольнасьць Алены Яскевіч увесь час зьдзіўляцца, і то найэлемэнтарнейшым рэчам. Я не разумею, чаму, уласна кажучы, ідэя „адраджэньня “залатога веку”“ не павінна была існаваць у антычную эпоху? Ці ж гэныя грэкі з рымлянамі былі занадта дурныя, каб да нечага такога дадумацца? І, зноў жа, зь якой рацыі тая ж ідэя не павінна была б прысутнічаць у *Бібліі*?

Слова „безумоўна“ выражае звычайна асабістае стаўленьне аўтара. Дык калі гэта аўтарская ідэя, прычым тут тыя „мэдыявісты“; а калі Алена Яскевіч пакладаецца на чужую думку, дык навошта гэтае „безумоўна“?
3-ці абзац: „Сведкаю часоў магутнага славянскага і цэнтральнаеўрапейскага агульнага „залатога веку“, этнічнага пабраціма ства, успрымання протабеларускай мовы як генетычнай асновы з’яўляецца Люблінская ікона Багародзіцы. Агульнавядома, што ў VII ст. Польшча, Чэхія разам з Маравіяй, Славакіяй і Венгрыяй уваходзілі ў дзяржаву Сямі славянскіх плямёнаў на чале з князем Само, потым у склад Вялікай Маравіі “. Але „генэтычнай асновай“ *чаго* была „протабеларуская мова“? З сказу гэтага не відаць! І як ікона можа тое засьведчыць? Да таго ж, калі „агульнавядома“, што ў VII ст. Польшча і Чэхія разам з Маравіяй, Славаччынай і Вугоршчынай уваходзілі ў дзяржаву Сямёх славянскіх плямёнаў, дык я да агулу, якому гэта вядома, не належу, бо, на маю сьціплую думку, на той час Польшча, Чэхія, Славаччына і Вугоршчына яшчэ не існавалі (вугорцы ўвогуле тады яшчэ й не зьбіраліся прыходзіць у Цэнтральную Эўропу). І, баюся, мы нават ня можам сьцьвярджаць, што ўсе землі, на якіх сёньня знаходзяцца пералічаныя дзяржавы, уваходзілі ў „дзяржаву Само“! Я ня ведаю, адкуль Алена Яскевіч чэрпае свае зьвесткі, бо, як вельмі часта здараецца ў рэцэнзаванай кнізе, у месцах самых фантастычных сьцьвярджэньняў няма ніводнае спасылкі. З таго, што я чытаў, вынікае, што дзяржава Само ня вельмі далёка прасьціралася за межы Чэха-Мараўскіх земляў. О.К.,

далучылася да яе пара славянскіх плямёнаў, што жылі на тэрыторыі сучаснай Славаччыны; ажыццёўлена спроба заваяваньня некалькіх плямёнаў на Одры і Вісьле. Але ж гэта ня значыць, што да дзяржавы Само належалі ўсе вышэйпералічаныя тэрыторыі! Што да Вялікай Маравіі, дык у яе цалкам не ўваходзілі нават уласна чэскія землі (напр., Багемія), ня кажучы ўжо пра больш адлеглыя! У такой сытуацыі брак спасылак схіляе мяне, на жаль, думаць, што ўсё працытаванае існуе адно ўва ўяўленьні аўтаркі.
Тлумачэньня, чаму Алена Яскевіч лічыць гэты час „славянскім “залатым векам”“, дарэчы, я таксама не знайшоў. Быў паспадзяваўся, што мо пра гэта будзе ў наступным абзацы, які пачынаецца так спадзеўна: „Пра гэта сведчыць…“ Але ж не — і там чамусьці вядзецца пра „генэтычнае сваяцтва“ беларускай мовы зь іншымі славянскімі. „Пра гэта сведчыць і генетычнае сваяцтва беларускага слова са стараславянскай лексікай: дыямент (бриллиант), оксамит (шелк), жито (посевы), вежа (башня), глум (забава, издевательство), вапно (известь), блазн (обман), личьба (число), крамола (мятеж), выдруковать (напечатать), словутый (знаменитый), недбальство (небрежность), одрина (строение), ведати (знать), гостинство (пир), оструп (нарыв), кросна (пряжа, ткацкий станок), былле (трава), красовать (цвести), приклад (пример), ратай (пахарь), стреха (низ крыши), присуд (судебная пошлина) і г.д.“ Ну што ж, цалкам верыцца, што для Алены Яскевіч і славянскасьць беларускай мовы не зьяўляецца відавочнай, і яе трэба даказваць праз супольнасьць лексыкі зь іншымі славянскімі мовамі. Але мне ўсё роўна незразумела, чаму ў такім разе гэтыя доказы грунтуюцца на словах неславянскага паходжаньня — бо, напрыклад, „дыямэнт“ паходзіць ад лацінскага *diamantum*, а „выдрукаваць“ — ад нямецкага *drücken*. Апошні прыклад увогуле прыносіць вялікі сорам сп-ні Яскевіч, якая прэтэндуе быць спэцыялістам у старажытных слоўніках, бо нават у Бярынды заначана, што „друкую: з алманска, выбіваю, албо вытискаю“. Ці гэта азначае, што сп-ня Яскевіч ня ведае, хто такія „алеманы“?

Я стаміўся апісваць усю тую бязглузьдзіцу, што пануе на старонках гэтага „навуковага выданьня“. Напісаў ужо дзясятак старонак рэцэнзіі, хоць дайшоў яшчэ толькі да 30-й (!!!)

старонкі кнігі; а цытаваў я далёка ня ўсё — толькі самыя тыповыя або сьмешныя недарэчнасьці, прапускаючы шмат менш важных. Таму яшчэ хіба што пра шэраг рэчаў, на маю думку, даволі істотных. Напрыклад, пра бібліяграфічныя апісаньні замежных выданьняў на заходніх мовах, якія ў рэцэнзаванай кнізе кожны раз падаюцца паводле іншай мадэлі, што звычайна сьведчыць пра несумленнасьць дасьледніка, які (-ая) гэтых кніг на вочы ня бачыў, а проста „паперадзіраў“ спасылкі зь іншых працаў. Я не напісаў пра неразуменьне аўтаркай ёй жа самой прыведзеных цытатаў і выяўленьне ідэяў, пазычаных у іншых аўтараў. Я не напісаў пра некарэктнасьць і немэтазгоднасьць выданьня Аленай Яскевіч у складзе навуковай працы ейных жа, Алены Яскевіч, вершаў (няўжо яны нагэтулькі кепскія, што апублікаваць іх іншым чынам немагчыма?). Не напісаў, але, шчыра кажучы, ужо і ня бачу патрэбы — і напісанага дастаткова, каб даць чытачу ўяўленьне пра рэцэнзаваную кнігу. Я не адчуваю згрызотаў сумленьня, абмяжоўваючы сваю рэцэнзію паказам толькі гэтых 30 старонак, бо калі чалавек на 30 старонках піша глупствы, дык ніколі ня будзе так, што ён пасьля раптам пераменіцца і на 31-ай або 231-ай напіша нешта геніяльнае.

Я ня ведаю, ці дасягнула аўтарка пастаўленай перад сабою мэты. Калі сапраўды ставілася задача „вывучэння вытокавага перыяду славянскага пісьменства, у тым ліку пісьменства старабеларускага“, як гэта было зазначана ўва *Ўводзінах*, дык, баюся, яна ня выканана. Рэцэнзаваная кніга нагадвае сарочына гняздо, куды зьнесена без разбору і без разуменьня як добрае, так і кепскае — абы блішчэла — і звалена ў кучу бяз ладу і парадку. У канцы *Ўводзінаў* аўтарка зазначае, што „для набліжэння да сутнасці старажытнага помніка пісьменства, які належаў адначасова і лінгвістыцы, і літаратуразнаўству, і філасофіі, і гісторыі, і тэалогіі (...), каб раскрыць змест творчасці сярэдневяковага кніжніка, што быў адначасова і паэтам, і граматыстам, і лексікографам, і экзэгетам, і красамоўцам, і эдытарам, запатрабаваўся шырокі комплексны падыход“. Што ж, ідэя выказана слушная, але яна так і засталася нязьдзейсьненаю. Бо калі аўтарка хацела насамрэч ажыцьцявіць гэты „комплексны падыход“, каб наблізіцца „да сутнасці старажытнага помніка пісьменства“, яна мусіла сама стаць і тэолягам, і філёзафам, і гісторыкам — а ёй і проста

добрым філёлягам быць ня надта ўдалося.
Яшчэ адна рэч мяне вельмі дзівіць, калі выпадае чытаць кепска зробленыя кнігі — куды глядзяць навуковыя рэдактары, рэцэнзэнты ды дырэктары выдавецтваў? Я буду вельмі ўсьцешаны, калі рэдакцыя часопісу „Скарына“ прыслухаецца да маёй парады і вышле ім, таксама як і сп-ні Яскевіч, дармовы асобнік нумару з гэтай рэцэнзіяй — а раптам гэта нейкім чынам паўплывае на далейшы лёс беларускае навукі і на эканомію грошай, якіх так не стае беларускаму кнігавыданьню. Што да мяне, дык я болей ужо не дзіўлюся, што беларусы ня маюць сусьветнае славы навукоўцаў.

Ад рэдакцыі. Па выхадзе гэтай кнігі (у дзяржаўным выдавецтве „Мастацкая літаратура“) дактарантка акадэмічнага Інстытуту літаратуры Алена Яскевіч была адзначаная спэцыяльнай прэміяй А.Лукашэнкі „За духоўнае адраджэньне“ паводле прадстаўленьня Беларускай Праваслаўнай Царквы (Маскоўскага патрыярхату).

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 1 (15) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **05-04-2001**
[image]

Валерка Булгакаў

Ідэалёгія лукашэнкаўскага рэжыму Ад рыторыкі братняга яднаньня да рыторыкі міждзяржаўнай інтэграцыі

ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ галоўны рэдактар часопісу ARCHE, укладальнік зборніка „Быць (або ня быць) сярэднеэўрапейцам? Сучаснае польскае мысьленьне" („Энцыклапедыкс", 2001). Апошняя ягоная публікацыя ў часопісе - артыкул „Дэклясаваная эліта (№4-2000).

1.

Што б там ні казалі Лукашэнка і лукашэнкаўцы, але разрыў „дзесяцігодзьдзямі напрацаваных“ сувязяў у 1991 годзе прынёс ім палёгку. Гэты год быў апошнім годам звышактыўнай прысутнасьці Масквы ў беларускім культурным і часткова інфармацыйным полі. Якое гэта ўзбуджала раздражненьне ў прадстаўнікоў традыцыйных беларускіх элітаў! Масква за тых часоў сталася мэдыюмам паміж Беларусяй і заходнім сьветам. Транзытам праз Маскву ў Беларусь траплялі патэнцыйна небясьпечныя палітычныя і культурныя ідэі. Захад традыцыйна

заставаўся ворагам нумар адзін, Масква, г.зн. лібэральныя і празаходне настроеныя маскоўскія эліты, патроху ператваралася ў ворага нумар два.
Разам з развалам СССР адышоў у нябыт спэцыфічна каляніяльны тып *асьветніцтва* Беларусі, калі сусьветны перадавы інтэлектуальны, культурны, мастацкі і іншы досьвед трапляў у Беларусь не беспасярэдне, а кружным шляхам — праз імпэрскі цэнтар. Абрыў гэтага каналу культурнай камунікацыі аб'ектыўна быў на руку прадстаўнікам кансэрватыўна/рэваншысцка настроеных беларускіх уладных элітаў. Дзеля таго што Менск і блізка не валодаў такім інтэлектуальным патэнцыялам, як Масква, так зразуметае асьветніцтва практычна прыпынілася. Узьнік культурны вакуум, становішча, калі новыя замежныя культурна рэлевантныя ідэі і практыкі сталі недаступнымі, а старыя ўжо страцілі сваю жыцьцёвую сілу.
Перад намі парадаксальная сытуацыя: набыцьцё Беларусяй незалежнасьці напачатку толькі аддаліла Беларусь ад Эўропы. Наколькі зацягнецца гэтая камунікацыйная паўза, залежыць ня толькі ад палітычных, але і ад культурных чыньнікаў.
Гэтая адсутнасьць або недастатковая інтэнсіўнасьць паўнакроўнай культурнай камунікацыі з Захадам дае той групе асобаў, якая сёньня стаіць ля стырна ўлады ў Беларусі, маральную легітымацыю станавіцца ў позу захавальнікаў так званых незаплямленых савецкіх вартасьцяў. Але ў строгім сэнсе болей ім нічога не застаецца, як паразытаваць на гэтым сэгмэнце духоўнага жыцьця грамадзтва. Распрацаваць радыкальна іншую праграму выжываньня яны проста ня ў сілах. Апрача гэтага, для большай эфэктыўнасьці ўзьдзеяньня на грамадзкую думку, для атрыманьня палітычных дывідэндаў беларускі рэжым досыць пасьпяхова выкарыстоўвае таксама ідэалягему інтэграцыі з Расіяй. Гэтыя два моманты — рэакцыйна-нігілісцкі паварот да савецкай сыстэмы вартасьцяў і навязьлівая культывацыя ідэалягемы інтэграцыі з Расіяй — аснаватворныя для папярэдняга асэнсаваньня асноўных ліній сучаснай беларускай ідэалёгіі. Калі не лічыць, натуральна, рыторыкі сацыяльнага папулізму.

2.
Нягледзячы на ўсе афіцыйныя заявы і запэўніваньні, інтэграцыя

Расіі і Беларусі ніколі не была „ўсебаковай“. Яна заўсёды абмяжоўвалася выразна прамаркаванымі сфэрамі — эканамічнай і вайсковай. Гаварыць усур’ёз пра інтэграцыю ў абсягу культурнай, адукацыйнай, інфармацыйнай і іншай палітыкі не даводзіцца. Гэтаму можна прапанаваць некалькі тлумачэньняў.

Па-першае, паняцьце „Расія“ мае для прэзыдэнта Лукашэнкі адрозны ад агульнапрынятага сымбалічны зьмест. „Расія“ для беларускага прэзыдэнта ня толькі і ня столькі геапалітычная рэальнасьць, рэальная краіна з сваімі рэальнымі праблемамі, колькі традыцыя дэспатычнай улады. Іншымі словамі, выбар Лукашэнкі на карысьць „Расіі“ азначае выбар на карысьць дэспатычнай, нікому не падкантрольнай улады. Лукашэнку падабаецца акурат такая „Расія“, якая асацыюецца з грубымі, нявыхаванымі валадарамі, увогуле, магчыма, не паддатнымі акультурваньню, „Расія“, у якой палітычная воля кіраўніка, што ўвасабляе сабой дзяржаву і яе інтарэсы, азначае ўсё, а воля асобнага індывіда — нішто. Вобраз такой „Расіі“ можа існаваць толькі на ўзроўні ўяўленьня, і гэта прыносіць Лукашэнку адны расчараваньні. Аднак расійскі дэспатызм, колькі яго ні выкараняй, невыкараняльны, і яго праявы ў сучаснай палітычнай рэальнасьці Расіі дазваляюць Лукашэнку жывіць спадзяваньні на тое, што яго ўява і аб’ектыўная рэальнасьць некалі-такі скрыжуюцца.

Па-другое, галоўная мэта сучаснага беларускага рэжыму — у сваім палітычным выжываньні, а не ў далучэньні на правах суб’екта да Расійскай Фэдэрацыі. Афіцыйны Менск інтэгруецца з афіцыйнай Масквой выбарачна, толькі ў тых сфэрах, якія забясьпечваюць адносную стабільнасьць яго існаваньня і надалей.

Па-трэцяе, і гэта датычыць сёньняшняга моманту, а таксама псыхалёгіі палітычных лідэраў, моцны ўдар па „ўсебаковай“ інтэграцыі паміж дзьвюма краінамі нанёс рэактываваны Ўладзімерам Пуціным працэс рэцэнтралізацыі Расіі, які ў канцавым выніку, відаць, прадугледжвае ператварэньне Расіі ўва ўнітарную дзяржаву. Узмацненьне магутнасьці цэнтру і аслабленьне ўлады рэгіёнаў, у тым ліку пераразьмеркаваньне структуры падатковых плацяжоў, іншых фінансавых струмянёў на карысьць мэтраполіі, якое назіраецца сёньня ў Расіі, робіць праблематычнай палітычную інтэграцыю паміж нашымі

дзяржавамі. Рэч у тым, што калі раней, пры гіпатэтычным уваходзе Беларусі ў Расію, беларускі лідэр мог прэтэндаваць на статус буйнога рэгіянальнага лідэра з бліскучымі пэрспэктывамі зрабіць кар'еру ў цэнтры, то цяпер ён можа разьлічваць на пасаду правінцыйнага губэрнатара, уладныя паўнамоцтвы якога пастаянна кантралююцца навасьпечанымі „прэзыдэнцкімі намесьнікамі". Ня трэба забывацца, што Лукашэнка даўно адчуў смак улады, ён прызвычаіўся рабіць замежныя візыты і сустракаць замежных гасьцей, быць „вярхоўным галоўнакамандуючым" і прасьціраць сваю магутнасьць на сельскую гаспадарку, цяжкую прамысловасьць і горадабудаўніцтва. Пераход у новую якасьць пагражаў бы Лукашэнку моцнай псыхічнай траўмай.
Такім чынам, фігура інтэграцыі „паміж двума братнімі народамі" трактуецца сучасным беларускім рэжымам утылітарна: там, дзе яна адпавядае яго глыбінным інтарэсам, яна вітаецца і заахвочваецца, і наадварот, там, дзе яна нясе пагрозу сфармаванай уладнай канструкцыі, яна ігнаруецца або зводзіцца на нішто.

3.

Лукашэнка — палітык глыбока нацыяналістычны. Іншая рэч, што Лукашэнкаў нацыяналізм спэцыфічна ўсходнеэўрапейскі, калі не зусім эўразійскі; ён, бадай, ня мае сваіх аналягаў на Захадзе. Нацыяналізм Лукашэнкі, на першы погляд, цураецца выразнай нацыянальнай дамінанты. Нельга адназначна сьцьвярджаць, што Лукашэнка, напрыклад, расійскі нацыяналіст. Сапраўды, Лукашэнкаў нацыяналізм сягае часоў, калі Расія яшчэ ня стала нацыянальнай дзяржавай з выбранай нацыянальнай ідэнтычнасьцю, і мае сваім выточным пунктам так званы „савецкі патрыятызм". Лукашэнка — носьбіт таго спэцыфічнага нацыяналізму, які ў расійскай мове атрымаў назоў „*государственничества*". Апрача гэтага, ён мае сантымэнт да сваёй „малой радзімы" — да Шклоўскага раёну ў прыватнасьці і да Беларусі ў цэлым. Нацыянальная „гордасьць" Лукашэнкі, абуджаная ў да канца нацыянальна не структураваным савецкім грамадзтве, апэлюе да двух ідэалягічных вытокаў: да „вялікай радзімы", якая мысьліцца як „государство", і „малой радзімы", якая мысьліцца як канкрэтнае асяродзьдзе пражываньня. „Вялікая радзіма" ў

такім выпадку задае вышэйшы ўзровень [крыпта]нацыянальнай ідэнтычнасьці, які адказвае за рацыянальную дзейнасьць, „малая ж радзіма“ фармуе яе ніжэйшы эшалён, які часта зводзіцца да беспасярэдніх эмацыйных рэакцый.

Такім чынам, галоўнай інсьпірацыяй Лукашэнкавага нацыяналізму трэба ўважаць „гордасьць“ за „*государство*“, у якім, падкрэсьліваем, нацыянальныя пачуцьці заўсёды былі прытупленыя. Гэтае „*государство*“ неабходна разумець вельмі шырока — як неабсяжную тэрыторыю і як разбудаваны дзяржаўны апарат, як надзвычай магутную вайсковую сілу, што ўключае ў сябе гіпэртрафавана баяздольную армію і флёт, як сыстэму сацыяльных гарантыяў, што забясьпечвае бязьбеднае існаваньне, як, нарэшце, міжнацыянальны мір і парадак. Лішне казаць, што прататыпам такога „*государства*“ была ў сапраўднасьці значна менш прывабная савецкая дзяржава. З адыходам апошняй у нябыт яе прыцягальнасьць у вачах сымпатыкаў толькі ўзрасла.

У сваю чаргу, „малая радзіма“ выклікае асацыяцыі хіба што з бацькоўскай хатай, чарадою кароваў на сьвітаньні, першым сьнегам на „Дзяды“, пожняй, пакрытай ранішнім туманам, і буслом над галавой, адным словам, з рэчамі прыземленымі і звычайнымі.

У сваім надзвычай глыбокім і праніклівым аналізе „Агонія камунізму“, перакладзеным на польскую мову ў 1989 годзе, Зьбігнеў Бжазіньскі сьцьвярджаў, што пераход да посткамунізму ў пэўных усходнеэўрапейскіх краінах будзе суправаджацца фазай нацыяналістычнай дыктатуры. Зьнікненьне камунізму створыць у моцна саветызаваных грамадзтвах з „таталітарнай мадэльлю сацыяльнай арганізацыі“[*1] вакуум, які будзе запоўнены нацыяналістычнай ідэалёгіяй. „...распальваньне нацыяналізму, безумоўна, дадае сілы аўтарытарным імпульсам. Яно ўзмацняе тыя інстытуцыі ўлады, якія могуць найбольш эфэктыўна выкарыстаць нацыяналістычныя сымбалі для дыктатарскага рэжыму, тармозячы тым самым разьвіцьцё дэмакратыі“[*2].

Трэба з жалем сканстатаваць, што гэткага роду прагнозы ў Беларусі спраўдзіліся. Шэсьць гадоў кіраваньня Лукашэнкі сталіся гадамі пабудовы не грамадзянскай супольнасьці, а нацыяналістычнай дыктатуры з вэртыкальным, г.зн. аўтарытарным мэханізмам улады. Тое, што рэжым Лукашэнкі

[*1] Ягоны тэкст 1989. № 5. С. 71.

[*2] Там сама.

ўяўляе сабой нацыяналістычную дыктатуру, лішні раз пацьвярджаецца яго агрэсіўна-нецярпімым стаўленьнем да праяваў культурнай, палітычнай і г.д. адрознасьці: ён з аднолькавай сілай перасьледаваў незалежную беларускую культуру, польскую нацыянальную меншыню або сэксуальныя мяншыні і іх арганізацыйныя прадстаўніцтвы, але пры гэтым заплюшчваў вочы на ваенізаваныя паўфашысцкія групоўкі накшталт „*Русского национального единства*“. Адчуваў, без сумлеву, ідэалягічную блізіню.
Звычайнай практыкай для Беларусі сталася праліцьцё крыві дэманстрантаў падчас мірных акцыяў апазыцыі. Нядаўнія бясьсьледныя зьнікненьні вядомых палітыкаў і бізнэсмэнаў паказваюць, што краіна рушыла лацінаамэрыканскім, „піначэтаўскім“ шляхам разьвіцьця. Палітычнае кіраўніцтва Беларусі пераступіла тую мяжу, за якой наступае крымінальная адказнасьць за прынятыя рашэньні і зьдзейсьненыя ўчынкі.

4.

Прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка пастаянна пышыцца сваёй блізінёй з „народам“. Ён заўсёды робіць націск на падтрымцы і ўхваленьні „народам“ сваёй палітыкі. „Аляксандар Лукашэнка — з народам“, — такі рэклямны слёган фігураваў яшчэ падчас яго выбарчай кампаніі 1994 году. Пра непарыўную лучнасьць Лукашэнкі з „народам“ безупынку трубяць афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі.
Паняцьце „народ“ у нацыянальна недааформленым грамадзтве мае, аднак, сваю спэцыфіку. У пляне зьместу яно не адпавядае ні паняцьцю „нацыя“, ні паняцьцю „грамадзянская супольнасьць“. „Народ“ у данацыянальным грамадзтве — гэта ўзьніклы на дадзенай тэрыторыі цягам невялікага пэрыяду часу канглямэрат людзей, аб’яднаных пэўным узроўнем спажываньня і ідэалягічнай індактрынацыі. Да таго ж далёка ня кожная сацыяльная група ці праслойка можа быць аднесеная да „народу “. Як засьведчыў досьвед эпохі Лукашэнкі, да „народу“ ні ў якім разе ня можа быць залічаная тая частка беларускай інтэлігенцыі, якая не пайшла на калябарацыю з рэжымам („бо яна бясконца далёкая ад народу“), або непадкантрольная лукашэнкаўскай адміністрацыі бізнэс-эліта („вашывыя блохі“ ў тэрміналёгіі Лукашэнкі). Карацей, „народ“ — гэта не незалежныя журналісты і актывісты апазыцыйных партый, а

сталявары, матальшчыцы і прадзільшчыцы, людзі рабочых прафэсіяў, працаўнікі сяла, міліцыянэры і памежнікі, вайскоўцы беларускага войска.
Гэтае вульгарнае, ужыванае з мэтай палітычных маніпуляцыяў паняцьце „народ“ распаўсюджваецца на той сэгмэнт беларускага грамадзтва, які беспасярэдне залежыць ад дзяржавы. „Народ“ — гэта работнікі дзяржаўнага апарату, дзяржаўнага сэктару прамысловасьці, бюджэтных арганізацый, карацей, тых сфэраў, якія былі сыстэмаўтваральнымі для таталітарнай савецкай дзяржавы. Такі „народ“ не валодае ні супольнай культурнай, ні канфэсійнай, ні пагатоў нацыянальнай ідэнтычнасьцю. Яго лучыць у адзінае цэлае рабская залежнасьць ад таталітарнай дзяржавы, зь якой ён зьвязвае ўсе надзеі на дабрабыт.

Лукашэнка — стаўленік не „народу“, а тых сілаў, якія стаяць за гэтак зразуметым „народам“ і інтарэсы якіх гэты „народ“ паслухмяна артыкулюе

. Фактычна, Лукашэнка — стаўленік і адначасна закладнік тых гаспадарчых элітаў, якія сфармаваліся ў Беларусі яшчэ за савецкіх часоў і якія дагэтуль уяўляюць сабой рэальную сілу. Дасягнуўшы ўсёй паўніні палітычнай улады, ён пачаў абслугоўваць перадусім інтарэсы вайскова-

прамысловага комплексу беларускай эканомікі, а таксама аграпрамысловага лобі.

Барацьба за тое, які кандыдат будзе ў стане найбольш пасьлядоўна рэалізаваць гэтыя інтарэсы, і была галоўнай інтрыгай прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году. Выкарыстоўваючы агрэсіўныя перадвыбарчыя лёзунгі, акурат Лукашэнка, а не Вячаслаў Кебіч, здолеў мабілізаваць для сваёй падтрымкі большую сацыяльную базу. Палітыкі незалежніцкай арыентацыі на тых выбарах ня мелі аніякусенькіх шанцаў, бо спадзяваліся выключна на раптоўны выбух нацыянальнай сьвядомасьці ў масах.

Невыпадкова, што нават пасьля таго, як Вячаслаў Кебіч перастаў актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцьці, Аляксандар Лукашэнка якраз у ім бачыў найбольш небясьпечнага канкурэнта ў барацьбе за ўладу. Палітычны капітал Лукашэнкі — гэта ў першую чаргу давер лабістаў ВПК і іншых сыстэмаўтваральных галінаў народнай гаспадаркі пры суворым кантролі за вышэйшым кіраўніцтвам узброеных сілаў, органаў унутраных справаў і спэцслужбаў, і толькі пасьля — безаглядны і нічым не абмежаваны сацыяльны папулізм, які, насуперак цьверджаньням некаторых аналітыкаў, выконвае дапаможную ролю. Як прагматычны палітык, Лукашэнка фактычна заключыў з гэтымі лабістамі нярыўны „пакт аб ненападзе“: пэўная эканамічная свабода першых наўзамен за ляяльнасьць да апошняга. Гэта дазваляе гаварыць пра *зрошчваньне* ўладных і гаспадарчых элітаў у Беларусі. Будучы кроўна зацікаўлены ў сваім палітычным выжываньні, беларускі прэзыдэнт апошнім часам пачаў асьцярожна прамацваць новыя бізнэс-эліты, каб заручыцца іх падтрымкай. У гэтым сэнсе вельмі паказальныя вынікі леташніх восеньскіх выбараў у лукашэнкаўскую „палату прадстаўнікоў“, куды прайшло некалькі дзясяткаў ляяльных уладзе бізнэсоўцаў і прадпрымальнікаў. Адчуваючы рост патэнцыялу гэтай

параўнальна новай сацыяльнай групы і эканамічнай сілы, прэзыдэнт Беларусі сёлета імкнецца дасягнуць зь ёй узаемавыгаднага кампрамісу. У беларускіх варунках гэткі кампраміс можа зводзіцца толькі да ўліку некаторых эканамічных патрабаваньняў гэтай сілы пры ўмове яе палітычнай лаяльнасьці да існуючай улады.

Трэба пару словаў сказаць і пра эканамічныя прычыны палітыкі эскаляцыі міжнароднай ізаляцыі Беларусі, якая мэтанакіравана праводзіцца на працягу ўсяго тэрміну кіраваньня Лукашэнкі. Рэч у тым, што стабільнасьць і доўгатрываласьць сучаснага беларускага рэжыму можа забясьпечыць толькі сучасная структура беларускай эканомікі. У Беларусі так і не былі сур'ёзна трансфармаваныя створаныя за савецкіх часоў прадпрыемствы вайскова-прамысловага комплексу. Разам зь іншымі сыстэмаўтваральнымі сэктарамі беларускай эканомікі ён арыентаваны пераважна на расійскія рынкі збыту. З аднаго боку, такая арыентацыя беларускай эканомікі цалкам задавальняе Лукашэнку, які ажыцьцяўляе ў сутнасьці палітычнае прыкрыцьцё гэтай эканамічнай аднавэктарнасьці. З другога боку, беларускія гаспадарчыя эліты — кіраўнікі дзяржаўных ці падкантрольных дзяржаве заводаў, фабрык і іншых прадпрыемстваў — апынаюцца ў неаплатным даўгу перад Лукашэнкам, які дэ-факта зьдзяйсьняе рэалізацыю іх жыцьцёвых інтарэсаў. Узьнікае парытэт палітыкі і эканомікі, калі любыя паважнейшыя зьмены ў эканоміцы цягнуць за сабой зьмены ў палітыцы, і наадварот.

Міжнародная ізаляцыя Беларусі выгадная Лукашэнку тым, што яна вельмі дзейсна забясьпечвае эканамічнае *status quo*. Прыток жа буйнога замежнага капіталу ў Беларусь азначаў бы, па-першае, кардынальную ломку існуючага эканамічнага парадку, якая, па-другое, мела б фатальныя наступствы для беларускага палітычнага кіраўніцтва і рэалізоўванага ім палітычнага курсу. Памянёны парытэт палітыкі і эканомікі быў бы раз і назаўсёды парушаны. Беларусь была б уцягнутая ў Эўропу і эўрапейскую эканамічную супольнасьць жалезнай рукой рынкавых мэханізмаў.

Гэтага як агню баіцца першы прэзыдэнт Лукашэнка. Яго палітычныя заявы і акцыі, накіраваныя на эскаляцыю міжнароднай ізаляцыі Беларусі, выглядаюць усё больш натужна. Яны становяцца ўсё больш знарочыстымі і

надуманымі, набываюць характар абавязковага палітычнага рытуалу.
Цяперашняе палітычнае кіраўніцтва Беларусі задавальняе і будзе задавальняць толькі чыста касмэтычная прысутнасьць замежнага капіталу. Сетка рэстаранаў хуткага харчаваньня „*Макдональдз*“, фірмавыя крамы пабытовай тэхнікі для дому „*Siemens&Bosch*“, заводзік „*Coca Cola*“ ў Менску — гэта ўсяго толькі змушаная саступка, на якую даводзіцца ісьці рэжыму. Насамрэч Беларусь — чорная дзюра на мапе сусьветнага гандлю.
Такім чынам, рэальная ўлада для Лукашэнкі — гэта перадусім усёабсяжны або блізкі да ўсёабсяжнага кантроль над беларускай эканомікай. Толькі разуменьне гэтага дапаможа сфармуляваць рэцэпты супраць палітыкі лукашызму ў Беларусі. Калі коратка, зарука культурнай і гаспадарчай эўрапеізацыі Беларусі — у павелічэньні недзяржаўнага сэктару эканомікі і ў падтрымцы сеткі незалежных культурных інстытуцый, а таксама ў стварэньні палітычных умоваў для прытоку буйнога заходняга капіталу.

5.

Сваімі сымпатыямі і антыпатыямі, перадусім у абсягу палітыкі, прэзыдэнт Лукашэнка яскрава дэманструе той тып культуры, у якім адбывалася яго выхаваньне і станаўленьне як асобы. А палітычныя прыярытэты Лукашэнкі сьведчаць пра яго адданасьць вульгарна-функцыяналісцкім падыходам. Носьбіт „вульгарнага функцыяналізму“ характарызуецца падвышанай увагай да сацыяльна значных атрыбутаў сілы і магутнасьці. Яго захапляюць валявыя сугестыўныя рашэньні, нават калі яны ідуць уразрэз з палітычнай ці эканамічнай мэтазгоднасьцю. Культуру ж ён трактуе фактычна як сацыяльны інстытут, пакліканы цэмэнтаваць існуючы грамадзкі лад. Сапраўдная ж творчасьць, паводле гэтай лёгікі, адбываецца на будаўнічай пляцоўцы ці ля доменнай печы, акурат там адбываецца стварэньне праўдзівых вартасьцяў. Згодна з гэткай лёгікай, прадукты культуры эфэмэрныя і адначасна крыху падазроныя. Але калі кінуць усё, як ёсьць, „на самацёк“, у будучыні яны могуць справакаваць непажаданыя для ўлады сацыяльныя ўзрушэньні.
Сачыць, каб гэтага ня зьдзеялася, у Савецкім Саюзе і ў

постсавецкай Беларусі мусіла і мусіць міністэрства культуры. У гэтага ведамства заўсёды пераважалі кантрольныя функцыі. Гэты кантроль зьдзяйсьняўся і зьдзяйсьняецца, у прыватнасьці, праз падтрымку толькі тых культурных праектаў, ініцыятываў і інстытуцый, якія выгадныя існуючаму рэжыму. Абсяг дзейнасьці сёньняшняга беларускага міністэрства культуры выразна сьведчыць, наколькі жывучыя „вульгарна-функцыяналісцкія“ падыходы сярод уладных элітаў. У сфэру кампэтэнцыі гэтага ведамства ўваходзяць кінастудыя „Беларусьфільм“, некалькі дзясяткаў дзяржаўных тэатраў, музэяў і галерэяў, сетка бібліятэк і дамоў культуры, моладзевых цэнтраў і гурткоў па інтарэсах. Вось, бадай, і ўсё. Міністэрства культуры ў сваім сучасным выглядзе скіраванае на кансэрвацыю мінулага, а не на падтрымку сучаснага мастацкага досьведу. Больш адпаведнай назвай для гэтай установы было б „міністэрства кансэрвацыі савецкай культурнай спадчыны“.

Асобнай гаворкі заслугоўвае тэма расійскай культуры. Цяпер, як ніколі, выразна праяўляецца культурная дыхатамія сучаснай Расіі. Адна культурная расійская традыцыя пазытыўная: сваім карэньнем яна сягае калясальнага духоўнага даробку Аляксандра Радзішчава і Аляксандра Герцэна, Лява Талстоя і Фёдара Дастаеўскага, Уладзімера Маякоўскага і Казімера Малевіча, Андрэя Белага і Данііла Хармса, Аляксандра Салжаніцына і Андрэя Сахарава. Яна вызначаецца напружанымі духоўнымі пошукамі і празарэньнямі, перадавым мастацкім досьведам, эўрапейскім інтэлектуальным кантэкстам і сусьветна прызнанымі культурнымі дасягненьнямі. Другая ж, нэгатыўная, расійская культурная традыцыя ўвабрала ў сябе ценявы бок расійскага грамадзтва з такімі яго якасьцямі, як духоўная нэндза і ўбоства, абскурантызм і помсьлівасьць, драбязьлівасьць і вераломства. Праведзены ў краіне доўгатэрміновы камуністычны экспэрымэнт беспасярэдне паспрыяў яе ўмацаваньню. Падчас яго былі зьнішчаныя цэлыя сацыяльныя групы і праслойкі зь іх самабытнай культурнай спадчынай. Калі на Захадзе сацыяльна рэлевантныя культурныя вартасьці і практыкі традыцыйна фармаваліся *вярхамі* грамадзтва, то ў Савецкім Саюзе дзеялася нешта адваротнае: дамінуючай тут сталася культура сацыяльных *нізоў*, будзь гэта гегемон пралетарскай рэвалюцыі — рабочая

кляса — або сялянская беднота. Дамінаваньне гэтага тыпу культуры, галоўнымі рассаднікамі якога была савецкая „армія“ і „зона“, у сутнасьці азначала трыюмф неасьвечанага розуму. Напаўкрымінальны рэжым „намэнклятурнага капіталізму“, пабудаваны Аляксандрам Лукашэнкам, лішні раз сьведчыць, наколькі ў сьвядомасьці людзей укараніліся звычкі і парадкі, заведзеныя на „зоне“. Здаецца, Лукашэнка ў сваёй палітыцы так і ня выйшаў за рамкі псыхалёгіі „пахана“, які дае „крышу“ ў абмен на падпарадкаваньне і паслушэнства.

6.

Сьпіс крыніцаў, якія ўтрымліваюць элемэнты афіцыйнай беларускай ідэалёгіі, адначасна і неабмежаваны. Сапраўды, сотні дзяржаўных газэтаў, газэтак і часопісаў з нумару ў нумар агучваюць праграмныя ўстаноўкі сучаснага беларускага рэжыму. Над гэтым жа карпее дзяржаўнае беларускае радыё і тэлебачаньне. Аднак спасылацца на перадачы радыё і тэлебачаньня ў пісьмовай працы не прынята. І ня ўсе друкаваныя мас-мэдыі даюць аднолькава каштоўны ў гэтым сэнсе матэрыял. Адчуваецца, што недзе існуе свайго роду *кухня*, дзе гатуюцца густа запраўленыя ідэалёгіяй стравы, прызначаныя для шырокага народнага ўжытку.

Сапраўдны назоў гэтай кухні — Адміністрацыя прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. Акурат у пэўных структурных падразьдзяленьнях гэтага ведамства, а таксама яго шматлікіх адгалінаваньняў ідзе несупынная праца дзеля ідэалягічнай індактрынацыі масаў. Тут фармуецца „інфармацыйная бясьпека“ краіны, нябачны шчыт ад нябачных ворагаў.

Усяго жменька выданьняў мае ў сваіх заснавальніках гэтую ўсемагутную арганізацыю — Адміністрацыю прэзыдэнта. Але якраз яны часта вылучаюцца самастойнай падачай палітычна і ідэалягічна важных тэмаў і праблемных кірункаў, акурат яны задаюць „палітычна карэктныя“ ўзоры і стэрэатыпы, якія пасьля з большай ці меншай адданасьцю прышчапляюць сьвядомасьці масаў работнікі ніжэйшых зьвёнаў уладнай вэртыкалі — абласных і галіновых выданьняў, раёнак. Іх ня так ужо і шмат: гэта, напрыклад, лібэральная ўва ўмовах лукашызму „*Советская Белоруссия*“, беларускамоўная і беларусацэнтрычная „Звязда“ і кансэрватыўны часопіс „Беларуская думка“. Ён і будзе выточным пунктам нашых

*3 Беларуская думка. № 6. 2000. С. 5.

развагаў.

7.

Стылістыку афіцыйных беларускіх ідэолягаў задае сам Лукашэнка сваімі незраўнанымі моўнымі экзэрсысамі накшталт „праваслаўны атэіст“ або „вашывыя блохі“. У параўнаньні з гэтым „*горбачевская псевдоперестройка*“, „*авантюристы-затейники*“ і „*закулисные дирижеры*“ „*Заслуженного деятеля культуры Республики Беларусь, академика Международной Академии организационных и управленческих наук*“ і па сумяшчальніцтве галоўнага рэдактара „Беларускай думкі“ і аднаго з галоўных беларускіх ідэолягаў Уладзімера Вялічкі або „*политические оборотни, разрезавшие по живому единый организм*“, „*местечковые гвардейцы, втихомолку примерившие до того на себя императорские мантии*“, „*забугорские доброхоты*“ і „*рыночный омут*“ Ігара Акшэўскага выглядаюць проста труізмамі. Прывядзем яшчэ некалькі ўзораў падобнай творчасьці — „*закономерный крах демократических иллюзий*“ („*Первый секретарь ЦК Белорусского патриотического союза молодежи*“ Ўсевалад Янчэўскі), „*западная мысль не предлагает нам альтернатив, а навязывает свое изношенное и во многих местах дырявое пальто*“ („*профессор, заведующий кафедрой внешней политики Академии управления при президенте Республики Беларусь*“ Віталь Сьмірноў), „*пучина стихийного рынка и анархической независимости*“ („*кандидат философских наук*“ Васіль Новікаў), „*эдиповы, фрейдовские и иные комплексы*“ („*кандидат философских наук*“ Барыс Ляпешка).

Беларускія ідэолягі не хаваюць пастаўленага перад імі заданьня — „ідэйнай загартоўкі масаў“. Усё той жа Вялічка піша: „*Нужны общие ценности развития, которые находили бы воплощение в сильной внутренней идеологии*“[*3] . Падкрэсьлім, ня „*новые*“, а „*общие ценности*“, г. зн. традыцыйныя савецкія, толькі часткова пераасэнсаваныя, дапоўненыя і складзеныя ў адзіную сыстэму.

8.

Нішто так не характарызуе беларускай ідэалёгіі, як праграмная ўстаноўка на расійскі культурны кантэкст. На старонках „Беларускай думкі“ можна сустрэць безьліч адсылак да розных расійскіх аўтарытэтаў (Дзьмітры Мендзялееў, Фёдар

[*3] Беларуская думка. № 6. 2000. С. 88.

[*4]

Абрамаў, Пётра Чайкоўскі, Уладзімер Ленін, Іосіф Сталін) і вобмаль — да беларускіх. Часам нават дамарослыя ідэалягічныя работнікі наўпрост атаесамляюць сябе з расійцамі, а Беларусь з Расіяй: „*Да и как, скажите, можно считать иностранцем, например, собственного родного брата, что живет теперь в Нижневартовске и является гражданином другой страны? Моего старшего сына и внука, также российских граждан, обосновавшихся не так давно в красивом русском городе Костроме*“, — піша Ігар Акшэўскі*[4].

Расія таксама — гэта моцны аргумэнт у палеміцы з Захадам, такім, якім уяўляюць ці хочуць уяўляць яго сабе беларускія ідэолягі. Яны добра разумеюць, наколькі камічна і несувымерна выглядае жорсткае ідэалягічнае супрацьстаўленьне Беларусі і Захаду. Калі ж зрабіць выгляд, што Беларусь і Расія — адзінае цэлае, то такое супрацьстаўленьне набывае больш праўдападобны характар. Для абгрунтаваньня гэтага супрацьстаўленьня прапануюцца надуманыя прычыны, а якасьць аргумэнтаў у палеміцы не паддаецца ніякай ацэнцы. „*Откуда, например*, — палемічна ўсклікае берасьцейскі выкладчык філязофіі Барыс Ляпешка, — *этот призыв* — „У Эўропу*!*“*? Из мифологизации истории. А ведь именно „Европа“ белоруса давила, жгла, крестила в свою веру, вышибала любой протест и выбивала, покупала лучшие интеллектуальные силы*“*[5].

*[5] Белорусская думка № 7. 2000. С. 60.

Той самы Ляпешка ў сваёй фальсыфікацыі гісторыі, абумоўленай нэаславянафільскімі ўстаноўкамі, ідзе яшчэ далей: „*Нас частенько подталкивают к прозападной ориентации, апеллируя к историческому опыту. Но давайте посмотрим, что принесло западничество славянам. Возьмем XVII век. Софья и Голицын были очарованы католической Европой — Австрией и Польшей, а Петр — протестантской Голландией. Но в результате ни то, ни другое не принесло ничего хорошего* “*[6].

Чым далей заходзіць русіфікацыя Беларусі, тым бліжэйшай стаецца нам Расія. Прыкладна такі аргумэнт высоўвае работніца „Беларускай думкі“ Ларыса Якавенка: „*Трудно понять ратующих за союз с кем угодно — Америкой, Европой, но только не с Россией, близкой нам по духу, и по родственным связям, и по общей истории, которую невозможно сбросить со счетов или переписать наново*“*[7].

*[6] Таксама. С. 63.

Беларускія ідэолягі проста ня могуць без Расіі. Перш за ўсё яна патрэбная ім для таго, каб схаваць уласную нікчэмнасьць. Безь яе яны — купка параноікаў, зь ёй — адзіная сям'я, якая зноў можа запалохваць увесь сьвет атамнай зброяй.

Рэальныя ж эканамічныя інтарэсы Беларусі не заўсёды супадаюць з расійскімі. Характэрна, што гэта найлепш разумеюць людзі, якія беспасярэдне вызначаюць гаспадарчую палітыку краіны. Іван Шакола, прэзыдэнт рэспубліканскага дзяржаўнага канцэрну харчовай прамысловасьці, піша: „*Комплекс защитных мер начиная с 1998 года осуществляет и Россия. Несмотря на общее с нами таможенное пространство, ею обеспечены меры по защите собственного рынка от продукции, произведенной на белорусских сахарных заводах из импортного сырья. Такая политика закрытости ожидается и в ближайшем будущем*“[*8].

І неўзабаве дадае: „*Что лучше: поддерживать своего сахаропроизводителя или польского, российского, литовского?* “[*9].

[*7] Тарасаў С.

[*8] Беларуская думка. № 7. 2000. С. 26.

9.

„Захад“ у мысьленьні беларускіх ідэолягаў становіць сабой поўную супрацьлежнасьць „Расіі“. „Расія“ — свая, „Захад“ — чужы. „Расія“ нясе дабро і асьвету, „Захад“ — зло і беспрасьветнасьць. „Расія“ дасьць сьвету будучыню, „Захад“ рыхтуе гібель плянэты. Няздольнасьць гэтых ідэолягаў бачыць сьвет такім, якім ён ёсьць, а не скрозь чорна-белую прызму, тут дасягае свайго апагею.

Разам з тым дамарослыя Вялічкі і Ляпешкі слаба ведаюць, што такое „Захад“. Найчасьцей для іх гэтае паняцьце азначае актыўнае запярэчаньне савецкай сыстэмы вартасьцяў у ўсіх сфэрах грамадзтва, абсалютнае „не“ савецкаму ладу жыцьця. Натуральна, што гэтае паняцьце мае не геаграфічны, а чыста ідэалягічны сэнс. „Захад“ — гэта калектыўны агрэсар, агрэсіўны палітычны блёк.

Слабасьць ведаў беларускіх ідэалягічных работнікаў праяўляецца і ў тым, што „Захад“ для іх — таксама паняцьце сынкрэтычнае. Ніхто зь іх адкрыта ня кажа, што Нямеччына, Галяндыя ці Гішпанія — гэта Захад. Выняткам тут ЗША, якія парою сапраўды фігуруюць асобна.

Пярэдні край „Захаду“ ў вачах беларускіх ідэолягаў — гэта Ўкраіна і Польшча. Гэтыя дзьве краіны, кожная па-свойму, прэзэнтуюць вельмі непажаданы для іх варыянт разьвіцьця, каб ачарніць яго, у ход ідуць усе прыдатныя сродкі. Так, Уладзімер Вялічка ставіць пад сумнеў дэмакратычнасьць апошніх украінскіх выбараў: „*В ходе недавних выборов на Украине команда Л.Кучмы удачно реализовала апробированную ельцинскую схему — „президент-реформатор“ против красного реванша*“[*10].

Ігар Акшэўскі аспрэчвае аграрную палітыку ўкраінскага кіраўніцтва: „*Хвала Господу, что поля наши не зарастают бурьяном, как в соседней Украине, а плодоносят, воздавая должное трудолюбивым крестьянским рукам*“[*11].

Паэт украінскага паходжаньня Браніслаў Спрынчан увогуле

[*9] Тамсама. С.29.

[*10] Беларуская думка. № 6. 2000. С. 8.

[*11] Беларуская думка. № 6. 2000. С. 188.

[*12] Беларуская думка. № 8. 2000. С. 159.

хоча перайменаваць Украіну ў „Маларосію“:

Все ж двадцатилетний малоросс,
Мудрости твоих заветов внемля,
Беларусь, к тебе душой прирос,
Полюбил твоих людей и землю[*12].

Прафэсійна займаецца надзвычай тэндэнцыйным асьвятленьнем польскіх эканамічных рэформаў дацэнт БДУ Мечыслаў Часноўскі. Яго інвэктывы скіраваны і супраць „польскіх рэфарматараў“ („польскія рэфарматары слаба ўсведамлялі, што ліберальная рынкавая эканоміка па-рознаму функцыяніруе ў ЗША і краінах Заходняй Еўропы“), і супраць „лібэральнай праграмы“ наагул („…ліберальная праграма не апраўдала сябе нават у эканамічнай галіне — насуперак прапагандзе поспеху з боку прыхільнікаў захавання ліберальнага статус-кво“[*13]).

Прычыны польскай „эканамічнай катастрофы“ Часноўскі бачыць у мінімізацыі ролі дзяржавы ў эканамічным жыцьці краіны: „…палякі… страцілі пакупніцкія здольнасці з-за таго, што дзяржава адмовіла ім у апякунстве і гарантаваным працаўладкаванні“[*14].

Выснова Часноўскага наступная: „Такім чынам, рынкавыя механізмы ў сутнасці ўскладнялі дасягненне высокай ступені сацыяльнай салідарнасці і кансалідацыі. Яны хутчэй спрыялі росту няпэўнасці і дыферэнцыяцыі“[*15].

Аднак натужныя фальсыфікацыі Часноўскага ня йдуць нікуды параўнаньне з тым, што беларускія ідэолягі думаюць пра Злучаныя Штаты Амэрыкі. Тут „эканамічныя аргумэнты“ адыходзяць на задні плян, і ў дзеяньне ўступае нацыяналістычная рыторыка і нагнятаньне псыхозу. „*Для некоторых школьников насилие стало моделью жизненной повседневности. В США уже не единичны случаи расстрела подростками своих одноклассников*“[*16], — з заклапочанасьцю паведамляе загадчык катэдры філязофіі БДУІР, доктар філязофскіх навук, прафэсар Юры Харын. Для прафэсара, загадчыка катэдры замежнай палітыкі Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі Віталя Сьмірнова зьнікае хоць якая розьніца паміж фашысцкай Нямеччынай і сучаснымі ЗША, „нэафашысцкімі“, на яго думку: „*Национальная идея рождается*

*12 Беларуская думка. № 6. 2000. С. 104.

*13 Беларуская думка. № 6. 2000. С. 105.

*14 Беларуская думка. № 6. 2000. С. 106.

*15 Беларуская думка. № 6. 2000. С. 108.

самим развитием общества, овладевает массами и находит свое практическое осуществление. ***Так возникли фашизм и фашистская идеология в Германии, неофашизм и идеология мирового диктата в настоящее время в США“***[*16].

[*16] Беларуская думка. № 8. 2000. С. 41.

Вэрдыкт Віталя Сьмірнова адназначны: „*…западная мысль не предлагает нам альтернатив, а диктует и навязывает свои трафареты и образцы „прогрессивного развития“ при отказе от таких понятий, как национальный суверенитет и государственность, любовь к Родине, патриотизм, национальная гордость и др. За всем этим скрываются триумф и коварство победителей, которые заинтересованы в том, чтобы внушить нам комплекс неполноценности и исторической вины, превратить в изгоев современной цивилизации*“[*17].

[*17] Беларуская думка. № 7. 2000. С. 17 (вылучана намі — **Аўт.**)

[*18] Тамсама. С. 18.

Кандыдат філязофскіх навук, нядаўні кандыдат у прэзыдэнты Васіль Новікаў падазрае, што акурат „Захад“ вінаваты ў

тармажэньні сацыяльнага прагрэсу ў постсавецкіх рэспубліках: *„…в настоящее время под видом новых концепций сплошь и рядом протаскивается защита эгоистических интересов небольшой группы западных стран, стремящихся навязать свою систему ценностей остальному человечеству“*[*19] і выказвае надзею на тое, што *„…переступая порог третьего тысячелетия, человечество должно будет окончательно распрощаться с западноевропейской парадигмой ментальности, формировавшейся на протяжении всего периода существования западного буржуазного общества. Это необходимо для развития подлинных общечеловеческих ценностей в противоположность узкоклассовым и узкоцивилизационным иллюзиям и интересам“*[*20].

Эскаляцыя міжнароднай ізаляцыі заўсёды абяртаецца эскаляцыяй параноі ўсярэдзіне краіны. Нефармальным лідэрам „паранаідальнага кірунку“ ў афіцыйнай беларускай ідэалёгіі, бясспрэчна, трэба прызнаць рэдактара „Беларускай думкі“ Ўладзімера Вялічку. Згодна зь ім, „Захад“ распачаў супраць Беларусі *„необъявленную войну“*: *„Необъявленная война, ставшая фактом общественного сознания, ведется одновременно на многих фронтах. Это и навязывание губительных экономических реформ, и нашествие сектантов, и наркомания молодежи, и препятствие деторождению под наивным предлогом „планирования семьи“ и т. п.“*[*21].

У гэтым выказваньні, як у кроплі вады, відно імкненьне беларускіх ідэолягаў тлумачыць нутраныя праблемы краіны вонкавымі ўзьдзеяньнямі. І што самае сумнае, падобныя інтэрпрэтацыйныя мадэлі дагэтуль знаходзяць прыхільнікаў у беларускім грамадзтве. Гэта сапраўды вельмі зручна — перакладаць увесь цяжар адказнасьці зь сябе на кагосьці. А калі на ўзроўні асобы гэта ня што іншае, як рэцыдыў інфантылізму, то на ўзроўні краіны такая пазыцыя набывае злавеснае адценьне ксэнафобіі і нацыяналізму. Квазілягічныя сылягізмы, якія абслугоўваюць яе, прыкладна такія: а) пабудаваная ў краіне сыстэма эканамічных, культурных, палітычных і іншых дачыненьняў блізкая да дасканаласьці; б) збоі ў гэтай сыстэме выклікаюцца вылучна ўплывам іншародных сілаў; в) стабілізацыя сыстэмы магчымая толькі ў выпадку нэўтралізацыі гэтых сілаў.

[*19] Беларуская думка. № 7. 2000. С. 46.

[*20] Гамсама. С. 48.

[*21] Беларуская

10.

Унікальнасьць беларускай палітычнай рэальнасьці палягае ў тым, што з пункту гледжаньня пануючага рэжыму незалежныя сродкі масавай інфармацыі ўяўляюць сабой ня меншую, а можа нават большую пагрозу, чымся канвэнцыйная палітычная апазыцыя. Акурат супраць іх і накіраванае вастрыё лукашэнкаўскай прапаганды. Кожны больш-менш значны беларускі ідэоляг лічыць сваім абавязкам выліць цэбар памыяў на незалежныя СМІ.

Напрыклад, памянёны вышэй Юры Харын акцэнтуе перадусім духоўную шкоду, нанесеную апазыцыйнымі мас-мэдыямі: „*Усилиями средств массовой информации (прежде всего телевидения) создается в социуме СНГ атмосфера, способствующая деморализации общества, дерацциализации мышления, дегуманизации культуры*“*22.

Выкладчык БДУ, кандыдат філялягічных навук Ягор Конеў перакананы, што гэтыя мас-мэдыі падрываюць таксама і эканоміку Беларусі: „Адсутнасць замежных інвестыцый у нашу эканоміку, як вядома, — найбольш шкоднае наступства „інфармацыйнага вакууму“, створанага замежнымі СМІ вакол Беларусі“*23.

А галоўны бэпээсэмавец Усевалад Янчэўскі фактычна атаесамляе недзяржаўныя СМІ і палітычную апазыцыю: „*…в Беларуси совокупная мощь антипрезидентских средств массовой информации гораздо сильнее государственных. Самые популярные российские каналы и более десятка оппозиционных белорусских изданий с завидным постоянством вот уже несколько лет обливают грязью Беларусь и ее власть… Оппозиция периодически собирает в Минске небольшие митинги, а если не бросается с камнями и палками на милицию, то никто эти митинги не разгоняет*“*24.

Гэтыя выкладкі беларускіх ідэолягаў павінны падвесці да думкі, што незалежныя СМІ — чужароднае цела ў нашым грамадзтве, што іх паўстаньне было штучна інсьпіравана „Захадам“, а ня выклікана аб’ектыўнымі сацыяльнымі працэсамі. Пры гэтым роля „Захаду“ ўсяляк гіпэртрафуецца: ён ня толькі захоўвае, але і павялічвае сваю прысутнасьць на інфармацыйных рынках „саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі“.

думка. № 6. 2000. С. 10.

*22 Беларуская думка. № 8. 2000. С. 42.

*23 Беларуская думка. № 8. 2000. С. 142.

*24 Беларуская думка. № 7. 2000. С. 15.

„Не потому ли в последнее время, словно колорадские жуки, плодятся бабицкие, бросающие тень на российские войска в Чечне“[*25], — патэтычна ўсклікае Ўладзімер Вялічка. Паказальна, што, як і „Захад“, „беларуская апазыцыя“ ўяўляецца ідэалягічнай машыне якойсьці больш-менш аднароднай масай, „цёмнай сілай“. Інструмэнтар, якім беларускія ідэолягі карыстаюцца ў дачыненьні да „Захаду“, ужываецца імі і ў стасунку да „беларускай апазыцыі“. Гаворыць Валянцін Акулаў: *„Кто станет ставить под сомнение, к примеру, что народ, и только он один, вправе решать, как ему свой дом обустроить, и как жить в этом доме, с кем дружить, а с кем просто сохранять добрые отношения. Думаю, что с этим не станет спорить даже трио бывших спикеров — Шушкевич-Гриб-Шарецкий. Когда же дело дошло до референдума по жизненно важным для народа вопросам, тут же оказалось, что он и „хворы“, и „дурны“, и вообще не народ, а „быдло“*[*26].

[*25] Беларуская думка. № 6. 2000. С. 9.

[*26] Беларуская думка. № 6. 2000. С. 123.

Чытаць „Беларускую думку“ і падобныя выданьні цяжка. Часам здаецца, што Лукашэнка вядзе д’ябальска тонкую гульню[*27]: ён выдае сваім ідэолягам *carte blanche* на самыя крайнія праявы ксэнафобіі і нацыяналізму, каб на іх фоне выглядаць „памяркоўным“ і „ўраўнаважаным“ палітыкам.

[*27] Беларуская думка. № 7. 2000. С. 18.

11.

Але як бы там ні было, Савецкага Саюзу ўжо даўно няма, а незалежная Рэспубліка Беларусь, нягледзячы на ўсе злыбеды, працягвае існаваць. І перад беларускімі ідэолягамі паўстае патрэба пераацэнкі савецкай спадчыны і выпрацоўкі пэрспэктыўных шляхоў разьвіцьця краіны.

Аказалася, што Ўсевалад Янчэўскі ў свае няпоўныя дваццаць пяць любіць паразважаць пра „*брежневско-андроповский Советский Союз*“: „*В брежневско-андроповском Советском Союзе жизнь была не такая уж плохая, ну да больно скучная. В том, что она была не такой уж плохой, убедились попутно, когда сравнили ее с перестроечной и постперестроечной. А вот скука раздражала уже тогда*“[*27].

Перад беларускімі ідэолягамі таксама стаіць заданьне пазытыўнага асэнсаваньня сучаснага палітычнага рэжыму. Каб крыху прыхарошыць яго, яны гатовы супрацьставіць яго рэжыму папярэдняму, савецкаму: „*Свой политический режим мы должны оценивать не по тому, насколько он отвечает чьим-то представлениям о демократии, нравится кому или нет, а с точки зрения того, что содержит в себе нового, прогрессивного по сравнению с предыдущим*“[*28].

Аўтар гэтага выказваньня Фёдар Прыходзька дадае: „…*ни коммунизма с обещанным изобилием, ни капитализма, как на Западе, у нас не будет*“[*29].

Гэты новы, „больш прагрэсіўны ў параўнаньні зь мінулым“ лад, які будуецца цяпер у Беларусі, можа быць названы ня толькі „рынкавым сацыялізмам“, але і, як намякае начальнік управы замежных сувязяў ВА „Гомсельмаш“, доктар хімічных навук Мікалай Ягоранкаў, „*социал-капитализмом*“: „*Социал-капитализм и есть тот общественный строй, который Ленин называл строем „цивилизованных кооператоров“, то есть социализмом*“[*30].

[*28] Беларуская дзяржаўнасць. № 6. 2000. С. 40.

[*29] Тамсама. С. 38.

[*30] Тамсама. С. 44.

Калі беларускія ідэолягі пішуць, што ў Беларусі будуецца палітычны лад, які не адпавядае агульнасусьветным „*представлениям о демократии*“, „*зарубежным стереотипам*“ у сфэры „*прав человека, демократии и суверенитета*“[*31], — яны самі, відаць, да канца не разумеюць, што сваімі ж рукамі яны дыскрэдытуюць беларускі рэжым. Гісторыя ведае ня так ужо і мала рэжымаў, якія не адпавядалі агульнасусьветным

[*31] Прыгожы. Віталя

„*представлениям о демократии*“. Гэта і нямецкі нацыянал-сацыялізм, і італьянскі фашызм, і савецкі камунізм. Усе яны не адзіну адмаўлялі „*зарубежные стереотипы*“ што да „*проблемы демократии и суверенитета*“.

„Сацыял-капіталістычная“ Беларусь, натуральна, мусіць мець „нацыянальную ідэю“. Фёдар Прыходзька так выказваецца пра яе: „…*Беларусь нынче переживает такой период своей истории, когда национальная идея ей нужна, как заблудившемуся путнику тропинка. Белорусская идея — это то, с чем могли бы согласиться правые и левые, верующие и атеисты, поддержали бы белорусы, русские, евреи, поляки — граждане всех национальностей, проживающие в республике* “[*32].

Падкрэсьлім, што ў строгім сэнсе ідзецца не пра „беларускую“ і не пра „нацыянальную ідэю“, а пра нейкую трэцюю — „субнацыянальную“, якая б аб’яднала „шматнацыянальны народ Беларусі“ на грунце сацыяльнай салідарнасьці і матэрыяльнага дабрабыту: „…*в основе белорусской идеи должно лежать стремление к укреплению человеческого потенциала. Основными нашими ценностями должны стать: здоровый образ жизни, качественное образование, эффективное здравоохранение, разумные потребности*“[*33].

Каб дасягнуць стану сацыяльнай, палітычнай і нацыянальнай гармоніі, неабходна зьдзейсьніць яшчэ некалькі рашучых захадаў — забараніць усе палітычныя партыі (тыповая фашысцкая праграма)[*34], адгарадзіцца ад Эўропы[*35] і зрабіць праваслаўную рэлігію дзяржаўнай (у трактоўцы Барыса Ляпешкі „…*православие — многовековой выбор, как и восточная ориентация в цивилизационном смысле*“. — Тамсама. С.60).

Сацыял-капіталізм, і „…*Не адзіну боятся ложных обвинений в нарушении прав человека, демократии и суверенитета. У нас должно быть свое отношение к этим понятиям, независимое от навязывания зарубежных стереотипов*“. (Беларуская думка. № 7. 2000. С. 24.)

[*32] Беларуская думка. № 6. 2000. С. 36.

12.

Сучасны беларускі рэжым робіць усё, каб ператварыць будаўнікоў незалежнай беларускай культуры і нацыянальнага беларускага грамадства ў *партызанаў*, а неабсяжны апарат — у *рэгулярнае войска*. Першыя прысутнічаюць пераважна ў тым сэгмэнце грамадства, які наўпрост кантралюецца цяперашняй беларускай дзяржавай ва ўстановах „трэцяга сэктару“, апазыцыйных партыях і друку, таксама ў прасторы незалежнай прэсы і друку. Другі робіць усё, каб зьнішчыць свайго працiўніка, а калі гэта не ўдаецца, прынамсі дэмаралізаваць і ўсяляк аслабіць яго. „Аслабленасьць“ у дачыненьні да сацыяльных структур азначае і іх „анахранічнасьць“. Фактычна, найбольш прыдатныя дзеячы беларускай культуры дагэтуль існуюць у кантэкстах БССР, а не незалежнай Рэспублікі Беларусь. Дзеячы незалежнасьці Беларусі ў культурным пляне былі прадуктам адказаў незалежніцкіх элітаў на выклікі, пастаўленыя за часоў існаваньня БССР. Не было тады, напрыклад, гістарычнага часопісу — во і атрымайце, праўда, кароткай часавай затрымкай, адразу некалькі — „Спадчына“, „Беларускі гістарычны агляд“, „Беларускі гістарычны часопіс“, „Беларускую мінуўшчыну“ (цяпер „Архівы і справаводства“), не было „літаратурна-культуралягічнага“ пэрыёдыка „Крыніца“, „Калосьсе“ і „ARCHE“, не існавала часопісу для сучаснага беларускага мысьленьня — зробім „незалежны часопіс па філязофіі і сацыяльных навуках“ „Фрагменты“ і г.д. Але гэтыя праекты, нягледзячы на іх важнасьць для Беларусі, часам адно перагортваюць старонкі мінулага. Слабасьць і бальшыні лукашэнкаўскіх ідэолягаў і ідэолягаў „незалежнага беларускага грамадства“ ў анахранічнасьці, зьвернутасьці ў мінулае. Ад таго

*[33] Там же. С. 38.

*[34] Прыраўн. *Я считаю, что необходимо перейти к всеобщей мобилизации. Они [партии] представляют собой структуры, которые были созданы для определенной цели, а именно для завоевания власти. Теперь, когда эта цель достигнута, они должны быть распущены. Вместо них должны быть созданы новые структуры, которые будут служить интересам народа, а не какой-либо одной партии. Каждая из них [партий] представляет интересы определенной*

першы здолее пераадолець гэтую залежнасьць, шрупы чыю залежыць будучыня Беларусі.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by

*ирупы людей“ (Беларуская думка. № 7. 2000. С. 22.)

*35 Як кажа Ларыса Якавенка, „*В „общем доме — Европе“ мы пока если не бедные родственники, то просто — чужие. И долго еще будем такими. Ибо взращены в других условиях, живем в других условиях — со своим белорусским, славянским менталитетом и православной верой*“ (Тамсама. С.123.)

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (15) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 05-04-2001

[image]

Зьбігнеў Бжазіньскі

Жыцьцё з новай Эўропай

Extracts from "Living With a New Europe" in English

Эўраатлянтычны альянс для Амэрыкі — найважнейшы глябальны хаўрус. Гэта трамплін для актыўнасьці Амэрыкі ў сьвеце, які дае ёй магчымасьць выступаць у ролі арбітра ў Эўразіі — геапалітычна цэнтральным рэгіёне сьвету, гэта і кааліцыя, якая ў сусьветным маштабе дамінуе ўва ўсіх ключавых сфэрах улады і ўплыву. Саюз Амэрыкі з Эўропай стварае ў сьвеце вось стабільнасьці і стаецца рухавіком сусьветнае эканомікі й базай для глябальнага інтэлектуальнага капіталу і тэхналягічнага наватарства. Ня менш істотна і тое, што ў Амэрыцы і ў Эўропе функцыянуюць найбольш пасьпяховыя дэмакратыі ў сьвеце. Таму разьвіцьцё стасункаў паміж ЗША і Эўропай застаецца для Вашынгтону галоўным прыярытэтам.

З гледзішча далёкае пэрспэктывы ўзьнікненьне сапраўды палітычна адзінай Эўропы магло б спрычыніць прынцыповы зрух у падзеле ўлады ў сьвеце, што мела б далекасяжныя вынікі, сваім значэньнем падобныя да наступстваў распаду савецкай імпэрыі, калі Амэрыка стала дамінаваць на плянэце. Узьнікненьне такой Эўропы вельмі моцна паўплывала б на

ЗЬБІГНЕЎ БЖАЗІНЬСКІ палітоляг, памочнік прэзыдэнта ЗША па нацыянальнай бясьпецы ў 1977–1981 гадох. Нарадзіўся ў Польшчы ў 1928 г. Прафэсар Johns Hopkins University. Аўтар кнігі *„The Grand Chessboard: American Primacy and Its Geostrategic Imperatives“ (Basic Books, 1997)* (перакладзеная на расейскую, украінскую і польскую мовы). На

становішча Амэрыкі ў сьвеце і на палітычную рацыянальную мову Эўразіі (гл. табліцу, якая паказвае, як адзіная Эўропа ўплывала б вагу Злучаных Штатаў), што немінуча выклікала, і ўжо ёсьць напружаньне з абодвух бакоў. На сёньняшні дзень ніводзін бок добра не гатовы да магчымасьці такой значнай зьмены. Амэрыканцы, як правіла, кепска разумеюць прагненьні эўрапейцаў — чаму тыя дамагаюцца павелічэньня сваёй вагі ў іх альянсе, — і недастаткова ясна разумеюць, чаму Эўропе гэтак па-рознаму ставяцца да Злучаных Штатаў. У сваю чаргу, эўрапейцы, прыпісваючы ЗША і іхнай эўрапейскай палітыцы мак'явэлізм (уласную эўрапейскую прыдумку), часта адмаўляюцца верыць, што амэрыканцы сапраўды шчыра лічаць, што ў дачыненьні да Эўропы маюць пэўныя абавязкі.

уплывай мову *роду ў кнігу* *„Główne role polityki amerykańskiej“ (ś.wiat Książki“, Warszawa, 1998).*

* Эўрапейскі Зьвяз-27 складаецца зь цяперашніх сяброў і ўсіх магчымых кандыдатаў на ўступленьне зь Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы. Крыніца: *The World Factbook*, 1999 / Washington, DC, Central Intelligence Agency, 1999. Прыблізныя

велічыні экспарту і імпарту падлічаны на аснове зьвестак аб гандлі 1998 г., зьмешчаных у *Direction of Trade Statistics Quarterly* / Washington, DC, International Monetary Fund, сьнежань 1999 г., сс.2–5.

Варта, аднак, зазначыць, што ў папярэднім абзацы, дзе гаворка пра адзіную Эўропу, я ўжываю ўмоўны лад: „паўплывала б“. Бо няма ніякай гарантыі, што такі палітычна адзіны Эўрапейскі Зьвяз, які будзе мець рэальную палітычную вагу, увогуле ўтворыцца. Узьнікненьне такой Эўропы залежыць ад ступені яе палітычнай інтэграцыі, меры яе далейшага пашырэньня і таго, наколькі Эўропе ўдасца набыць уласную вайсковую і палітычную індывідуальнасьць. А рашучыя крокі ў гэтых справах яшчэ наперадзе.

Сёньняшняя Эўропа — нават нягледзячы на сваю эканамічную моц, выразную гаспадарчую ды фінансавую інтэграцыю і надзейнасьць у якасьці эўраатлянтычнага партнэра — гэта *de facto* вайсковы пратэктарат Злучаных Штатаў. Такая сытуацыя заканамерна выклікае напружанасьць і незадаволенасьць, асабліва з таго часу, калі беспасярэдняя пагроза Эўропе, якая рабіла такую залежнасьць у пэўнай ступені прымальнай, відавочна зьменшылася. Аднак фактам застаецца тое, што дачыненьні Амэрыкі і Эўропы — гэта не адносіны раўнапраўных саюзьнікаў. Уладная асымэтрыя, якая існуе паміж імі, найхутчэй яшчэ больш павялічыцца на карысьць

Амэрыкі.
Гэтую асымэтрыю выклікае як нечуваная моц амэрыканскай эканамічнай экспансіі, так і тэхналягічнае наватарства, у якім Амэрыка вядзе рэй, асабліва ў такіх складаных і адрозных адна ад адной галінах, як, напрыклад, бія- і інфармацыйныя тэхналёгіі. Больш за тое, зьдзейсьненая Амэрыкай тэхналягічная рэвалюцыя ў вайсковай сфэры ня проста ўзмацняе вайсковы патэнцыял ЗША, павышае ступень верагоднасьці вайсковага ўмяшальніцтва Злучаных Штатаў у канфлікты на плянэце, але і зьмяняе сам характар ужыцьця вайсковай сілы. Як бы супольна ні дзейнічалі эўрапейскія дзяржавы, вельмі малаімаверна, што Эўропа некалі ў агляднай будучыні зможа перасягнуць прорву, што аддзяляе яе ад Амэрыкі ў вайсковай сфэры.
Таму і ў будучым Злучаныя Штаты застануцца адзінай сапраўды сусьветнай супэрдзяржавай. Гэта азначае, што ў першай чвэрці XXI ст. Амэрыка найверагодней застанецца вядучым партнэрам у эўраатлянтычным альянсе. З гэтага таксама вынікае, што дыскусія наконт эўраатлянтычных стасункаў ня будзе закранаць іхных базавых прынцыпаў. У фокусе дыскусіі будуць наступствы тэндэнцыяў, якія ўжо цяпер можна прадбачыць, і адпаведных ім, хоць, можа, і ня самых значных, зьмяненьняў у адносінах. Думаю, ня варта тлумачыць, што і павольныя зьмяненьні могуць быць крыніцай канфліктаў. Калі, аднак, Амэрыка і Эўропа сапраўды хочуць, каб іхныя адносіны заставаліся канструктыўнымі і пастаўленымі на рэйкі супрацоўніцтва, гэтых канфліктаў было б добра пазьбегчы.

Гістарычныя адрозьненьні
Адна прынцыповая гістарычная аблуда як спрыяе дыялёгу паміж Амэрыкай і Эўропай, так і ўскладняе ягоны ход. Абодва бакі, думаючы пра адзіную Эўропу, інстынктыўна ствараюць сабе ў галаве вобраз чагось падобнага да цяперашніх Злучаных Штатаў. Эўрапейцы прагнуць убачыць краіну памерам з кантынэнт, якая б адыгрывала ў сьвеце такую ж ролю, якую цяпер адыгрываюць ЗША, а ў найбольш радыкальных варыянтах нават уяўляюць будучую Эўропу адзінай сусьветнай супэрдзяржавай — прыкладна такой, як цяпер Амэрыка. Амэрыканцы, вітаючы будучае адзінства Эўропы — часам з

пэўнай доляю скепсысу, — інстынктыўна выходзяць з уласнага гістарычнага досьведу. І пэрспэктыва стварэньня Злучаных Штатаў Эўропы, трэба сказаць, непакоіць некаторых вядучых амэрыканскіх дыпляматаў, бо ў выніку Эўропа, стаўшы „адзінай“, немінуча станецца раўнавартасным партнэрам Амэрыкі, а можа нават ейным супернікам.
Заклікаючы да аб’яднаньня Эўропы, прыхільнікі інтэграцыі таксама часта спасылаюцца на досьвед Амэрыкі (ад аднаго зь іх я нядаўна пачуў, што Эўрасаюз сёньня знаходзіцца на этапе, які Амэрыка прайшла недзе між 1776 і 1789 гадамі). Аднак, нават нягледзячы на гэта, бальшыня эўрапейскіх палітыкаў усьведамляе, што Эўразьвязу не стае ідэалёгіі, у якую б горача верылі грамадзяне краінаў Эўропы. Яны сьведамыя таксама таго, што Эўразьвяз не выклікае ў жыхароў Эўропы палкага грамадзянскага пачуцьця. Няма тых ідэалёгіі й пачуцьця, якія натхнялі ня толькі стваральнікаў амэрыканскае Канстытуцыі, але й — што мае вырашальнае значэньне пры праверцы на палітычную моц, — патрыётаў, якія гатовыя былі б пайсьці на любыя ахвяры дзеля саюзу, як гэта было пры заваёве амэрыканскімі калёніямі незалежнасьці. Цяперашнім часам, нават калі ідзецца пра аглядную будучыню, неаспрэчна, што ніводзін „эўрапеец“ не гатовы памерці „за Эўропу“.
З гэтага вынікае, што Эўропа, пасьля таго як адбудзецца яе поўная інтэграцыя, станецца нечым абсалютна новым у гісторыі палітычных суб’ектаў, як паводле формы, так і паводле свайго становішча. Яна, бясспрэчна, ператворыцца ў палітычную супольнасьць, палітычнае адзінства, а да таго ж найбольшую эканамічную прастору ў сьвеце. Як палітычнай супольнасьці, ёй усё ж ня будзе ставаць пачуцьцёвага і ідэалістычнага запалу, уласьцівага Злучаным Штатам у часы іх фармаваньня. Увасабленьнем гэтага запалу было трансцэндэнтнае разуменьне палітычнай свабоды, што стала ўнівэрсальным, якое стварала як філязофскую аснову, так і палітычна прыцягальныя сымбалі, неабходныя для ўзьнікненьня новай нацыянальнай дзяржавы. Запал тых, хто гэтую дзяржаву засноўваў, і тых, хто далучыўся да яе пазьней і зьліўся зь ёю, быў амаль рэлігійны. Карацей кажучы, амэрыканская рэвалюцыя стварыла новы від нацыянальнае самасьвядомасьці, адкрытай для ўсіх, нацыянальнай самасьвядомасьці з унівэрсальным абліччам. Прэамбула да

Канстытуцыі Злучаных Штатаў тлумачыць унікальнасьць гэтага амэрыканскага запалу імкненьнем да свабоды і адзінства нацыі: *„Мы, народ Злучаных Штатаў, дзеля стварэньня найдасканальшага Саюзу, усталяваньня справядлівасьці, забесьпячэньня ўнутранага спакою, клопату пра абарону грамадзтва, падтрымкі ўсеагульнага дабрабыту і гарантаваньня свабоды сабе і сваім нашчадкам, пастанаўляем…“*

Нічога падобнага нельга заўважыць у крыклівай рэкляме, што заклікае эўрапейскія народы тварыць супольную Эўропу. Паказальна, што ў гістарычным *Рымскім пагадненьні* 1957 г., паводле якога шэсьць эўрапейскіх краінаў абавязаліся *„закласьці падмурак для ўсё цясьнейшага яднаньня“*, ставіўся акцэнт на забесьпячэньне *„эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу“*, *„пастаяннае паляпшэньне ўмоваў жыцьця і працы“*, *„ліквідацыю існуючых перашкодаў“* для *„ўтрыманьня раўнавагі ўва ўмовах гандлёвай дзейнасьці і канкурэнцыі“*, а таксама на *„паступовае скасаваньне абмежаваньняў, што датычаць міжнароднай гандлёвай дзейнасьці“* і г.д. Гэта дакумэнт ня толькі надзіва прагматычны, але й прыземлены. Падкрэсьліваньне гэтага прынцыповага адрозьненьня паміж Амэрыкай і Эўропай не павінна прыніжаць гістарычнага значэньня памкненьняў эўрапейцаў. Не павінна яно і выклікаць сумневаў у добрай волі тых эўрапейцаў, што імкнуцца пакласьці новыя цагліны ў будынак адзінай Эўропы. Варта, аднак, зазначыць, што вызначальнымі матывамі для паводзінаў Эўропы зь цягам часу сталіся выгада і практычнасьць. Пачатковы стымул да адзінай Эўропы быў усё ж больш ідэалістычны. Бо рухавіком для „айцоў-заснавальнікаў“ адзінай Эўропы канца 40-х — пачатку 50-х гадоў была наднацыянальная палітычная самасьвядомасьць. Акрамя таго, іх у значнай ступені матывавала рашучае жаданьне раз і назаўжды пакончыць з нацыяналістычнымі канфліктамі, якія ў гэтым стагодзьдзі двойчы ледзь ня зьнішчылі эўрапейскай цывілізацыі. А адначасова яны баяліся, што Амэрыка, расчараваная вечнымі звадамі ў Эўропе, проста пакіне эўрапейскія краіны на волю вусьцішных „інтэграцыйных“ памкненьняў Саветаў, якія за часоў халоднай вайны ўжо „аб’ядналі“ тэрыторыі на ўсход ад новай лініі падзелу „Шчэцін

—Трыест“.
Сучасныя эўрапейцы думаюць пра Эўропу больш прагматычна, хоць некаторыя — як мы ўжо адзначылі — мараць пра суб’ект, які быў бы раўнавартым партнэрам Амэрыкі. Французскія дзяржаўнікі, не даючы рады прыхаваць сваю празмерную зайздрасьць да ролі Амэрыкі ў сьвеце, бачаць у Эўропе шанец для Францыі зноў дасягнуць таго ўплыву, які яна мела ў мінуўшчыне. Немцы шукаюць у Эўропе ўласнага выратаваньня. Нарэшце, больш скептычныя брытанцы мяркуюць, што ў якім выглядзе Эўропа ні існавала б, яны мусяць быць ейным складнікам, калі хочуць, каб іх асаблівыя стасункі з Амэрыкай набылі нейкае рэальнае значэньне. Іншыя нацыі на кантынэнце — у тым ліку нацыі Сярэдняй Эўропы, што нядаўна скінулі чужое ярмо — таксама жадаюць рэінтэгравацца ў Эўропу, бо падзяляюць думку, што быць складнікам Эўропы — значыць мець больш бясьпекі, багацьця і свабоды. Усе гэтыя матывы маюць пад сабой гістарычны грунт, яны шчырыя і заслугоўваюць таго, каб Амэрыка ставілася да іх з павагаю. Прагматызм, аднак, як у сваёй аснове, так і ў сваіх праявах адрозьніваецца ад патрыятызму. Палітычная супольнасьць, збудаваная дзеля выгады, цалкам заканамерна адрозьніваецца ад супольнасьці паводле перакананьняў. І ў першым выпадку ўдзельнікі могуць быць шчыра адданымі супольнасьці. Пры гэтым, аднак, яна будзе менш мэтанакіраванай, палітычна менш рашучай, а перадусім яна будзе меней схільная да ідэалізму і самаахвярнасьці, чым другая. Такім чынам, нават нягледзячы на некаторыя падабенствы ў маштабах, „Эўропа“, якая паўстае ў нас на вачах, палітычна будзе зусім не такой, як Амэрыка: яна будзе ўяўляць сабой гібрыд, з аднаго боку, вялізнай транснацыянальнай карпарацыі, належаць да якой прагматычна, выгадна і нават прыемна, а з другога боку, канфэдэрацыі, суб’екты якой, дагэтуль вельмі адрозныя, хіба што ў далёкай пэрспэктыве стануць ёй адданымі. Адным словам, эўрапейская палітычная супольнасьць, заснаваная на выгадах, ня стане Злучанымі Штатамі Эўропы ў поўным сэнсе гэтага слова, аднак, у той жа час, яна будзе і чымсьці большым, чым простае „Акцыянэрнае таварыства „Эўрасаюз“.
І няма нічога абразьлівага ў канстатацыі таго, што на сусьветнай арэне новая Эўропа будзе нагадваць хутчэй адну вялікую Швайцарыю, чымся Злучаныя Штаты. У швайцарскай

канстытуцыі, якая паклала канец спрэчкам між кантонамі, акцэнт робіцца на тым, што нацыянальна адрозныя швайцарскія кантоны пастанавілі *„ўзнавіць (свой) саюз“* і *„жыць у сваёй адрознасьці разам, узаемна шануючы адно аднаго“*, а далей у ёй пералічваюцца практычныя мэты ўзьнікненьня канфэдэрацыі. Напрыклад, на міжнароднай арэне Швайцарыю найбольш цікавяць сфэры фінансаў і міжнароднага гандлю. Швайцарыя пры гэтым заўжды імкнулася ўхіліцца ад удзелу ў палітычных і ідэалягічных канфліктах сусьветнага маштабу, што адбываліся ў гэтым стагодзьдзі.

Не аб’яднаньне, а інтэграцыя

У любым разе, ня будзе, мабыць, памылкаю сказаць, што „Эўропа“ ў агляднай будучыні ня зробіцца — дый ня можа зрабіцца — „Амэрыкай“. Як толькі паабапал Атлянтыкі асэнсуюць гэты факт, дыялёг ЗША—Эўропа разьняволіцца, нават нягледзячы на тое, што эўрапейцы адначасова з гэтым зьвернуцца да праблемаў, зьвязаных з пошукам магчымасьцяў інтэграцыі, далейшага пашырэньня Эўрасаюзу і павышэньня магутнасьці сваіх узброеных сілаў, а амэрыканцы будуць вымушаны замірыцца зь непазьбежным узьнікненьнем новай эўрапейскай палітычнай супольнасьці.

Аб’яднаньне некалькіх нацыяў адбываецца звычайна пры неабходнасьці бараніцца ад вонкавага ціску, пры наяўнасьці супольных ідэалягічных перакананьняў або з-за імкненьня заваяваць каго мацнейшага — ці ў выніку камбінацыі трох гэтых чыньнікаў. У пачатковай фазе пошукаў адзінай Эўропы гралі ролю ўсе тры, хаця ў рознай ступені: Савецкі Саюз уяўляў сабой сапраўдную пагрозу, эўрапейскі ідэалізм сілкавалі сьвежыя ўспаміны аб другой сусьветнай вайне, а Францыя магла выкарыстоўваць усё большы эканамічны патэнцыял Заходняй Нямеччыны, якая пацярпела маральны крах у выніку другой сусьветнай вайны, дзеля правядзеньня ўласных палітычных інтарэсаў. Напрыканцы стагодзьдзя, аднак, гэтыя стымулы адчувальна аслаблі. У выніку эўрапейская „інтэграцыя“ — у значнай ступені працэс кіраванай стандартызацыі — зрабілася новаю формаю аб’яднаўчага працэсу. Хаця інтэграцыя — дасканалы спосаб стварыць эфэктыўную палітычную супольнасьць, такая супольнасьць усё

ж няздольная зрабіцца пачуцьцёва паўнавартасным саюзам. Відавочна, што інтэграцыя, якая праводзіцца бюракратычным чынам, проста ня ў стане абудзіць палітычную волю, неабходную дзеля ўтварэньня рэальнага адзінства. Ня можа яна і даць глебу для энтузіязму (нават нягледзячы на пэрыядычныя параўнаньні Эўропы з Амэрыкай) або для аб'яднаўчага парыву ў выпадку сьмяротнай пагрозы, якая таксама, бывае, дае штуршок для стварэньня нацыянальнай дзяржавы ў неспрыяльны час. Восемдзесят тысяч старонак *acquis communautaire* (падзеленых на трыццаць адну сфэру палітыкі), якія мусяць ратыфікаваць новыя сябры Эўрапейскага Саюзу, наўрад ці дадуць сярэдняму эўрапейцу нагоду для праяўленьня адданасьці на палітычным узроўні. Варта, аднак, паўтарыць: з улікам таго, што ў цяперашні час няма ў наяўнасьці ніводнага з трох традыцыйных фактараў, якія спрыяюць дасягненьню адзінства, інтэграцыя ня толькі неабходная, яна — адзіны спосаб, якім Эўропа можа кіравацца да „адзінства".

Розьніца паміж „аб'яднаньнем" і „інтэграцыяй" тлумачыць тое, чаму працэс інтэграцыі павінен адбывацца павольна і чаму яго рэзкае паскарэньне можа прывесьці нават да новага расколу Эўропы. Кожная спроба паскорыць палітычнае аб'яднаньне абвострыла б унутранае напружаньне паміж вядучымі дзяржавамі Саюзу, бо ўсе яны дагэтуль настойваюць на захаваньні сувэрэнітэту ў галіне замежнай палітыкі. У гэтай фазе антыамэрыканізм ня можа быць рухавіком аб'яднаньня, нават калі ён маскуецца прамовамі пра „шматпалярны" сьвет. Яму ня стаць той яднальнай сілай, якой быў некалі антысаветызм. А ўсё таму, што мала хто з эўрапейцаў настроены выразна па-антыамэрыканску. Акрамя таго, пасьля новага ўзьяднаньня Нямеччыны ўжо ніхто ў Эўропе, апроч аднаго Парыжу, ня мае ілюзіі, што Францыя магла б стацца ў будучыні асноўнай сілай у новай Эўропе; ніхто ў Эўропе, аднак, не жадае таксама, каб яе дамінуючай сілай зрабілася Нямеччына.

Аднак інтэграцыя — працэс ня толькі павольны. З кожным яе пасьпяховым крокам растуць складанасьці на яе шляху. Інтэграцыя неадрыўная ад прагрэсу, узаемазалежныя вэктары якога мусяць ураўнаважвацца. Прычым за гэтай узаемазалежнасьцю не стаіць аб'яднаўчы палітычны запал, безь

якога не дасягнуць сапраўды паўнавартаснай незалежнасьці. Урэшце гэта можа здарыцца, але толькі тады, калі эўрапейцы пачнуць глядзець на сябе ў палітычным сэнсе як на эўрапейцаў, застаючыся пры гэтым, скажам, немцамі або французамі, калі ідзецца пра моўную і культурную самабытнасьць.

Гарызантальнае пашырэньне

Між тым, аднак, — з прычыны павольнага прагрэсу ў Эўропе — яе далейшае пашырэньне стане, відаць, частковай кампэнсацыяй за чарапашыя тэмпы яе ўнутранай інтэграцыі. Эўропа будзе расьці, але больш у кірунку гарызантальным, чым вэртыкальным, бо дзьве гэтыя тэндэнцыі, калі дасягнуць справы, ня могуць супадаць у часе. Гэты факт — тых, хто ў Эўропу сапраўды верыць. Калі на пачатку Жак Дэлёр адважыўся катэгарычна абвесьціць, што *„няўхільнае захаваньне тэмпу (пашырэньня)… мусіць парушыць першапачатковы плян“* эўрапейскай інтэграцыі, ён меў на выніку *„мы немінуча адхілімся ад палітычнай Эўропы, якой яе выглядзе, як яе вызначалі айцы-заснавальнікі адзінай Эўропы“*, яго імгненна публічна раскрытыкаваў ягоны суайчыньнік, камісар ЭЗ Мішэль Барн’е.

Камісары ў Брусэлі спадзяюцца, што бюракраты і мадэрнізацыя інстытуцыяў прывядуць да ўзмацненьня інтэграцыйнага працэсу. Будучы ў захапленьні ад посьпеху эўра і не зважаючы на некаторыя апакаліптычныя прадказаньні (пераважна амэрыканскіх і брытанскіх нядобразычліўцаў), Брусэль — у чаканьні далейшага пашырэньня — узяўся за падрыхтоўку міжурадавай канфэрэнцыі па пытаньнях мадэрнізацыі эўрапейскіх інстытуцыяў. У канцы году чакаецца прыняцьцё свайго роду рашэньняў па гэтых пытаньнях. Але нават самыя ідэалісты ў прыхільнікі пашырэньня мяркуюць, што ў найлепшым выпадку палітычна значэнная інтэграцыя павінна абмежавацца невялікім ядром ЭЗ, у выніку чаго, магчыма, утворыцца Эўропа „з некалькімі хуткасьцямі“ і „са зьменнаю геамэтрыяй“[1]. Аднак, калі такая сытуацыя і настане, наўрад ці здыме прынцыповую супярэчнасьць паміж інтэграцыяй і пашырэньнем, якая ўплывае на разьвіцьцё супольнай палітыкі. Такі падыход да інтэграцыі азначаў бы

[1] „Зьменная геамэтрыя“ — гэта, напрыклад, такая сытуацыя, калі ня ўсе краіны ЭЗ удзельнічаюць у пэўных праектах, а толькі тыя, якія маюць для гэтага неабходныя ўмовы і жадаюць гэта зрабіць.

краінаў-саюзьніц на сяброў першай і другой катэгорыяў, прычым другія мелі б пярэчаньні супраць кожнага значнага рашэньня ў галіне замежнай палітыкі, якія прымаліся б прадстаўнікамі нібыта „больш правамоцных“ эўрапейскіх дзяржаваў.

Ува ўсякім разе, пашырэньне зробіцца задачай, якая будзе забіраць усё больш часу і вырашыць якую будзе ўсё цяжэй. Калі 200 групаў ЭЗ зьбіраюцца распачаць цяжкія перамовы, як далучыць да Зьвязу прыкладна тузін дзяржаваў-прэтэндэнтак. Працэс пашырэньня, мабыць, замарудзіцца толькі праз уласьцівыя яму цяжкасьці, але і праз нежаданьне з боку дзяржаваў-сяброў ЭЗ. Уступленьне любой з сярэднеэўрапейскіх дзяржаваў да 2004 году робіцца ўсё больш праблематычным. Аднак, з гледзішча далейшае пэрспэктывы, пашырэньня нельга пазьбегчы. Эўропа без асобных сваіх частак ня можа стацца сапраўднай Эўропай. Больш за тое, геапалітычнай пусткі паміж Эўропай і Расеяй сыходзіць б небясьпека. Акрамя таго, у Заходняй Эўропе, што пастаянна старэе, пачалася б эканамічная і грамадзкая стагнацыя. Як няма дзіва, што некаторыя вядучыя праектанты адзінай Эўропы пачалі выказвацца за тое, каб у Эўрасаюз пад 2020 год уваходзілі 35–40 краінаў — і такім чынам за Эўрасаюз цэльную культурна і геаграфічна, але амаль напаўнадоў разьдзеленую палітычна[3].

дастаткова, каб
ведаць, якім
чынам
далучыцца
можна будзе.
Робін
Кэлі
Аллен,
*Europe at the
Crossroads:
Challenges and
Opportunities
for the European
Union*, The
Washington
Quarterly, зіма
1997 г., с. 104–
105.

2. OECD
(Арганізацыя па
эканамічным
супрацоўніцтве
і развіцьцю).

3. Да
канца XXI
стагодзьдзя
Эўрасаюзу трэ
будзе прыняць
35 мільёнаў
імігрантаў, каб
утрымаць
колькасьць
насельніцтва на
ўзроўні
1995 году, і
яшчэ
150 мільёнаў да
2025 году, каб
захаваць
сёньняшнія
суадносіны
паміж доляю
пэнсіянэраў і

доляй працоўных. Акрамя таго, мяркуецца, што да 2030 году дзяржаўныя пэнсіі будуць паглынаць у Вялікай Брытаніі 5,5%, Францыі — 13,5%, Нямеччыне — 16,5%, а ў Італіі — 20,3% ад ВУП. (Адпаведная лічба для Злучаных Штатаў складае прыкладна 6,6%.)

Пытаньне моцы

Такім чынам, ні інтэграцыя, ні пашырэньне, відаць, не стварылі, сапраўды эўрапейскай Эўропы, якой гэтак прагнуць некаторыя эўрапейцы і якой так асьцерагаюцца некаторыя амерыканцы. Аднак усё больш эўрапейцаў усьведамляе, што толькі спалучэньне моцнай эўравалюты і інтэграцыі з прыцягненнем пашырэньнем можа забясьпечыць эканамічны супэрэгістат. Палітычнае ўсьведамленьне патрэбы стварыць нешта большае вымусіла тры вядучыя эўрапейскія дзяржавы — Францыю, Вялікабрытанію і Нямеччыну — спалучыць у 1998 годзе свае намаганьні дзеля стварэньня эфэктыўных эўрапейскіх вайсковых фармаваньняў, і нават зрабіць гэта яшчэ адным ўзьнікненьня інтэграванай Эўропы з уласнай замежнай і палітыкай. Праектаваныя эўрапейскія вайсковыя сілы задуманыя так, каб супольную замежную і ваенную палітыку, падмацоўвала пэўная структура, дзеля распрацоўкі канчатковага выгляду якой нядаўна створаная пасада

[3] Паводле ацэнак Аддзелу ААН па народанасельніцтве, да 2050 года ў Эўропе будзе 100 мільёнаў менш жыхароў, чым цяпер.

„высокага прадстаўніка“

„міністра замежных спраў“

„міністра абароны“

„міністра замежных спраў і абароны“

„міністра замежных спраў і абароны“

*„міністра замежных спраў і

найвышэйшага эўрапейскага камісара па замежнай палітыцы і супольнай бясьпецы (яе цяпер займае Хаўер Салянья — **Зацем рэд.**).

Праектаваныя супольныя эўрапейскія сілы хуткага рэагаваньня, якія мяркуецца сфармаваць да 2003 году, будуць Эўропы, значным праектам палітычна адзінай Эўропы. Уздзеяньне ад „Эўракорпусу“, які ўжо існуе, але ў значнай сымбалічна — ён складаецца ня толькі з французскіх, гішпанскіх вайскоўцаў, але й з жаўнераў зь іншых краінаў, бок нават не вызначаецца мабільнасьцю і баяздольнасьцю, — скліканьне праектаванага вайсковага ўтварэньня адбывацца тады, калі гэта будзе неабходна, прычым вылучаных баявых адзінак; яно мае налічваць 60 000 здольных перабазавацца на працягу шэсьцьдзесяці дзён, і гэтых вайскоўцаў можна будзе ўтрымліваць у раёне рэагаваньня Эўропе ці паблізу ад яе“ мінімум адзін год. Павод самых розных эўрапейскіх ацэнак, такая сіла будзе ўяўляць цэлы вайсковы корпус, узброены прыкладна 150 самалётамі, 15 вялікімі ваеннымі караблямі, эскадрыллямі стратэгічнай авіяцыі і адпаведнай сыстэмай камандаваньня, кантролю, сувязі і інфармацыі. Эўрапейскія вайсковыя спэцыялісты павінны апэратыўна правесьці рэвізію крыніцаў эўрапейскай вайсковай тэхнікі, якую можна выкарыстоўваць для стварэньня ўзброеных сілаў, здольных выконваць задачы па падтрыманьні міру або нават удзеле ў абмежаваным маштабе ў нейкіх (дакладней ня вызначаных) баявых апэрацыях.

Наяўнасьць вайсковых сілаў азначала б узьнікненьне сапраўднай „эўрапейскай індывідуальнасьці ў бясьпецы і абароне“ (ESDI), здольнай дзейнічаць і па-за рамкамі Аднак эўрапейская абаронная ініцыятыва — штуршок да ўзьнікненьня якой дала выяўленая ў часе косаўскага крызысу вайсковая слабасьць Эўропы — падмацаваная французскімі прэтэнзіямі, але ўраўнаважаная схільнасьцю брытанскага немцаў да кампрамісу з амэрыканцамі, мусіць вынікам асноўныя экзамэны: на здольнасьць хутка рэагаваць, на баяздольнасьць і на матэрыяльна-тэхнічную забясьпечанасьць. Эўропа мае сродкі на стварэньне такой сілы, аднак застаецца пытаньне, ці мае яна да гэтага волю.

На гэтай фазе разьвіцьця гэтых сілаў нельга не ацэніць скептычна іхны рэальны патэнцыял. Вядучыя эўрапейскія

тое, чаго ўжо няма — пазьбегчы“, то

Эўропы, будзе ўключаць 35 тысяч 40 тысяч, ці 60 000 чалавек, і гэтых ня менш, і гэтых „у Эўропе ці паблізу ад яе“ мінімум адзін год. Павод самых розных эўрапейскіх ацэнак, такая сіла будзе ўяўляць цэлы вайсковы корпус, узброены прыкладна 150 самалётамі, 15 вялікімі ваеннымі караблямі, эскадрыллямі стратэгічнай авіяцыі і адпаведнай сыстэмай камандаваньня, кантролю, сувязі і інфармацыі. Эўрапейскія вайсковыя спэцыялісты павінны апэратыўна правесьці рэвізію крыніцаў эўрапейскай вайсковай тэхнікі, якую можна выкарыстоўваць для стварэньня ўзброеных сілаў, здольных выконваць задачы па падтрыманьні міру або нават удзеле ў абмежаваным маштабе ў нейкіх (дакладней ня вызначаных) баявых апэрацыях.

Наяўнасьць вайсковых сілаў азначала б узьнікненьне сапраўднай „эўрапейскай індывідуальнасьці ў бясьпецы і абароне“ (ESDI), здольнай дзейнічаць і па-за рамкамі Аднак эўрапейская абаронная ініцыятыва — штуршок да ўзьнікненьня якой дала выяўленая ў часе косаўскага крызысу вайсковая слабасьць Эўропы — падмацаваная французскімі прэтэнзіямі, але ўраўнаважаная схільнасьцю брытанскага немцаў да кампрамісу з амэрыканцамі, мусіць вынікам асноўныя экзамэны: на здольнасьць хутка рэагаваць, на баяздольнасьць і на матэрыяльна-тэхнічную забясьпечанасьць. Эўропа мае сродкі на стварэньне такой сілы, аднак застаецца пытаньне, ці мае яна да гэтага волю.

На гэтай фазе разьвіцьця гэтых сілаў нельга не ацэніць скептычна іхны рэальны патэнцыял. Вядучыя эўрапейскія

вайсковыя спэцыялісты канстатавалі, што стварэньне такой сілы можа адбыцца без далейшага павышэньня выдаткаў, дзякуючы прадуманаму пераразьмеркаваньню ўжо існуючых бюджэтных сродкаў на абарону. Гэта, аднак, супярэчыць здаровай лёгіцы. Для сур'ёзных эўрапейскіх аналітыкаў відавочна, што плянаваная вайсковая сіла будзе вымагаць як удасканаленьня цэнтральнага кіраваньня матэрыяльна-тэхнічным забесьпячэньнем ды супольнымі вайсковымі рэсурсамі, так, магчыма, і нейкіх сумесных вайсковых вучэньняў. Гэта, аднак, азначала б далейшае павышэньне выдаткаў, ня кажучы ўжо пра больш сутнасныя патрэбы, напрыклад, адпаведныя дасьледаваньні і збор інфармацыі, а таксама пра павышэньне канкурэнтаздольнасьці і адзінства эўрапейскай вайсковай прамысловасьці. Тым ня менш, у апошнія гады агульная доля выдаткаў на вайсковыя патрэбы ў бюджэтах эўрапейскіх краінаў, а таксама на тэхналягічныя распрацоўкі і разьвіцьцё, зьвязаныя зь імі, насамрэч зьніжалася. Выдаткі эўрапейскіх краінаў на абарону насамрэч упалі з 1992 году прыкладна на 22%.
Важна і тое, што адсутнасьць стратэгічнага мысьленьня ў палітычнай сфэры спрыяе занядбаньню вайсковых пытаньняў. Як напісаў у 1999 годзе Даніэль Вэрнэ ў газэце *Le Monde*, эўрапейцы *„мусяць дакладна ведаць, чаго яны хочуць, распрацаваць праграмы па рэструктурызацыі абароны (палітычна значныя і фінансава дарагія) і ўрэшце вылучыць зь бюджэту крыніцы, якія б адпавядалі гэтым запатрабаваньням“*, тады толькі могуць узьнікнуць эўрапейскія ўзброеныя сілы. Больш за тое, пры патрэбе выкарыстаньня сілаў у 60 000 чалавек у баявых умовах больш за год у распараджэньні камандаваньня павінны быць рэзэрвы ў колькасьці прыкладна 180 000 баяздольных эўрапейскіх жаўнераў. А іх няма. Далейшая складанасьць, якая яшчэ больш ставіць пад сумнеў рэальнасьць праекту, палягае ў тым, што некаторыя эўрапейскія дзяржавы ўваходзяць у ЭЗ, але не ўваходзяць у NATO (так званыя „нэўтральныя краіны“), а іншыя ўваходзяць у NATO, але застаюцца за рамкамі ЭЗ (некаторыя эўрапатрыёты называюць іх „траянскімі коньмі“ Амэрыкі). Няясна, як яны паставяцца да ESDI, і гэта заканамерна ўскладняе ўсе пачынаньні. І нарэшце, магчыма, найважнейшае: спалучэньне праектаваных вайсковых сілаў з існуючымі структурамі NATO

можа выклікаць няўзгодненасьць, а на палітычным узроўні — раскол.
Такім чынам, найбольш праўдападобным вынікам узьнікненьня ESDI ўрэшце будзе тое, што праектаваныя вайсковыя сілы ня стануць ані канкурэнтам NATO, ані „фундамэнтам Эўропы“, якога так доўга бракавала і які мог бы зрабіцца асновай больш гарманічных дачыненьняў у Альянсе. Хаця эўрапейцы, пэўна, і патрапяць неяк удасканаліць вайсковае плянаваньне і аб’яднаныя камандныя структуры, асабліва пасьля меркаванага зьліцьця Заходнеэўрапейскага Саюзу беспасярэдне з ЭЗ.
У наступныя пяць і больш гадоў, мабыць, паступова паўстануць удасканаленыя эўрапейскія вайсковыя сілы, якія за рамкамі дзейнасьці NATO будуць выкарыстоўвацца дзеля захаваньня міру ў некаторых гарачых пунктах Эўропы, не дапускаючы эскаляцыі гвалту (найверагодней, на Балканах). Так званы фундамэнт Эўропы акажацца хутчэй кардонным, чым сталёвым ці бэтонным. А ў выніку Эўропа ня стане паўнавартаснай глябальнай вялікай дзяржавай. Гэта, магчыма, балючае адкрыцьцё для тых, хто хацеў бы бачыць Эўропу палітычна жыцьцяздольнаю, але бальшыня эўрапейцаў пакуль не гатовая ня толькі што паміраць за Эўропу, але нават плаціць за эўрапейскую бясьпеку.

Дзесяць высноваў
аб разьвіцьці й пэрспэктывах Эўропы

1) Для бальшыні эўрапейцаў „Эўропа“ — не прадмет асаблівага пачуцьцёвага стаўленьня. За ёй стаіць хутчэй імкненьне да выгады, чымся пераканаьні.
2) З глябальнае пэрспэктывы Эўропа будзе выглядаць не як Амэрыка, але хутчэй як вялікая Швайцарыя.
3) Бальшыня эўрапейцаў ня лічыць антыамэрыканізм стымулам да адзінства.
4) Інтэграцыя, па сутнасьці, бюракратычны працэс, і ён ня тое самае, што яднаньне.
5) Пашырэньне ЭЗ немінуча ўвойдзе ў супярэчнасьць з паглыбленьнем інтэграцыі.
6) З дэмаграфічных і эканамічных прычынаў пашырэньне ЭЗ неабходнае.
7) Стварэньне на фэдэрацыйнай аснове малога ядра дзяржаваў,

якія б разам і вызначалі замежную палітыку ўсяго ЭЗ у складзе дваццаці адной або й большай колькасьці дзяржаваў, палітычна нерэальнае.
8) Павольнае пашырэньне ЭЗ разам з інтэграцыяй бюракратычнага тыпу найхутчэй створыць эканамічна адзіную, але палітычна хіба што канфэдэрацыйную Эўропу.
9) Малаверагодна, каб Эўропа займела самастойныя ўзброеныя сілы.
10) Такім чынам, ЭЗ зробіцца абсалютна новым тыпам палітычнай супольнасьці з глябальным уплывам найперш на эканоміку і фінансы.

Стратэгічнае плянаваньне

Пры выпрацоўцы палітыкі ў дачыненьні да Эўропы амэрыканцам варта кіравацца простым прынцыпам: нашкодзіць рабіць ідэальнае ворагам добрага. З гледзішча Вашынгтону ідэальна было б, калі б узьнікла палітычна адзіная Эўропа, якая была б адданым сябрам NATO — сябрам, які выдаткоўваў на абарону столькі ж, колькі й Злучаныя Штаты, прычым гэтыя грошы ішлі б амаль выключна на ўмацаваньне NATO, сябрам, які дазволіў бы NATO дзейнічаць, але ўмешвацца рэгіёну“, зьніжаючы цяжар амэрыканскіх абавязкаў сусьветным маштабе, надалей ішоў бы насустрач амэрыканскім прыярытэтам у геапалітычнай сфэры, асабліва калі тычыцца датычыць суседніх рэгіёнаў — Расеі і Блізкага Ўсходу, нарэшце, супрацоўнічаў бы ў такіх сфэрах, як міжнародны гандаль і фінансы. А дабро — гэта эканамічна больш канкурэнтаздольная Эўропа, краіны якой няспынна набіралі б усё больш узаемазалежнымі, гэта Эўропа, якая разьмяшчэньне амэрыканскіх вайсковых сіл на Эўропы, у Эўразіі адпавядае яе інтарэсам, але якая ў меншай ступені была б незадаволеная сваёй залежнасьцю, дамагаючыся эмансыпацыі.

[4] Выразны крок у гэтым кірунку быў зроблены ў 1999 годзе, калі Airbus, кансорцыюм, створаны Aerospatiale, Matra SA і Daimler Chrysler Aerospace AG, аб'яднаўся з брытанскай British Aerospace і іспанскай CASA, каб стварыць Airbus Industrie, Eurocopter, Dassault і Snecma. Airbus, які ўжо стаў канкурэнтаздольным, пачаў адбіраць рынкавую долю ў Boeing, і ў 2001 годзе Boeing вырашыў зліцца з McDonnell Douglas, каб супрацьстаяць Airbus.

Амэрыканскім палітыкам варта прызнаць, што такое „добрае“ ў сапраўднасьці адпавядае жыцьцёвым інтарэсам Амэрыкі. Ім варта зьвярнуць увагу, што такія ініцыятывы, як, напрыклад, ESDI, адбіваюць памкненьне эўрапейцаў да самапавагі і што дробязныя пярэчаньні ім — цэлы шэраг *„а вось гэтага ня трэба“* з боку як дзярждэпартамэнту, так і міністэрства

абароны ЗША — толькі вымушаюць эўрапейцаў яшчэ мацней зацяцца, а на добры лад нават заганяюць немцаў і брытанцаў у абдоймы французаў. Акрамя таго, амэрыканскія захады, скіраваныя на нэўтралізацыю гэтых намаганьняў эўрапейцаў, толькі пераконваюць — абсалютна памылкова — некаторых жыхароў Старога Сьвету ў тым, што NATO мае большае значэньне для бясьпекі Амэрыкі, чымся для бясьпекі Эўропы. І, зважаючы на такія эўрапейскія рэаліі, NATO канечне датычаць праблемы, зьвязаныя з станаўленьнем ESDI, пакуль ня зьнятыя пытаньні, выніклыя ў працэсе яго стварэньня. Аднак гэта ня тыя праблемы, якія можна назваць прынцыповымі. Таму зробленыя драматычным тонам папярэджаньні аб „адрыве ад NATO“ даюць толькі адваротны эфэкт. У іх ёсьць нешта эсхаталягічнае, і праз гэта ўзьнікае пагроза, што магчымае ўзгадненьне адрозных падыходаў можа перарасьці ў дыскусіі прынцыповага характару. На гэтай глебе могуць разгарэцца канфлікты, якія ўжо мелі месца ў NATO ў мінулым і якія не прынесьлі нічога добрага — будзь то няўдалая ініцыятыва па шматбаковым кантролі за ядравай зброяй на пачатку 60-х, якая паскорыла рэалізацыю французкай ядравай праграмы, або, больш нядаўні прыклад, — нядоўгія спробы ператварэньня NATO ў нейкі від глябальнага альянсу (які б дзейнічаў „за межамі рэгіёну“) у 1999 г., чаго дамагаліся амэрыканцы і што ўрэшце не змагло прадухіліць вайны ў Косаве. Такія спрэчкі расьцярушваюць увагу і адводзяць яе ад асноўнага факту, а менавіта ад таго, што Паўночнаатлянтычны альянс сапраўды дзейнічае эфэктыўна. Хоць, ён, магчыма, і далёкі ад дасканаласьці, але не вымагае ніякай прынцыповай рэарганізацыі.

Тут нам варта спыніцца і задаць сабе пытаньне: прыпусьцім, новыя эўрапейскія вайсковыя сілы ўзьнікнуць яшчэ да 2003 году; дзе і пры якіх акалічнасьцях яны змогуць дзейнічаць самастойна? Якой мусіць быць сытуацыя, пры якой яны змогуць дзейнічаць рашуча, не атрымаўшы папярэдне гарантыяў падтрымкі з боку NATO і ў пэўнай ступені не залежачы нават ад гэтае падтрымкі? Прыпусьцім, што пачаўся канфлікт у Эстоніі: Крэмль справакаваў там выступленьні расейскай меншыні і стаў пагражаць умяшаньнем; у такой прыгодзе Эўропа не паварушыць і пальцам безь беспасярэдняга падключэньня NATO. Дапусьцім, што Чарнагорыя аддзялілася,

а Сэрбія ў адказ ужыла супраць яе сілу; у такім канфлікце, найхутчэй, уяўныя эўрапейскія вайсковыя сілы без удзелу ЗША пацярпелі б паразу. Хоць беспарадкі ў нейкім эўрапейскім рэгіёне — скажам, у Трансыльваніі або нават на Корсыцы — могуць стаць нагодаю для ўвядзеньня туды эўрапейскіх міратворчых сілаў (як гэта было ў Босьніі), але такі тып умяшальніцтва наўрад ці можа сьведчыць пра тое, што Эўропа робіцца, як кажа французкі міністар абароны Ален Рышар, *„незалежным акторам на міжнароднай сцэне“*.

Для выкананьня сур'ёзных задачаў плянаваныя эўрапейскія вайсковыя сілы будуць вымушаныя спадзявацца на NATO ў самым ключавым пытаньні — зборы інфармацыі, разьведцы і арганізацыі паветраных мастоў. Тэхнічныя сродкі для ўсяго гэтага належаць пераважна амэрыканцам, хоць і былі перададзеныя ў распараджэньне NATO. З гэтай прычыны *de facto* NATO таксама ўзяло б удзел у акцыі, нават калі б скарысталася сваім правам адмовіцца ўдзельнічаць у ёй беспасярэдне. Карацей кажучы, у выпадку, калі крызыс будзе сур'ёзны, Эўропа ня стане рэагаваць на яго самастойна, а самастойна будзе рэагаваць толькі на несур'ёзныя крызысы. Безумоўна, што ўнутранае рэарганізацыі NATO не пазьбегчы, бо Эўропа будзе паволі разьвівацца ў выразьней акрэсьленую палітычную супольнасьць. Узьнікненьне ESDI зробіць працэс прыняцьця рашэньняў у NATO ў нейкай ступені больш грувасткім, а ўдзел Эўропы ў NATO (калі ЭЗ будзе дамагацца стварэньня ўласных вайсковых сілаў), магчыма, крыху зьнізіцца. Узьнікненьне ESDI, асабліва пасьля таго, як эўрапейцы створаць у рамках ЭЗ нейкае эўрапейскае ваеннае ведамства, натхніць Эўропу на разрабленьне самастойнай абарончай стратэгіі, якую будуць падзяляць усе краіны ЭЗ і зь якой будзе вымушана лічыцца Амэрыка. У такім разе, аднак, у Эўропе наўрад ці адбудуцца нейкія рэзкія зьмены — тым больш раней за 2003 год — наўрад ці будуць створаныя самастойныя эўрапейскія ўзброеныя сілы; замест гэтага, мабыць, пачне паволі нарошчвацца выпуск ваеннай прадукцыі[4] і ўзмацняцца ваеннае плянаваньне.

Калі гаварыць пра дзейнасьць NATO ў будучыні, дык больш важнай праблемай, чымся небаяздольнасьць эўрапейцаў у косаўскай вайне, аказваецца бязьдзейнасьць Эўропы пасьля косаўскай вайны. Зьдзіўляе той факт, што „Эўропа“ няздольная

ня толькі сама сябе абараніць, але нават сама падтрымліваць парадак. Няздатнасьць эўрапейскіх дзяржаваў самастойна і эфэктыўна падтрымліваць мір у малым і маланаселеным рэгіёне ды іх нежаданьне выдзеліць фінансавыя сродкі на яго эканамічнае ажыўленьне зьяўляюцца куды больш сур'ёзным выклікам адзінству NATO, чымся ESDI ў пляне далекасяжных наступстваў. Гэты факт, трэба думаць, прымусіць Амэрыку падбаць пра належнае ўмацаваньне абараназдольнасьці Эўропы сіламі амэрыканскай арміі.

У найбліжэйшай будучыні яшчэ большыя супярэчнасьці могуць — з прычыны большага стратэгічнага значэньня — выклікаць амэрыканскія пляны разгортваньня сыстэмы проціракетнай абароны. На дыскусію аб разгортваньні сыстэмы ПРА, што разгарэлася ў Злучаных Штатах, уплывалі найперш фактары, абумоўленыя сытуацыяй на тамтэйшай палітычнай сцэне. Аднабаковае рашэньне ЗША, прынятае ў запале прэзыдэнцкай кампаніі, выклікала б крытыку ў Эўропе. Аднабаковыя крокі ЗША ў гэтай справе прывялі б да нашмат больш далекасяжных наступстваў для амэрыканскай і эўрапейскай бясьпекі, чымся самыя страшныя эфэкты ESDI ў выглядзе „адрыву ад NATO", якія толькі можна ўявіць. Калі эўраатлянтычны вайсковы саюз і надалей мае заставацца для Амэрыкі асноўным стратэгічным прыярытэтам, з гэтага адназначна вынікае, што на дадзеным этапе неабходна дэталёва абмеркаваць з сваімі саюзьнікамі наступствы разгортваньня сыстэмаў проціракетнай абароны, іх магутнасьць, выдаткі на іх, магчымасьці прыняцьця кампрамісных рашэньняў у справе абароны, а таксама пралічыць варыянты разьвіцьця падзеяў, верагодныя пры падобным разгортваньні і выхадзе з ранейшых палітычных пагадненьняў па стратэгічных узбраеньнях. У кожным разе рашэньне павінен будзе прыняць ужо наступны амэрыканскі прэзыдэнт.
Пакуль гэткае рашэньне не прынятае, асноўным стратэгічным прыярытэтам Злучаных Штатаў мусіць застацца далейшае пашырэньне NATO. Бо пашырэньне NATO, відаць, — найлепшая зарука пэрспэктываў эўраатлянтычнага абарончага хаўрусу. Яно забясьпечвае пабудову больш бясьпечнай Эўропы зь меншай колькасьцю праблемных, геапалітычна двухсэнсоўных сытуацыяў, прычым матэрыяльная зацікаўленасьць Эўропы ў

захаваньні жыцьцёва неабходнай і надзейнай саюзьніцкай лучнасьці будзе расьці. Варта перагледзець рашэньне NATO, прынятае ў 1999 годзе, аб мараторыі на пашырэньне да 2002 году. А новаму амэрыканскаму прэзыдэнту адразу па ўступленьні на пасаду варта сур'ёзна задумацца над тым, каб рашэньне аб прыёме ў NATO новых сяброў было прынятае ў 2001 годзе. Некаторыя краіны, відавочна, да гэтага падрыхтаваныя, бо яны адпавядаюць ня толькі патрабаваньням, выстаўленым нядаўна Польшчы, Чэхіі і Вугоршчыны, але нават тым, якія некалі раней былі вызначаныя для Гішпаніі. Паскарэньне працэсу пашырэньня NATO яскрава сьцьвердзіла б ня толькі жыцьцёвую неабходнасьць эўраатлянтычнага абарончага партнэрства, але й сур'ёзнасьць намераў Амэрыкі і Эўропы што да стварэньня сыстэмы бясьпекі ў Эўропе, якая ў выніку стане сапраўды „эўрапейскай сыстэмай бясьпекі" ў сэнсе поля яе дзеяньня.

Амэрыканская падтрымка пашырэньня NATO спалучаецца з зацікаўленьнем Амэрыкі ў пашырэньні ЭЗ. Бо чым большай будзе Эўропа, тым менш верагоднаю робіцца сур'ёзная вонкавая або ўнутраная пагроза міру ў сусьветным маштабе. Акрамя таго, чым большая колькасьць краінаў будзе адначасова ўваходзіць у NATO і ў ЭЗ, тым больш згуртаванай будзе эўраатлянтычная супольнасьць і тым больш будуць узаемадапаўняцца памкненьні прыхільнікаў эўраатлянтычнага аб'яднаньня і эўрапейскай самабытнасьці. Тое, што некаторыя краіны сёньня гатовыя адначасова і да сяброўства ў NATO, і да сяброўства ў ЭЗ, можна назваць проста шчасьлівым зьбегам акалічнасьцяў. Злучаным Штатам нескладана пераканаўча давесьці, што Славенія, Славаччына і Летува ўжо цяпер цалкам або амаль цалкам адпавядаюць крытэрам, неабходным для ўступу ў NATO. Паводле параўнальнага дасьледаваньня, праведзенага кампаніяй *Pricewaterhouse Coopers*, некалькі сярэднеэўрапейскіх дзяржаваў (у тым ліку Славенія і Эстонія) лепей падрыхтаваныя да сяброўства ў ЭЗ — з гледзішча макраэканамічнай стабільнасьці, ВУП, эканамічнае інтэграванасьці з ЭЗ і разьвіцьця эканамічнае інфраструктуры, — чым Грэцыя на момант яе ўступленьня ў Эўрапейскую супольнасьць. Пра Польшчу і Чэхію — абедзьве краіны ўжо далучыліся да NATO — тыднёвік *The Economist* нядаўна напісаў, што яны лепш гатовыя да прыняцьця, чым Італія ў свой час!

Таму ня можа не дзівіць тая акалічнасьць, што *„сёньня патрабаваньняў, якім трэба адпавядаць для прыняцьця краіны ў ЭЗ, болей, і яны стражэйшыя, чым тыя, што ў свой час прад'яўляліся паўднёваэўрапейскім краінам, калі яны далучыліся да ЭЗ“*[5].

Амэрыка мусіць падтрымаць краіны, гатовыя да ўступу ў ЭЗ і NATO. Аднак на гэтай стадыі іхнага пашырэньня рабіць прагнозы наконт будучых межаў Эўрасаюзу — спадзяемся, што яны будуць супадаць. Шмат будзе залежаць ад пазыцыі Расеі, для якой дзьверы ў Эўропу, заснаваную на эўраатлянтычным аб'яднаньні, варта было б пакінуць адчыненымі. Узбуйненая Эўропа, якая б уваходзіла ў пашыранае NATO, спрыяла б пазытыўнаму разьвіцьцю Расеі, стрымліваючы яе ад старых імпэрскіх спакусаў. Расея таксама, зразумела б, што яе інтарэс палягае ў прыстасаваньні і далучэньні да NATO. Калі ж гэтага не адбудзецца, пашыранае NATO забясьпечыць большую бясьпеку для Эўропы. У кожным разе, аднак, няправільна было б *a priori* выключаць Расею з працэсу пашырэньня любую эўрапейскую дзяржаву, гатовую ўступіць у NATO або ў ЭЗ.

Акрамя таго, як з геапалітычнага, так і з эканамічнага гледзішча ўжо цяпер можна сказаць: як толькі NATO і ЭЗ пашырацца настолькі, што ў іх увойдуць краіны Балтыі і некаторыя дзяржавы Паўднёва-Ўсходняй Эўропы, пажадана наступным этапам пашырэньня зрабіць далучэньне да Эўразьвязу ня толькі Турэччыны, але Кіпру (пасьля ўрэгуляваньня турэцка-грэцкага канфлікту) і Ізраілю (пасьля заключэньня канчатковага міру з усімі яго суседзямі). Больш за тое, з пашырэньнем Эўропы эўраатлянтычная супольнасьць будзе змушаная адрэагаваць на сыгналы з такіх краінаў, як Украіна, Грузія і нават Азэрбайджан, наконт таго, што ў агляднай будучыні яны таксама будуць імкнуцца ўзяць удзел у велічнай гістарычнай будоўлі, якая адбываецца ў Эўразіі, і зьвязаць з ім свае лёсы. Злучаныя Штаты і надалей будуць падтрымліваць намаганьні ЭЗ па глыбейшай інтэграцыі, нават калі гэтая падтрымка будзе праяўляцца пераважна на словах. Злучаныя Штаты абачліва пазьбеглі таго, каб іхны падыход атаесамляўся з выступамі

[5] Эмануэль Тодэ, Габор Рэвэс, *The State of the Eastern Union — Compared with the EU's Past*, *The Hungarian Academy of Sciences*, Будапешт, 1999, с. 4.

брытанскіх кансэрватараў супраць палітычна і фінансава адзінай Эўропы, і ім варта гэтакжа пазьбягаць і спакусы *Schadenfreude*[*], калі Эўропа спатыкнецца. Якраз таму, што эўрапейская інтэграцыя будзе прасоўвацца павольна, а эўрапейская палітычная супольнасьць ня будзе падобнаю да амэрыканскай, Амэрыка не павінна асьцерагацца таго, што за акіянам расьце яе супернік. Эўраатлянтычныя дачыненьні хутчэй нагадваюць такі шлюб, у якім муж і жонка — розныя людзі, што паважаюць свае адрозьненьні, у тым ліку пэўны падзел працы, але разумеюць і супольныя інтарэсы, прычым у сапраўднасьці і тое, і другое служыць для ўмацаваньня іх лучнасьці. Так было ў апошнія пяцьдзясят гадоў, так мусіць стацца і надалей.

Безумоўна, такі характар разьвіцьця міжнароднай сыстэмы павінен умацоўваць эўраатлянтычны хаўрус. Эўропа і Злучаныя Штаты складаюць разам пад 15% насельніцтва сьвету, яны — выяўныя выспы дабрабыту і дастатку ў вірлівым і неспакойным сусьветным моры. У нашым стагодзьдзі, калі з кім заўгодна ў сьвеце можна зьвязацца імгненна, любое ўсьведамленьне няроўнасьці можа хутка перарасьці ў палітычную варожасьць у дачыненьні да тых, каму можна пазайздросьціць. Таму як уласны інтарэс, так і пачуцьцё магчымай прыступнасьці павінны надалей служыць трывалай апорай амэрыканска-эўрапейскага саюзьніцтва.

Эўрапейская палітычная супольнасьць, якая ляжыць на заходняй ускраіне Эўразіі ў беспасярэдняй блізіні ад Афрыкі, больш уразьлівая да крызысных сытуацый, зьвязаных з нарастаньнем хаосу ў сьвеце, чым палітычна лепш згуртаваная, вайскова мацнейшая і геаграфічна больш ізаляваная Амэрыка. Эўрапейцам пагражае небясьпека ў выпадку, калі падставай расейскай замежнай палітыкі зноў стане шавіністычны імпэрыялізм або калі ў Афрыцы і/або на поўдні Цэнтральнай Азіі адбудзецца далейшае пагаршэньне сацыяльнае сытуацыі. Распаўзаньне ядравай і іншай зброі масавага зьнішчэньня па сьвеце таксама будзе пагражаць Эўропе мацней, бо яе ваенныя магчымасьці абмежаваныя, а дзяржавы, ад якіх гэтая небясьпека можа выходзіць, ляжаць паблізу яе. Такім чынам, куды ні глянь, відаць, што Эўропе, калі ў ёй сапраўды мае панаваць спакой, будзе і надалей патрэбная Амэрыка.

Зь філязофскага гледзішча, аднак, шчыльная сувязь з Эўропай

адначасова легітымізуе ролю Амэрыкі ў сьвеце і стаецца цэнтральным пунктам яе палітыкі. У выніку гэтай сувязі ўтвараецца супольнасьць дэмакратычных дзяржаваў, безь якой Злучаныя Штаты ў сьвеце аказаліся б у адзіноце. Абарона, паляпшэньне, а асабліва пашырэньне гэтай супольнасьці — каб *„гарантаваць свабоду сабе і сваім нашчадкам“* — павінны застацца для Амэрыкі жыцьцёва важнай гістарычнай задачай.

Асноўныя перадумовы
і дырэктывы да правядзеньня амэрыканскай палітыкі

1) Эўропа застаецца натуральным і галоўным саюзьнікам Амэрыкі.
2) Эўропа як прыхільнік эўраатлянтычнага саюзу — асноўная ўмова для захаваньня стабільнасьці ў Эўразіі.
3) Злучаныя Штаты не павінны працівіцца стварэньню баяздольных самастойных эўрапейскіх узброеных сілаў, на ўзьнікненьне якіх у блізкай будучыні, аднак, спадзявацца не выпадае.
4) Палітычнае адзінства саюзьнікаў важнейшае за ўмацаваньне NATO.
5) Злучаным Штатам варта адкласьці прыняцьце любога рашэньня аб разгортваньні сыстэмы абароны ад балістычных ракет, пакуль ня будзе дасягнутая дамоўленасьць з саюзьнікамі ў NATO ў гэтым пытаньні.
6) Злучаным Штатам трэба рабіць захады па пашырэньні NATO ў Эўропе, але ні ў якім разе не такога NATO, якое дзейнічала б „за межамі рэгіёну“.
7) Злучаныя Штаты кроўна больш зацікаўленыя ў пашырэньні Эўразьвязу, чымся ў яго інтэграцыі.
8) NATO і ЭЗ варта супрацоўнічаць у справе свайго далейшага пашырэньня.

Камэнтар Даніэля Вэрнэ да З.Бжазіньскага

Зьбігнеў Бжазіньскі дакладна ведае, дзе б маглі **ДАНІЭЛЬ ВЭРНЭ** эўрапейскія вайсковыя сілы: на Корсыцы! Дзякуючы **ВЭРНЭ** доктару. Дзеля гэтага мы ўжо маем французскую жандарэрыю, адмысловае падразьдзяленьне Нацыянальнай гвардыі, якое, між іншым, ёсьць вялікі попыт як у Босьніі, так і ў Косаве.

Калі сур’ёзьней, Бжазіньскі прэзэнтуе тую партыю амэрыканскіх палітыкаў, якая досыць спагадліва адносіцца да працэсу эўрапейскай інтэграцыі, у тым ліку да спробаў пабудовы эўрапейскіх вайсковых сілаў, што былі б эдыі дзейнічаць незалежна ад NATO. Бжазіньскі не крытыкуе гэтага праекту і ня раіць Вашынгтону заблякаваць яго. Ён не ператварае гэтага ў прынцыповую праблему, якая б магла стацца прычынай расколу саюзьнікаў з розных бакоў Атлянтыкі. Бо ён больш чым скептычны ў ацэнцы здольнасьці эўрапейцаў скончыць распачатае; ён дазваляе сабе даваць амэрыканскаму ўраду добрую параду: ня бойцеся, што вы набудзеце суперніка. У якасьці аргумэнтацыі Бжазіньскі прыводзіць досыць цікавыя аргумэнты. Дазвольце мне тут акрэсьліць некаторыя зь іх.

1) Інтэграцыя замяніла аб’яднаньне ў якасьці канчатковае мэты эўрапейскага працэсу. Гэты працэс будзе павольны, бо хуткі працэс мог бы хутчэй падзяліць Эўропу, чымся аб’яднаць.

2) Эўропа будзе расьці хутчэй у гарызантальным, чым у вэртыкальным кірунку, а пашырэньне неспалучальнае з паглыбленьнем.

3) ESDI — эўрапейская індывідуальнасьць у бясьпецы і абароне — для NATO не пагроза, бо, нават паводле самых аптымістычных прагнозаў, яна будзе дзейсная толькі ў выпадку непрынцыповых крызаў.

4) NATO і ЭЗ павінны пашырацца ў аднолькавым тэмпе, прычым з гэтага працэсу *a priori* ня трэба выключаць ніводнай краіны. Складнікам гэтага працэсу мусіць стацца і шчыльнае збліжэньне з Расеяй, якая мае прызнаць, што адначасовае пашырэньне NATO—ЭЗ не супярэчыць яе ўласным інтарэсам. Калі Расея гэткага ня зробіць, пашырэньне NATO—ЭЗ неабходнае будзе для забясьпячэньня бясьпекі супольнай Эўропы.

Здаецца, што Бжазіньскі падзяляе ўяўленьне Аталі пра Эўропу ад Атлянтыкі да Ўладзівастоку, якая, аднак, не стасуецца з марай бацькоў-заснавальнікаў адзінай Эўропы пра Супольны рынак ды Эўрапейскую супольнасьць. Гэтая мара прадугледжвала ўтварэньне новай Эўропы ня толькі як зоны свабоднага гандлю, але і як актора на міжнароднай сцэне, палітычнага партнэра Амэрыкі, яна прадбачыла ўтварэньне Эўропы, якая б, можа, і ня сталася сапраўды вялікай дзяржавай

міжнародных адносінаў фрабнускай і б эдыі *Le Monde*

у сусьветным маштабе пры жыцьці гэтага або наступнага пакаленьня, але якая б зрабілася палітычнай сілай у рэгіёне і ня толькі спрыяла б пераадоленьню гістарычных канфліктаў паміж краінамі-ўдзельніцамі, але й экспартавала бясьпеку і дабрабыт у сваё „блізкае замежжа“.
Бжазіньскі мае рацыю: гэтае бачаньне — якое традыцыйна знаходзіць падтрымку кожнага французскага ўраду, але якое заканамерна не падзяляюць іншыя яе партнэры ў ЭЗ — супярэчыць стану, у якім знаходзіцца Эўропа цяпер.
І адначасова ён мае рацыю, калі паказвае, што сёньняшняя сытуацыя ў наступныя колькі гадоў ня зьменіцца. У некаторых сфэрах (напрыклад, калі ідзецца пра інстытуцыі) Эўропа будзе хутчэй прыстасоўвацца да ўжо існуючай структуры, чым праводзіць глыбокія зьмены, неабходныя для *grand bond en avant**. У іншых сфэрах (напрыклад, у вайсковай) ёй не стае або волі, або сродкаў, а можа, і таго, і другога, каб здолець рэалізаваць супольную палітыку. Але асабліва ёй не стае палітычнае волі да выдзяленьня большых сродкаў на тыя артыкулы бюджэту, якія датычаць абароны, безь якіх, аднак, немагчыма будзе мець супольную замежную і абарончую палітыку.
Усе гэтыя пункты знаходзяцца па-за дыскусіяй. Тым ня менш, будучыня Эўрапейскага зьвязу не выглядае аж так змрочна, як яе расьпісвае Бжазіньскі. Бо Эўропа дагэтуль не дасягнула таго крытычнага пункту, які б зрабіў для яе немагчымым напаўненьне пачатковай ідэі рэальным зьместам. Апрача таго, кожны яе захад за апошнія дзесяць гадоў — супольны рынак, эўра, свабоднае перасоўваньне людзей па Эўропе (г.зв. *Schengenland*), прызначэньне найвышэйшага камісара па замежных зносінах і супольнай бясьпецы (сьціплы, але рэалістычны крок на шляху да эўрапейскай абароны) — мае патэнцыял далейшага ўдасканальваньня, нават калі гэты патэнцыял і ня носіць нейкага надзвычайнага характару. Магчымасьць выбару застаецца дасёньня.
Возьмем, напрыклад, праект стварэньня ўзброеных сілаў. Бжазіньскі слушна заўважае, што, калі крыза будзе сур'ёзнай, Эўропа ня зможа даць ёй рады самастойна. Пакуль што гэта сапраўды так. Але здольнасьць рэагаваць самастойна няхай сабе на канфлікты, якія ня маюць жыцьцёва важнага значэньня, была б ужо сама сабой прынцыповым крокам наперад, асабліва

калі параўнаць гэта зь няздольнасьцю і неахвотай эўрапейцаў рэагаваць на некаторыя нядаўнія крызысы меншага маштабу. Дык жа спачатку трэба зрабіць першы крок, а потым ужо другі. Ад самага канца другой сусьветнай вайны амэрыканскае стаўленьне да эўрапейскай інтэграцыі заўсёды было дваістым: аб'ядноўвайцеся, але не перабярыце меры. З канцом халоднай вайны гэтае дваістае стаўленьне не зьмянілася. Няшчасная Эўропа, няздольная выйсьці за рамкі, накрэсьленыя ёй інтэграцыяй; шчасьлівая Амэрыка, якая мае такога саюзьніка!

Камэнтар Крыстафа Бэртрама да З.Бжазіньскага

Нягледзячы на многія слушныя заўвагі, прадказаныя Бжазіньскага што да стасункаў ЗША і Эўропы ў будучыні мае ўрэшце служыць супакаеньню яго самога, а таму яна перакручанае. Мы можам абагульніць яго адным сказам: Эўропа, страшэнна далёкая ад таго, каб зрабіцца суперніком Злучаных Штатаў, застанецца залежнай пераменнай, карыснай прыладай для ажыцьцяўленьня амэрыканскае стратэгіі, накіраванай на пашырэньне прасторы стабільнасьці на як мага большую колькасьць краінаў, за выняткам Расеі, шляхам іх далучэньня да Альянсу; яна будзе задавальняць усе прыхамаці Злучаных Штатаў, але не павінна ўважацца за раўнапраўнага партнэра.

Аднак у адным Бжазіньскі мае рацыю: амэрыканцы не павінны панікаваць, калі ЭЗ спрабуе паскорыць інтэграцыю ў такі, сфэры. Гнеў, якім час ад часу выбухае Вашынгтон з нагоды плянаў эўрапейцаў нязначна палепшыць здольнасьць сваіх сілаў апэратыўна ўмешвацца ў справы „за межамі рэгіёну“, нічым не апраўданы: які б плён гэтыя пляны ні далі, эўрапейскія ўзброеныя фармаваньні вымушаныя будуць карыстацца амэрыканскай вайсковай тэхнікай, а таму ім давядзецца ўзгадняць свае пляны з амэрыканцамі. Але рабіць з узброеных сілаў лякмусавую паперку эўрапейскай інтэграцыі — значыць, паўтараць памылку Сталіна, які пра Каталіцкую царкву меркаваў паводле колькасьці дывізіяў у яе распараджэньні. Нават Бжазіньскі, найбольш па-эўрапейску настроены чалавек сярод амэрыканскіх прыхільнікаў *Realpolitik*, не разумее, навошта, уласна, узьнікае гэтая новая Эўропа. Яна для яго — *„палітычная супольнасьць, збудаваная на выгадах“*,

КРЫСТАФ БЭРТРАМ

Foreign Policy

Stiftung für Wissenschaft und Politik

цэнтру міжнародных палітыкі, аднаго з дарадчых органаў нямецкага ўраду і нямецкага парлямэнту.

але ніяк не на *„перакананьні“*, прагматычны вытвар, прызначаны для завядзеньня дабрабыту й стабільнасьці, якімі ўсе будуць дзяліцца. Аднак прагматызм ня ёсьць дастатковым тлумачэньнем таго, чаму дзяржавы, гордыя за сваю гісторыю, ахвяравалі сваёй нацыянальнай аўтаноміяй на карысьць сваёй эўрапейскай узаемазалежнасьці. Тое, што прывяло іх да падпарадкаваньня аўтарытэту супольных законаў і супольнаму найвышэйшаму суду, стварэньня супольнай валюты, аб'яднаньня заходняй часткі кантынэнту, запрашэньня новых дэмакратыяў у астатняй Эўропе ў свой асяродак і цяперашніх спробаў знайсьці сродкі на арганізацыю самастойнай вайсковай дзейнасьці, абсалютна дакладна ніколі не грунтавалася адно на выгадах. У падмурку яго была і ёсьць пэўная ідэя Эўропы, пэўнае ўяўленьне пра яе.

Моцы гэтай ідэі ня варта недаацэньваць. Амэрыканцы ж такую памылку звычайна рабілі, дарма што цярпліва, цягам дзесяцігодзьдзяў халоднай вайны, стымулявалі Эўропу да інтэграцыі. Сёньня, калі іх, магчыма, насьцярожвае нованабытая ўпэўненасьць Эўропы ў сабе (а да гэтай насьцярожанасьці далучаецца, з аднаго боку, вузкалобае захапленьне ўласным вайсковым і тэхналягічным патэнцыялам, а з другога — замарака ад раскошы становішча адзінай і, відаць, апошняй сусьветнай супэрдзяржавы), здаецца, што амэрыканцы страцілі як цярплівасьць, так і зрок. Сумна, што Бжазіньскі яшчэ й прапаноўвае стратэгічнае абгрунтаваньне гэтай страты.

Але гэта недальнабачны падыход, і менавіта з прычынаў, якія аўтар так красамоўна фармулюе ўва ўводзінах да свайго артыкулу: *„Саюз Амэрыкі з Эўропай стварае ў сьвеце вось стабільнасьці“*. У Амэрыкі няма іншага партнэра, які б гэтак клапаціўся пра парадак на міжнароднай арэне, дабрабыт і прагрэс дэмакратыі. Эўропа пры ўсіх яе заганах сёньня значна мацнейшы партнэр, чымся яна была ў часе халоднай вайны. А ў будучыні яна зробіцца яшчэ мацнейшай.

Таму галоўным амэрыканскім інтарэсам сёньня мела б быць закладаньне падмурку партнэрства з заўтрашняй Эўропай. Панаваньне ЗША, магчыма, працягнецца яшчэ гадоў дваццаць-трыццаць, аднак яно ня будзе вечным. Хіба можна знайсьці лепшы ўжытак з гэтае сёньняшняе часовае выгады, чымся як сёньня пачаць утвараць інстытуцыйныя рамкі для партнэрства,

дзякуючы якому Эўропа, мацнейшая, чымся цяпер, і Амэрыка, слабейшая за свой цяперашні стан, маглі б разам імкнуцца да ладу, дабрабыту і дэмакратыі ў заўтрашнім сьвеце? Гэта, доктару Бжазіньскі, *Realpolitik*, якую трэба сабе ўявіць!

Камэнтар Тыматы Гартана Эша да З.Бжазіньскага

Гэты артыкул Зьбігнева Бжазіньскага, як і заўжды, ТЫМАТЫ ГАРТАНЫ ЭШ, праніклівы, творчы і надзвычай абсяжны. Мая праблема ў тым, што я згодны як з балышынёй высноваў ягонага аналізу, так і з парадамі, якія ён дае палітыкам, асабліва што да будучыні NATO і ЭЗ. Тым ня менш, дазвольце мне як эўрапейцу, чалавеку родам з брытанскіх выспаў, спыніцца на некаторых дэталях, якія, на маю думку, мусова ўдакладніць.

Па-першае, я заўжды быў за тое, каб называць рэчы сваімі імёнамі, нават калі ў палітычным сэнсе гэта нічым не будзе сябе апраўдваць. Цьверджаньне, што Эўропа ёсьць *„ваенным дадаткам вайсковым пратэктаратам Злучаных Штатаў“*, мне цалкам праўдзівым. Калі я скажу, што *„Ксанадуёкшыр — французскім пратэктаратам“*, дык на ўзроўні бангонскіх эрудыцыі пад гэтым разумеецца, што французы ўладараць. Аднак амэрыканцы ў Эўропе не ўладараць, і гэтыя словы ўзяць у іншым сэнсе, чымся *„быць заложнікам вайсковай абароны“*, дык гэтае цьверджаньне наўрад ці апраўданае, бо, нягледзячы на цяперашні хаос у Эўропейскай абароннай сфэры, на сёньня нашай бясьпецы нічога сур'ёзна не пагражае. Я маю на ўвазе пагрозы такога кшталту, ад якіх галоўныя эўрапейскія дзяржавы ня здолелі б абараніць сябе ці сваіх партнэраў па ЭЗ.

Праўда, па-другое, вядома, што нават наймацнейшыя краіны ЭЗ усё яшчэ мусяць спадзявацца толькі на Злучаныя Штаты пры патрэбе вядзеньня вайсковай апэрацыі за межамі ЭЗ, нават калі гаворка пра такі малы кавалак нашае зямлі, як Косава. Карысна было б шчыра прызнаць, што адной з галоўных прычынаў гэтага стану ёсьць тая акалічнасьць, што лідэры Заходняй Эўропы пры канцы халоднай вайны няправільна вызначылі прыярытэты, аддаўшы перавагу ўвядзеньню супольнай валюты, а не стварэньню супольнага войска. Ініцыятывы апошняга часу, скіраваныя на аптымізацыю замежнай палітыкі і каардынацыю абарончай дзейнасьці — гэта спроба ЭЗ нагнаць у 2000 годзе

ТЫМАТЫ ГАРТАНЫ ЭШ, аўтар кнігі *History of the Present: Essays, Sketches and Dispatches from Europe in the 1990s* (*Гісторыя сучаснасьці: эсэ, дасьледаваньні і рэпартажы з Эўропы 1990-х*), якая выйшла ў 2000 годзе. Гэты артыкул напісаны ім спэцыяльна для *Нашай Нівы*.

нераспачатае ў 1990-м. (Гэтае цьверджаньне я падрабязьней разьвіваю ў сваёй новай кнізе *History of the Present / Гісторыя сучаснасьці*.)

Па-трэцяе, Бжазіньскі абсалютна слушна адзначае безумоўную неабходнасьць такое палітыкі Злучаных Штатаў, пры якой Вашынгтон разглядалі б у якасьці таго, хто гэтыя запозьненыя ініцыятывы, асабліва што датычаць вайсковае сфэры, хутчэй ухваляе, а ня журыцца зь іхнае нагоды. Палітычнае пасланьне новае амэрыканскае адміністрацыі павінна гучаць абсалютна пазытыўна і адназначна: *„Мы хочам, каб Эўропа стварыла мацнейшую абарончую індывідуальнасьць і эфэктыўныя вайсковыя сілы, прызначаныя для хуткага рэагаваньня“*. А затым можна было б дадаць: *„А цяпер мы чакаем, што пра Косава вы зможаце паклапаціцца самі“*. Абмеркаваньне ўсіх абгрунтаваных пярэчаньняў што да спалучальнасьці эўрапейскае абароннае ініцыятывы з NATO магло б адбывацца на ніжэйшых, больш тэхнічных узроўнях.

Па-чацьвертае, з Эўропы сапраўды ніколі ня выйдзе адзінай краіны. Аднак я не такі пэсыміст, як Бжазіньскі, калі вядзецца гаворка пра магчымасьці пазытыўнага і пачуцьцёва афарбаванага атаесамленьня сябе з Эўропай. Я мяркую, што ў Сярэдняй Эўропе сапраўды ёсьць людзі, гатовыя нават *„памерці за Эўропу“*. *Malgré tout*, Эўропа мае душу. І за гэтую душу ідзе змаганьне. Спрошчана кажучы, тутака ідзе гаворка пра новую вэрсію старой спрэчкі паміж тымі, хто адстойвае арыентацыю эўраатлянтычную, лібэральную, хто хоча, каб вольны гандаль пашырыўся на ўвесь сьвет, і тымі, хто прытрымліваецца арыентацыі дэголеўскай, эстэтычнай і абарончай. Гістарычна так склалася, што шалі схінуліся на карысьць прыхільнікаў першай.

Па-пятае, рыторыка і палітыка Злучаных Штатаў выразна паўплывае на гэтае змаганьне, аднак невядома, да лепшага ці да горшага. Амэрыканцам ня варта чакаць утварэньня Злучаных Штатаў Эўропы, але ня трэба таксама ўспрымаць Эўропу як Вялікую Швайцарыю. Ім сьлед імкнуцца да дзьвюх мэтаў, якія найлепш акрэсьліў Джордж Буш-старэйшы: *„Разам весьці рэй“* і *„Адзіная і свабодная Эўропа“*.

Адказ З.Бжазіньскага

Я на самой рэчы ў прынцыпе згаджаюся з заключнымі высновамі, да якіх прыйшлі эўрапейскія крытыкі, мае сябры. Я сапраўды жадаю, каб Эўропа для Амэрыкі сталася сур'ёзна ўспрыманым партнэрам, аднак запаветнае жаданьне ня ёсьць добрым дарадцам пры правядзеньні рэальнае палітыкі. Утварэньне ўсё большай і ўсё больш інтэграванай эўрапейскай прасторы, сувязі якой са Злучанымі Штатамі былі б шчыльнымі, — адзіная сапраўды важная рэч, а зарукай для гэтага ёсьць устрыманьне Эўропы ад моцных спакусаў і ператварэньне няпэўнае геапалітычнае прасторы ў рэгіёне паміж эўраатлянтычнай зонай і Расеяй.
Пераклаў Сяргей Сматрычэнка
паводле The National Interest*, № 6,*
лета 2000 году, сс. 17–32.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (15) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **28-04-2001**
[image]

Вінцэсь Мудроў

Пошукі радзімы

ВІНЦЭСЬ МУДРОЎ празаік, жыве ў Полацку, сталы аўтар Радыё Свабода і газэты „Наша Ніва". Сярод апошніх ягоных публікацыяў - аповесьць „Іду на таран" („Калосьсе", 2000).

Кожны раз увесну, калі прылятаюць птушкі і высокае неба скаланаецца ад птушынага граю, калі ў гарадзкіх парках і на гародах паляць зімовае сьмецьце і жоўтыя лапы дыму цягнуцца, нібыта кітайскія цмокі, да дрыготка-зьвінючага сонца, памяць мая абуджаецца, і я вяртаюся ў тую далёкую, немаведама якога году вясну, бачу шпака, што сьпявае на разгалістай яблыні, і маці, якая стаіць на ганку, зь вінаватай усьмешкай паглядаючы на пеюна. „Шпак", — прамаўляе маці, і вочы ейныя захоплена бліскаюць. Я таксама гляджу на птушку, і ў гэты момант за сьпінай маёй чыркае запалка, і бацька, прыпаліўшы папяросу, вясёлым голасам гукае: „Ну, здорово живёшь... Какой же это шпак? Это скворец!" Мы з бацькам сьмяемся зь нехлямяжага матчынага слова, і маці, усё з той жа вінаватай усьмешкай на твары, ледзь чутна прамаўляе: „Скворец".
З таго красавіцкага ранку мінула сорак, а можа й болей гадоў. І сёньня, згадваючы вясёлы бацькаў сьмех і матчыну ўсьмешку, я разумею, што яны нездарма захаваліся ў цёмных спратах памяці, бо былі своеасаблівым кодам маёй сутнасьці, жывымі

генамі беларускай і расейскай мэнтальнасьці.
Дзьве душы — беларуская ды расейская — жывуць ува мне з тае пары. Ім цесна пад адной скурай, яны штодня крояць на часткі маё *ego,* і, відаць, я змагу ўсьвядоміць сябе беларусам толькі на божай пасьцелі, калі адна душа вылузьнецца са скуры, а другая — беларуская — забавіцца на хвіліну. І калі знадворку будуць сьпяваць шпакі і жоўтыя лапы дыму будуць цягнуцца да сонца, а на белых вуснах маіх застыне вінаватая ўсьмешка, ведайце: я памёр беларусам.

Творы падобнага жанру вымагаюць прэамбулы. Вымагаюць нейкай замяшанай на лірыцы мудрагелі, хаця ў наш цэйтнотны час падобныя ўступы глядзяцца як анахранізм (слова, вытворнае ад народнага выразу „А на храна?“). Зрэшты, анахранізм пануе сёньня ня толькі ў мэмуарыстыцы: ім працятае ўсё наша жыцьцё (А на храна нам гэтая мова? — апошняе слова можна замяніць дэмакратыяй, рынкам альбо незалежнай дзяржаваю). Анахранізм стаўся ідэалягічным падмуркам краіны, і незьлічоныя анахраністы ў розныя часіны сьвідравалі маю непадатную сьвядомасьць.
„Якога хрэна ты, смаркачу, лезеш у палітыку? Хутка табою зоймуцца кампэтэнтныя органы“, — казаў аўтару, тады яшчэ вучню дзясятае клясы, родны бацька.
„Навошта табе, маладому чалавеку, расейцу, беларуская мова?“ — пытаўся афіцэр КГБ, ушчыльную заняўшыся аўтарам увосень 1974 году.
„На якую халеру табе гэтая беларушчына? Займіся ты лепш сям’ёй“, — казала аўтару ягоная жонка неўзабаве пасьля вясельля.
„Віця, не чапляйся да камуністаў — прыдушаць“, — казала аўтару ягоная цешча.
„Вінцэсю, на якую халеру ты марнуеш час? Беларускія тэксты нечытэльныя.. Напішы што-небудзь па-расейску“, — заахвочваў аўтара ягоны падсябрыч — расейскамоўны пісьменьнік.
„Ну на што ты паклаў сваё жыцьцё? Пра які народ ты дбаеш? Народу даўно няма. Ёсьць п’яныя трактарысты, якія скруцяць цябе, плюнуць у твар і здадуць лукашыстам... Твае сяброўкі хоць штосьці ды паймелі, а што займеў ты? Кучу хваробаў? Сапсутыя нэрвы? Ну што ты маўчыш?“

Маўчу, бо ня ведаю — што сказаць у сваё апраўданьне.
У прадоньні маёй расейскай душы часьцяком варочаліся падступныя думкі і сьпела пераканаьне, што беларушчына — гэта бясконцая дарога да небасхілу, да таго месца, дзе зьліваюцца ў адно чорная зямля рэальнага і нябесны блакіт прыдуманага сьвету. Да небасхілу нельга дапяць, аднак, угледзеўшы, колькі замардаваных беларусаў ляжыць на ўзьмежку той дарогі, і пабачыўшы, ува што ператвораны рэальны сьвет, я кожнага разу ўглядаюся ў небасхіл, і маю другую, пакрыўджаную беларускую душу, поўніць нязгода.
„Гэта ў цябе ад дзеда. Той таксама не любіў камуністаў“, — паведаміла мне родная цётка, калі я ўпершыню загаварыў зь ёю па-беларуску і падзяліўся — а гэта было ўлетку 1971 году — сваімі жыцьцёвымі плянамі. Цётка Вольга жыла ў Піцеры, лічыла сябе пушкіністкай, а таму ўспрыняла мае пошукі Радзімы як небясьпечную дурноту, выказаўшы меркаваньне, што мяне зьбілі з тропу жыды альбо палякі.
Адсутнасьць гістарычнай памяці — адметная рыса нашага грамадзтва. Тая ж вайна ды пакуты бацькоў мала цікавілі маё пакаленьне. Я ў маладосьці наагул не любіў слухаць аповедаў пра мінуўшчыну і з усяго сказанага маці запомніў толькі, што „немец доўга стаяў пад Віцебскам“ і што па вайне таўклі на мязгу ды елі бярозавую кару. І толькі захапіўшыся беларушчынай, стаў цікавіцца сваімі продкамі і тым, чым займаліся мае крэўныя за далёкім часам.
Продкі мае па матчынай лініі паходзілі з Гарадоцкага павету, жылі ў мястэчку Бычыха і займаліся ганчарствам. Прадзед, нібыта, трымаў цэлую сябрыну і вазіў прадаваць глякі, збаны ды макітры ў сталіцу імпэрыі. Ганчарныя кругі шпарка круціліся, справе, здавалася, ня будзе зводу, але напярэдадні японскай вайны прадзед захварэў на сухоты — гэта была прафэсійная хвароба ганчароў, — сябрына пазбылася спраўнага кіраўніка і неўзабаве разьбеглася. Прадзеду пасьля таго давялося заняцца земляробствам: ён набыў кавалак зямлі ў вёсцы Шакурова, паставіў крытую гонтай хату-пяцісьценку, у якой і зьявілася на сьвет мая маці.

...Тым летам, калі пачалася калектывізацыя, у Шакурове, як і ў іншых беларускіх вёсках, гарлалі пеўні, рыкалі дагледжаныя каровы, вяскоўцы касілі на загуменьні канюшыну.

Падчас калектывізацыі палова шакуроўцаў паехала ў Сібір, на раку Зею, а другую палову камуноіды аблупілі да жывога і сагналі ў калгасы.
„Гаспадарка ў нас была ладная, аднак парабкаў ня бралі, таму і ўратаваліся“, — паведаміла падчас задушэўнай размовы цётка Вольга, і калі я, малады і гарачы, запытаўся, чаму ж не было супраціву, чаму мужыкі ня ўкінулі якога басяка ў студню, цётка адно толькі ўздыхнула, і на твары ейным адбілася ўсё тая ж пакутніцкая ўсьмешка.
Якраз тады мяне ўпершыню наведала думка аб калектыўным мазахізьме беларусаў. Калі ж крыху пазьней я прачытаў творы нашых пісьменьнікаў, у якіх з хваравітай асалодаю апісваліся пасьляваенная нястача і пакутніцкі лёс вясковых бабуль, дык канчаткова пераканаўся ў мазахісцкім пачатку беларускай душы.
„Божухна... Як жа мы, Віця, страшна жылі... Колькі мы з тваёй мамай зьведалі пакутаў... Бацька наш, твой дзед, памёр ад тыфусу, хату немцы спалілі. Прыехалі ўзімку, акурат перад Новым годам, сагналі бабы ды дзеці ў кучу, і шуганулі агню пад стрэхі. А ўсё праз партызан...“
Я слухаў цётку, ноздры мае кранаў пах зьляжалага сьнегу, уваччу мітусіліся вахлачыя постаці партызанаў, з ласкі якіх немцы спалілі матчыну хату, а разам зь ёю і палову краіны, і, за прыкладам У.І.Леніна, думаў пра Беларусь і пра свой народ. Пра народ, які стагодзьдзямі гібеў, патанаў у п’янстве, у брудзе, у вялікай і дробнай хлусьні; голасна пяяў хваласьпевы розным хамулам і выблядкам, што сядзелі на ягоным карку; калі надта прыпякала, стагнаў, расьціраў па твары крывавыя смаркачы і ані разу не падняўся грамадой на абарону сваёй годнасьці, не засьведчыў свайго памкненьня да людзкага жыцьця.

Кажуць, што немаўляты ў першыя дні па нараджэньні бачаць сьвет дагары нагамі. Відаць, такім, дарэшты перакуленым, і ўбачыў я свой Полацак з вокнаў тамтэйшай Краснай больніцы. Надарылася гэта ў верасьні 1953-га.
Пабачыць сьвет у падобным ракурсе было ня толькі цікава, але й павучальна. Немаўля яшчэ не ўсьведамляла сябе жывой істотай, а ўжо мусіла зразумець: у гэтай краіне ўсё дагары

нагамі. І сапраўды, калі ў іншых краінах на гары, пры ўладзе, былі самыя разумныя, сумленныя і адукаваныя, дык у Краіне Саветаў да таго часу ўсё разумнае, сумленнае і адукаванае ляжала ў магіле, а наверсе завіхалася ўсё тупое, подлае і неадукаванае. Дарэчы сказаць, акурат у верасьні 53-га ўсе гэтыя хрушчовы, молатавы ды іншыя сталінскія кілеры ладзілі свой пленум і дзялілі ўладу.

Нарадзіцца ў Полацку, можна сказаць, на цьвінтары Сьвятой Сафіі, пабачыць з акна радзільні перакуленую апсыду старажытнага храму і ня стаць, кажучы словамі пісьменьніка Л.Прокшы, бебурнацам, я проста ня мог. Энэргетыка сьвятога места працяла маю недалужную істоту, у мазгох індукаваліся токі і, паблукаўшы па зьвілінах, заклалі ў іх жыцьцёвую праграму: аднаўленьне Вялікай Крывіі. Спробы рэалізацыі такой праграмы былі небясьпечныя для здароўя, а між тым у справе гадаваньня здаровага цела ўзьніклі складанасьці: у маці пасьля галадоўлі не было свайго малака, і давялося смактаць разбаўленае казінае малако. Я яго якраз і смактаў праз соску, калі мяне вынесьлі з радзільні; шафёр нанятай таксоўкі прывітаў нас кваклівым сыгналам, і я заенчыў з такім імпэтам, што ўстрывожыў навакольных варон ды галак.

Полацак, дзе мне лёсіла нарадзіцца, — места пракаветнае, але, разам з тым, глухое і правінцыйнае. Тут нарадзілася шмат славутасьцяў, і ўсе яны, увабраўшыся ў сілу, зьяжджалі — ці то ў Палестыну (Эўфрасіньня), ці то ў Вечны Горад (Параскева), ці то ў Прагу (Францішак), ці то ў Масковію (Сымон). Традыцыя такая захавалася, і ўсе мае сябры цягам апошняга дзесяцігодзьдзя падаліся ў шырокі сьвет. Уладзімер, Лявон ды Навум зьехалі ў Менск, Сяржук — у Прагу, Якуб — у Фіншчыну. Полацкае нацыянальнае котлішча расьцярусілася па сьвеце, і вецер часу — надта пераменлівы на нашых шыротах — раскідаў за адным махам і саламяны будан, які мы сьпехам зьляпілі і неразважліва назвалі Беларускім домам.

Мне і самому даводзілася шмат разоў зьяжджаць з родных мясьцінаў. Ну а першым разам я паехаў „у віры на юры“ ў матчыных абдоймах, надзейна спавіты дзьвюма пуховымі хусткамі. Вайсковую частку перакідвалі ў Ідрыцу (былая Вялікалуцкая вобласьць, на паўночнай мяжы Вялікай Крывіі), і афіцэрскія сем'і мусілі ехаць у таварным вагоне разам зь фікусамі, патэфонамі, камодамі, катамі (іх пры пярэбарах

запіхвалі ў мяхі) ды іншым хломаздам. Мазгі тады яшчэ ня мелі блёку памяці, і ўсё ж у іх адбілася туманная рака і размытая белая пляма на далягляцзе. Я часьцяком бачыў іх у сьне, доўга ня мог даўмецца, адкуль яны ўсплываюць, і толькі нядаўна — гадоў, можа, пяць таму — выйшаў, блукаючы па Задзьвіньні, на дзьвінскі бераг і ўгледзеў тое, што сотні разоў бачыў у сьне: туманную раку і размыты, крануты лёгкай ружавізною, відарыс Сафійскага сабору.

У Ідрыцы мы пражылі каля двух гадоў — блёк памяці ўжо працаваў, і мне яскрава запомнілася, ізноў-такі, тамтэйшая рака. Дакладней, не сама рака, а вышка, зь якой жаўнеры сігалі ў ваду. Мы з маці гадзінамі сядзелі на беразе, і я пішчэў ад захапленьня, калі чарговы жаўнер, узьбіўшыся на вышку, выстаўляў наперад рукі і з галавакружнай — так мне тады здавалася — вышыні ляцеў у ваду. Ну і, вядома, у гарэзнай галаве высьпеў амбіцыйны плян: залезьці на скочню і таксама, на загад даўгалыгага старшыны, даць нырца наперад галавою. І вось аднойчы я высьлізнуў з двара, пабег да ракі і — для пачатку — бухнуўся ў ваду з драўляных масткоў. На шчасьце, поруч пралі бялізну афіцэрскія жанкі. Яны й выцягнулі мяне, ужо непрытомнага, на бераг. А яшчэ за пару хвілінаў, пачуўшы жаночы лямант, да ракі прыбегла зьбялелая маці. З таго часу я стаў пабойвацца вялікай вады і назаўсёды пазбыўся амбіцыяў. Узімку 1956 году, напярэдадні „гістарычнага“ XX зьезду КПСС, вайсковай частцы ізноў давялося мяняць месца дысьлякацыі, і сям’я наша апынулася ў Люцыне (па-латыску — Лудзе). Тут таксама было мора вады: два вялізныя возеры, рака, якая іх лучыла і на якой стаяла невялічкая, пабудаваная за часамі Ульманіса, гідраэлектроўня. На электроўні дзень да ночы шумела вада, і шум гэты не даваў спакою маёй маці. Яна нават упрошвала бацьку пераехаць на новую кватэру — хай горшую, але далей ад ракі, а, калі ўладкавалася на працу, знайшла мне няньку — сямідзесяцігадовую немку Зэльму Адольфаўну. Зэльма Адольфаўна была адметнай асобай. У маладосьці скончыла Інстытут шляхетных дзяўчатаў, ведала некалькі моваў, бачыла імпэратара Мікалая II і нават размаўляла зь ім. Яна называла яго „самым прыстойным чалавекам у Расеі“ і — пра гэта я даведаўся з пазьнейшых матчыных аповедаў — ненавідзела камуністаў. Падставы для нянавісьці былі важкія:

муж гадаванкі Смольнага інстытуту да вайны працаваў у Латыскім банку, меў два дамы ў цэнтры Рыгі, і калі ў 1940 годзе Прыбалтыку апанавала Чырвоная Армія (па-казахску Кзыл-Арда), вывезьлі яго ў сібірскую невараць.
Няньцы, паўтаруся, было семдзесят гадоў, але яна прыгожа апраналася (перашывала старыя строі), фарбавала вусны, купляла на апошнія капейкі букеты канвалій і фіялак, цярпець не магла слова „баба“ і прымушала мяне, а таксама навакольную дзятву называць яе поўным імем. Прамовіць у чатыры гады такое імя было цяжка, таму я яго дарэшты сымпліфікаваў, называючы няньку Зэльмадофанай.
Марознымі ранкамі мы зь нянькай блукалі па месьце і абавязкова заходзілі на старыя могілкі. Прымружыўшыся і паправіўшы капялюшык, Зэльмадофана кожны раз перачытвала эпітафіі на магілах остзэйцаў — кзыл-арда яшчэ не пасьпела іх зьнішчыць — і цяжка ўздыхала. Гэтыя ўздыхі я добра запомніў. А яшчэ запомніў, як мы, заружавелыя ад марозу, ішлі зь нянькаю па вуліцы, і Зэльмадофана ў адказ на пытаньні стрэчных: ці гэта ваш ўнук? — задаволена ківала галавой.
І вось мінула зіма, потым вясна, і мая *magistria*, атрымаўшы дазвол уладаў, зьехала ў Капэнгаген, да сваёй роднай сястры. Перад ад'ездам упрошвала бацьку адпусьціць мяне з маці ў Данію: „Мы там уладкуемся, а потым, Леанідзе Васілевічу, і вы пад'едзеце...“ Няньчына сястра мела ў Капэнгагене мылаварню — вось Зэльмадофана і надумала вывезьці „ўнучка“ на Захад ды зрабіць „каралём мыльных бурбалак“ (балазе, нашчадкаў у сясьцёр не засталося — усіх пазабівала ў вайну). Прапановы такія тхнулі здрадаю Савецкай Радзіме, таму ў бацькі падымалася фуражка на галаве і зь лёгкім поканьнем адклейваліся пагоны. Потым, ужо з Капэнгагену, нянька даслала пасылку, потым пару лістоў, але адказу не дачакала: сям'і савецкага афіцэра ліставацца з уладальнікамі капэнгагенскіх мылаварняў аніяк не выпадала.
Шмат што забылася ў жыцьці, згінула ў мроіве часу, а сівагаловая немка ў чорным капелюшы і да сёньня зьяўляецца мне ў снох. Дый дзіва што: дзіцячыя ўражаньні — самыя трывалыя. Яны, выбачайце за труізм, фармуюць характар. І я дзякую выхаванцы Смольнага інстытуту за тое, што з маладых гадоў узьненавідзеў хамаў і камуністаў.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (15) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **01-05-2001**
[image]

Карл Шлёгель

Кіёск Эўразія, альбо Бэрлін як пэрспэктыва і цэнтар

КАРЛ ШЛЁГЕЛЬ прафэсар катэдры гісторыі Ўсходняй Эўропы ўнівэрсытэту Франкфурту-на-Одэры (*Die Europa-Universität Viadrina Frankfurt [Oder]*). У апошнія гады выйшлі яго кнігі — *„Chronik russischen Lebens in Deutschland 1918—1941“*, *„Go East oder Die zweite Entdeckung des Ostens“*, *„Moskau lesen. Die Stadt als Buch“*. Сёлета

Папярэднія заўвагі

Карла Шэфлера не пераўзысьці. У сваёй кнізе „Бэрлін. Лёс аднаго гораду“ ён сказаў усё, што можна было б сказаць пра Бэрлін. „Бэрлін — каляніяльны горад“. Бэрлін — сталіца Ўсходняе Палабіі. Бэрлін выкляты на тое, каб „увесь час паўставаць і ніколі ня быць“. Нам, народжаным пазьней, да гэтага няма чаго дадаць. З кнігай Шэфлера пра геній Бэрліна — гэтак, як і з усёй астатняй клясыкай. Колькі б мы ні альыхоўзілі рознымі шляхамі ад цэнтральнай вуліцы, сноўдаючы па завугольлях, аднойчы нават самыя ўтомныя пошукі набось іншага ды новага выводзяць зноў да цэнтральнае вуліцы. Усе кнігі пра Амэрыку раней ці пазьней вяртаюцца да Алексіса дэ Таквіля зь ягонай „*De la Démocratie en Amérique*“. Усе хоць у нейкай ступені праніклівыя ды глыбокія назіраньні Расіі.

ўрэшце ўзыходзяць да занатаванага маркізам Асцольфам-Кюстынам ужо ў „*La Russie en 1839*“. У гэтых кнігах стылістычны геній судакранаецца з геніем *loci*. Гаворка тут ідзе не пра нешта меншае ці большае, лепшае ці горшае, а пра поўную адпаведнасьць або промах. Фармулёўка ня ёрдаць, як дыямэнт. Яна ператрывае ўсе гістарычныя зломы і катастрофы. Яна мае ў сабе штосьці непазьбежнае, амаль тэлеалагічнае. Яе можна распазнаць па гэтым „быў, ёсьць, буду“. Тэму сьвежы сказ, які можна было напісаць пасьля падзеньня Бэрлінскага муру, — гэта змрочна-грандыёзны заключны сказ з кнігі Карла Шэфлера 1910 году.

Кіёск „Эўразія“

На пляцы перад вакзалам Бэрлін-Ліхтэнбэрг доўга стаяў прывакзальны буфэт. У ім не было нічога асаблівага, апрача ад рукі зробленага надпісу: „Эўразія“. У любым іншым месцы ў горадзе й краіне шапік з такой назвай не прыцягнуў бы ўвагі і застаўся б проста экзотыкай. Мы б пацешыліся з прадпрымальнасьці віетнамца ці турка, які выкарыстаў свой шанец адразу па падзеньні мура. Можа, нават падзівіліся б ягонай адвазе — наважыцца адкрыць рэстаранчык у мясцовасьці, варожа настроенай да чужынцаў. Але тутака зьдзіўляе трапнасьць у выбары назвы. Бэрлін-Ліхтэнбэрг — гэта ўсход Бэрліна ў чыстым выглядзе і, пакуль транспартная сетка гораду яшчэ не трансфармавалася, — бэрлінская брама для чыгуначнага руху на ўсход. На Бэрлін-Ліхтэнбэрг прыбываюць цягнікі з Эўразіі: з Акмалы ў Казахстане ці з Навасібірску на Обі. „Азія пачынаецца на Сылескім вакзале“, — казалі перад другой сусьветнай вайной дыпляматы, якія адбывалі ў службовую выправу ў Маскву ці Варшаву. Да вайны ў Бэрліне можна было набыць квіток на рэйс Бэрлін-Токіо. Тут пачынаўся найкарацейшы і найхутчэйшы шлях на другі канец сьвету, а для шмат каго — і выратавальнае падарожжа ў эміграцыю. Уладальнік буфэту і прадавец дарожных тавараў нічога ня ведае пра стары транскантынэнтальны рэйс і ягоную гісторыю, але ён ведае імя гэтага месца, на якое забыліся іншыя. Некалькі месяцаў таму вакзал Ліхтэнбэрг пачалі перабудоўваць. Мадэрнізацыя нястрымана крочыць наперад. Кіёск „Эўразія“ зьнік.

Усходні вакзал — Заходні вакзал
Рамонтныя работы ідуць поўным ходам. Пасьля генэральнага рамонту вакзалаў Цоо, Фрыдрыхштрасэ, Александэрпляц і Сылескага вакзалу надышла чарга Ліхтэнбэргу. Усё будзе даведзена да ладу. Шаблённы бліск, вакзал як месца, пакліканае ствараць пазытыўныя ўражаньні. Новы час, новы дызайн, новы тэмп. Але на вакзале Бэрлін-Ліхтэнбэрг усё яшчэ пануе стары час. Ад Бэрліна-Цоо на захад адпраўляюцца хуткасныя цягнікі, што езьдзяць з хуткасьцю самалётаў, ад Ліхтэнбэргу на ўсход едуць цягнікі, якія цалкам належаць эпосе, калі не было яшчэ фірмовых *Intercity Express.*
На захадзе можна адразу перасесьці на Брусэль ды Парыж, на ўсходзе язда запавольваецца. На Цоо ў падарожнікаў мала багажу, быццам яны сабраліся на нядоўгую прагулянку; на Ўсходнім вакзале ў людзей заўсёды шмат клункаў, быццам яны вязуць з сабою ўвесь свой скарб. Там тэчкі, тут клункі, там дыпляматы, тут заплечнікі. На пэронах Бэрліна-Цоо наўрад ці нехта яшчэ паліць, над пэронамі Ліхтэнбэргу чуваць рэзкі пах папяросаў маркі „*Беломорканал*“. На захадзе робяць кароткія візыты і, напэўна, ужо ўвечары вяртаюцца з канфэрэнцыі.
З Бэрліна-Цоо ўвесь Захад нагадвае рэгіянальную транспартную сыстэму, ад Ліхтэнбэргу не відно ні канца, ні краю. Людзі, якія пачынаюць падарожжа адсюль, носяць у дарозе не дарагія гарнітуры, а спартовыя касьцюмы. На захадзе цягнікі зіхацяць мэталам, на ўсходзе яны зялёныя, карычневыя, сінія, як і здаўна. Вагоны з Усходняй Эўропы нават носяць, паводле пункту прызначэньня, нацыянальныя колеры: чырвона-бела-сінія расейскія, блакітныя ці чырвона-белыя польскія, жоўта-зялёныя летувіскія, жоўта-блакітныя ўкраінскія. Цягнікі, што йдуць на захад, падобныя да ракеты, на Ўсходзе гэта ўсё яшчэ рыдваны жалезнага веку. Гэтыя зьнікаюць, здаецца, у самы момант адпраўленьня, нібы самалёты, тыя выразна падпарадкоўваюцца закону прыцягненьня й ня могуць скрануцца зь месца. Бэрлін-Цоо і Бэрлін-Ліхтэнбэрг — гэта яшчэ й дзьве розныя эпохі, розныя часавыя вымярэньні.

Расклад руху, зьмены ў раскладзе
Бэрлін стаіць там, дзе шляхі зносінаў сыходзяцца ці бяруць

свой пачатак. Расклады руху, у якіх гэта зафіксавана, — дакументы гістарычнага значэньня. Яны — нібы кардыяграмы, дакладныя хронікі ператварэньняў, выражаных у паскарэньні ці запаволеньні. Кожная зьмена ў раскладзе дазваляе прасачыць, ці адлегласьці скараціліся, ці павялічыліся дыстанцыі паміж суседнімі гарадамі. За 10 гадоў зьмянілася амаль усё. Бэрлін ізноў улучаны ў сетку эўрапейскіх гарадоў. Гэта ўжо больш не канцавая станцыя, а зноў пункт перасадкі. Бэрлінскія вакзалы робяць горад транзытнай станцыяй ува ўсіх кірунках. У адпаведнасьці з гэтым, здаецца, ён і знайшоў свой архітэктурны вобраз у палацы са шкла, які паўстане там, дзе яшчэ сёньня ля вакзалу Лертэр зеўрае катлаван. Трэба толькі ўліцца ў рух, каб пабачыць, што будзе далей. Ніхто не будуе хуткасных чыгуначных магістраляў, якія нікуды не вядуць, і ніхто не будуе трасаў, якія йдуць у нікуды. Што да бэрлінскага транспартнага вузла — ён зноў працуе як вялікая цэнтрыфуга, што разьмяркоўвае рухі: у Скандынавію, Прыбалтыку, Паўднёвую Эўропу, на Атлянтыку. Кожная зьмена ў раскладзе сьведчыць, што надарваная недзе сетка зьвязваецца нанова. Дзякуючы новым трасам Бэрлін уварваўся ў зону высокіх хуткасьцяў Захаду, але адначасова захоўвае сувязь з зонай запаволенасьці на Ўсходзе. Таму гэта пераважна спальныя вагоны, таму месцы трэба загадзя рэзэрваваць. У Бэрліне Сярэдняя Эўропа, не зважаючы на вялікія адлегласьці, кантактуе з Эўразіяй. Сьвет не паддаецца падліку, бо ў праспэкце значыцца: „Інфармацыя пра цану адсутнічае“. Цягнік Бэрлін — Саратаў едзе з суботы да панядзелка, рух працягваецца 49 гадзін 37 хвілін. Цягнік Бэрлін — Растоў адыходзіць а 15.09 у суботу ды прыбывае за 58 гадзін 19 хвілін у Растоў на Цэнтральны вакзал. Ён мінае тры мяжы: у Франкфурце-на-Одэры, Берасьці ды Асінаўцы. Цягнік Бэрлін — Навасібірск ідзе з 15.09 у суботу і да 2.37 у чацьвер, у дарозе ён 107 гадзін і 28 хвілін. У прычапным вагоне можна даехаць да Акмалы (за савецкім часам Цэлінаграду), куды прыбудзеш за 102 гадзіны 51 хвіліну — падарожжа праз Волгу, уздоўж паўночнага берагу Касьпійскага мора і аж да казахскага стэпу. Утомным падаецца і рэйс Бэрлін-Львоў, што цягнецца з 21.42 суботы да 5.23 панядзелка, гэта значыць 31 гадзіну 41 хвіліну: едзе цягнік ня простым шляхам праз Кракаў, а перасякае польска-ўкраінскую мяжу нашмат далей на ўсход пад

Ягодзінам і потым зноў едзе на захад. Ёсьць у праграме й цягнікі-мары: у Сымфэропаль у Крыме. Гэты цягнік адыходзіць у сераду а 21.42 і прыбывае ў Сымфэропаль у суботу а 6.29, падарожжа трывае акурат 56 гадзін 47 хвілін. Альбо цягнік Бэрлін-Адэса: адыходзіць у панядзелак а 21.42 і прыбывае ў сераду а 13.48, праехаўшы агульным лікам 40 гадзін 6 хвілін. Але ня трэба забывацца і пра старыя наежджаныя рэйсы: у Маскву, куды цягнік ад'яжджае а 23.39, ці начны цягнік у Гданьск з прычапным вагонам да Калінінграду.
Шчыльнасьць гэтай сеткі — наступства эпохі, калі Ўсходні Бэрлін быў заходнім фарпостам сацыялізму. Тады вайскоўцы езьдзілі ў цягніку Вюнсдорф-Масква, тады былі праводзіны на пэроне з вайсковымі аркестрамі ды абслугоўваньне „люкс" для раздураных афіцэрскіх жонак. Такая спадчына захавалася і на лётнішчах: Бэрлін да гэтага часу ня мае простага рэйсу да Нью-Ёрку, але затое мае — у Пхеньян, Халеб і Альжыр, Кішынёў і Дамаск, Гавану, Менск, Астраву, Палангу, Сафію, Вільню, Кошыцы і Бургас. На караблі за 2 дні дабярэшся да Шчэціна.

Чаўнаковыя рэйсы, прыезды і ад'езды
Хто езьдзіць эўрапейскімі маршрутамі? Ніводзін разумны чалавек імі ня езьдзіць. Час стаўся найдаражэйшым таварам. Разумныя людзі ня маюць калі імі езьдзіць. Сёньня чыгунка стала рыдваном тых, у каго ёсьць час, хто выпаў з часу, для каго час нічога ня значыць. Старыя, пэнсіянэры, дашкаляты, беспрацоўныя. Знаходзяцца і асобныя вар'яты, якія выкарыстоўваюць такія паездкі для этнаграфічных назіраньняў і дасьледаваньняў. Езьдзіць толькі той, хто можа дазволіць сабе раскошу губляць час, ці той, хто выпаў з часу. Пераважна гэта расейскія немцы, эмігранты-жыды, якія спыніліся на шляху ў сваю гістарычную радзіму, студэнты, у якіх мала грошай, людзі з авіяфобіяй. Для многіх цягнік — гэта ідэальны сродак паступовай акліматызацыі. Па расейскіх немцах бачна, якое шчасьце для іх ізноў апынуцца на сваёй гістарычнай радзіме, пагаварыць, нарэшце, ізноў на мове, якую яны ведаюць лепш за мову сваіх „прашчураў", выйсьці на пэрон, каб адчуць пад нагамі расейскую зямлю. Два дні ў цягніку Бэрлін-Саратаў — гэта вялікі і гаючы курс лячэньня ад краіны, у якой яны апынуліся яшчэ дзецьмі, у сапраўднасьці так і ня стаўшы яе

паўнапраўнымі грамадзянамі. Гэта яднае расейскіх немцаў і жыдоў, якія ў астатнім маюць мала супольнага: першыя прыехалі пераважна з калгасаў і сельскай мясцовасьці, другія ж былі насельнікамі гарадоў. Ля цягнікоў на Саратаў ды Адэсу назіраецца дзівоснае ўзрушэньне. Да цягніка падыходзяць вялікія сем'і, зь якімі разьвітваецца ўвесь клан — далучаючы да найлепшых пажаданьняў горы правіянту. Людзі, якія бяруць з сабой вазоны, едуць не ў чужыну, а дадому. Людзі, якія вязуць з сабой у кошыках сабак і катоў, едуць не ў чужую краіну. Людзі едуць дадому: зірнуць, ці ўрадзіла бульба, ці робіць яшчэ старая лядоўня. Пэрсанал *Intercity-Night*, які стаіць на пэроне насупраць, зьдзіўлена й зачаравана пазірае на стракатую публіку ля кіеўскага цягніка. Нічога экзатычнага тут няма, чаўнаковыя рэйсы паміж Бэрлінам і Адэсай, Бэрлінам і Саратавам сталіся руцінай. Тутэйшая публіка моцна адрозьніваецца ад пасажыраў, што сядаюць на *Intercity Varsovia* і мэтаскіравана падаюцца ў вагон-рэстаран, каб правесьці рабочыя перамовы. Яна не падобная да тых работнікаў, якія ўвечары ў пятніцу едуць дадому ў Познань ці ў Сылезію ў перапоўненым вагоне, а ў нядзелю ўвечары вяртаюцца назад — на будоўлі ў Бэрліне. Кожны кірунак мае свой рытм. *Polonia Germanica*, якая на пачатку вакацыяў развозіць дзеці да бабуляў у вёскі Цэнтральнай Польшчы, рухаецца інакш, чым тыя мужчыны і жанчыны, што прыяжджаюць на аўтобусе з Рыгі ці Коўны на станцыю „Функтурм" і без чыіх працоўных рук Бэрлін бы ўжо даўно загінуў.

Спалучаныя сасуды, аўтарынак у Марыямпалі

Марыямпаль знаходзіцца на мяжы Летувы з Калінінградзкай вобласьцю, г.зн. былой поўначчу Ўсходняй Прусіі. Гэта адзін з найбуйнейшых аўтарынкаў на ўсёй Балтыцы. Пакупнікі прыяжджаюць з глыбіні Расеі. Летувісы, якім ня трэба візы для ўезду ў краіны шэнгенскай зоны, пакрываюць практычна ўвесь расейскі рынак ужываных аўтамабіляў. Сярод летувіскіх лясоў і палёў аўтарынкі цягнуцца адзін за адным. 20% нацыянальнага даходу фармуецца за іх кошт. Цэлыя калектывы зачыненых фабрык сталі перагоншчыкамі аўтамабіляў. Летува зрабілася ідэальным калектыўным дастаўнікам патрыманых аўтамабіляў для паўночна-ўсходняй Эўропы. Па бэрлінскай акружной

несупынным патокам ідуць аўтаканвоі зь летувіскімі і чырвонымі транзытнымі нумарамі. Мясцовасьці накшталт Марыямпалю зьвязаныя з Бэрлінам тысячамі нітак.
У Марыямпалі ведаюць кожную запраўку на бэрлінскай акружной, усе пляцоўкі для адпачынку, усе месцы, якіх лепей пазьбягаць. Калі нешта не ў парадку ў Бэрліне, непарадак і ў Марыямпалі. Калі нешта не ў парадку ў Расеі, гэта адразу заўважаюць работнікі на запраўках і гандляры ўжыванымі машынамі ў Бэрліне і Брандэнбургу. І гэта не перабольшаньне. У сапраўднасьці ўтварыўся калідор з усім тым, што гэтаму спадарожнічае: вартаванымі стаянкамі, станцыямі тэхнічнага абслугоўваньня, з сыстэмамі раньняга апавяшчэньня і інфармацыі, прадажнымі жанчынамі, грашыма за праезд і рэкетам. Бэрлін — прамежкавы пункт на трасе Рурская вобласьць — Марыямпаль.

Бэрлінская акружная, караван-сарай
Інтэнсіўны рух на бэрлінскай акружной на момант сьцішваецца на мяжы, якая праходзіць недалёка ад Бэрліна — па Одры, паміж Франкфуртам і Сьвецкам. Больш за паўмільёна дальнабойшчыкаў штогод перасякае тут мяжу. Гэта спараджае горад-уяву, што ўтвараецца нанава дзень пры дні і дзень пры дні зьнікае зноў. Ля Франкфурцкай брамы ўсходне-заходні караван робіць прыпынак. „*Truck stop*“ — усяго толькі сучасная назва для старажытнай установы — караван-сараю. Яго ўласная сыстэма знакаў і сымбаляў паказвае, хто адкуль прыехаў і куды едзе. Летувісы, эстонцы, латышы, украінцы, расейцы, узбэкі маюць свае ўласныя аўтамабільныя нумары. Да ўжо вядомых элемэнтаў эўрапейскай транспартнай сыстэмы, як „*Danzas*“, „*Globetrotter*“, „*Hungarocamion*“, „*Совтрансавто*“ далучыліся новыя назвы: „*Трансбалт*“, „*Руссофрахт*“, „*Каматранссервис*“. Напісаныя вялікімі літарамі на брызэнце маршруты аднаўляюць старыя сувязі, напрыклад: Рым—Санкт-Пецярбург. На гэтым панылым лапіку асфальту пасярод брандэнбурскіх палёў сустракаецца Эўропа ўва ўсёй сваёй працягласьці: ад Клайпеды да Бургасу, ад Берасьця да Брысталю, ад Рыгі да Бухарэсту, ад Самары на Волзе да Барсэлёны, ад Любліна да Штутгарту, ад Пецярбургу да Ратэрдаму, ад Навасібірску да Дортмунду. Гаворка тут ідзе не пра буйныя эўрапейскія праекты, а пра спажывецкія тавары —

туліпаны з Галяндыі, ёгурт з Францыі, сталь з Дортмунду ці офісную мэблю зь Вілінгену. Але часта ў гэтым больш здаровага сэнсу, чымся ў дэкляpацыях пра адзіную Эўропу. Дальнабойшчыкі ведаюць новую Эўропу і тыя дарогі, што вядуць да яе. Яны не завастраюць увагі на тым, што шмат дзе бывалі, бо пераход мяжы — іх штодзённы хлеб. Яны вымяраюць прагрэс паскарэньнем перасячэньня межаў. Яны — прагматыкі пераўтварэньняў, ад нарошчваньня якіх залежаць прафэсія й заробак. Яны — кантрабандысты дзелавітасьці, іх кантрабанда — экспарт нармальнасьці. Яны — авантурысты пэрыяду пераўтварэньняў. Яны мала гавораць пра Эўропу, але ўсё больш — пра паскарэньне руху, бо адно гэта зробіць Эўропу магчымай. Эўропа для іх — не прафэсія, гэта іх работа.

Euro-City, Central Europe

Што дзьве гадзіны ад Бэрліна-Цоо ад'яжджае цягнік на Шчэцін. Калі выехаць а 4.39, у Шчэціне будзеш а 6.55. Пяць гадзін усё яшчэ трэба, каб цягніком *Euro-City* даехаць да Прагі, шэсьць — да Варшавы ці Ўроцлава, дзесяць — да Вены ці Будапэшту. *Euro-City* курсуе цяпер на прасторы, што некалі называлася Сярэдняй Эўропай. Але Сярэдняя Эўропа зьнікае і праяўляецца пад новым, сучасным назовам. Што некалі называлася Сярэдняй Эўропай, сёньня завецца *Central Europe*. Цэнтральная і Ўсходняя Эўропа гаворыць сёньня па-ангельску з амэрыканскім акцэнтам. Зусім як Заходняя Эўропа, яна круціцца вакол Нью-Ёрку ды Галівуду. Яна далучылася да сусьвету, напоўненага фірмавымі знакамі трансатлянтычнае культуры — *New York Times Review of Books, CocaCola, Fast Food, Credit Card* — і паўсюднай новай *lingua franca*. *Central Europe* — гэта *Down Town* у Варшаве, які відаць здалёк з усіх бакоў ува ўсёй яго стромкасьці і зьзяньні; *Central Europe* — гэта *Prague Post*, месца правядзеньня міжнароднымі фондамі сваіх канфэрэнцыяў, ператварэньне *Café Slavia* ў месца сустрэчы *Highschool-kids*, курсы біржавых маклераў ды канструкцыі Фрэнка Джэры ў Празе. *Central Europe* імкнецца ў Эўрапейскі Зьвяз і ня хоча больш нічога ведаць пра Сярэднюю Эўропу. Яна, як і ўвесь сьвет, карыстаецца мабільнымі тэлефонамі, электроннай поштай і Інтэрнэтам, дарма што шмат дзе на комінах закінутых броваряў сядзяць буслы, а па вёсках бегаюць гусі. Сярэдняя

Эўропа ня хоча здавальняцца сваімі мітамі і шармам сваіх абшарпаных фасадаў. Яна называе сябе *Central Europe*, бо прагне быць сучаснай і ня хоча прапусьціць такой магчымасьці. Некалі пасьля яна зноў зацікавіцца тым, што было дагэтуль: Музілем, Юліюсам Майнлем, Кафкам, „*Berliner Tageblatt*“, Карлсбадам, Тэрэзыенштадтам, Мітропай.

Мітропа

Мітропа ўсё яшчэ існуе. „*Mitteleuropäische Schlafwagen- und Speisewagen AG*“, „Акцыянэрнае таварыства “Сярэднеэўрапейскія спальныя вагоны і вагоны-рэстараны”“, заснаванае нямецкай, вугорскай ды аўстрыйскай дзяржаўнымі чыгункамі ў 1917 годзе, годзе расейскай рэвалюцыі і ўступленьня Амэрыкі ў сусьветную вайну, ператрывала пасьляваенны час у ГДР. Мы дакладна памятаем надпіс на вагонах-рэстаранах і на посудзе цягнікоў, якія курсавалі паміж ГДР і ФРГ. Верагодна, наступнае пакаленьне будзе ведаць пра „Мітропу“ гэтулькі ж мала, колькі і пра Сярэднюю Эўропу. Старая Сярэдняя Эўропа стаецца гісторыяй: тэрыторыяй пакутаў і войнаў. Забыцьцё мінуўшчыны. Тое, чым і дзе жылі ранейшыя пакаленьні, будзе справай гістарычных кніг, літаратурнай эрудыцыі і выключна індывідуальнага інтарэсу. Мінуўшчына ўсё больш заганяецца ў музэй. Больш ужо няма нямецкае Сярэдняе Эўропы, засталіся толькі альбомы з карцінкамі пра яе. Больш няма жыдоўскае Сярэдняе Эўропы, засталіся адно стылізацыі пад яе ў старым жыдоўскім кварталe Казімежу. Сярэдняя Эўропа стаецца невычэрпнай крыніцай для дасьледнікаў, сцэнарыстаў, дакумэнталістаў, сьледапытаў, стваральнікаў мыльных опэраў — калі ўвогуле стаецца. Калі пачалося яе трыбушэньне і ператварэньне ў кіч, мінуўшчына сапраўды сталася гісторыяй. Значыць, мінуўшчыну трэба засвойваць нанава, зь пільным вокам і вострым розумам.

КаДэВэ

Магчыма, КаДэВэ — найлепшае, што можа прапанаваць Бэрлін. Універмаг, у якім ёсьць усё, дзе пэрсанал ветлы і ўважлівы, як нідзе больш. У кожным разе, слава КаДэВэ разышлася па ўсім кантынэнце аж да Эўразіі. Гэта літаратурны топас, што ўвайшоў у расейскую савецкую літаратуру разам з Маякоўскім.

Але і „новыя расейцы“, якія нічога ня ведаюць пра Маякоўскага, ходзяць у КаДэВэ. У першай палове дня яны складаюць там асноўны кантынгент пакупнікоў, бо бэрлінская публіка ашчаднейшая. Асабліва напярэдадні Калядаў. У гэтую пару ўсе білеты на самалёты ў Маскву і Санкт-Пецярбург выкупленыя. Горад, у цэнтры якога стаіць КаДэВэ, — само ўвасабленьне камфорту. Ён дае жывое сьведчаньне таго, як выглядае жыцьцё, калі ўсё функцыянуе спраўна. Для Ўсходняй Эўропы, дзе чэргі выстройваюцца амаль за кожным таварам і варожасьць прадаўца да пакупнікоў — нармальны стан рэчаў, КаДэВэ лічыцца неператўзыдзеным у пляне эфэктыўнасьці і камфорту. Мэтраполія, якая адначасова і курорт. Цывілізацыйная нармальнасьць не як утопія, а як рэальнасьць.

Экспрэс да расейскай мяжы,
Усходняя Палабія, нямецкі арыенталізм

Бэрліну не адмахнуцца ад Усходняе Палабіі. Ён — горад ува Ўсходняй Палабіі, якая раскінулася ад Эльбы аж да самай Балтыкі. Экспрэс „*Mare Balticum*“, што адыходзіць а 08.01, у 15.19 ужо ў Сопаце, а ўвечары ў Элку. Купіўшы білет на экспрэс, ты можаш бясплатна ўзяць з сабой ровар ці байдарку. З Бэрліну — адразу на азёры Мазуршчыны ці Ўсходняе Прусіі. Цягнік на Тчэў адыходзіць а 14.07, а прыбывае а 22.04. Да вайны, калі ўсходняя чыгунка працавала яшчэ спраўна, гэта, відавочна, адбывалася хутчэй. Тчэў — гэта былы Дэршаў зь легендарным мостам, шэдэўрам прускага мостабудаўнічага і інжынэрнага мастацтва. Трэба назваць і шмат якія іншыя месцы: старыя курорты сярод разложыстых гор у Татрах, што ў Багеміі. Бэрлін улучаны ў сетку аўтобусных маршрутаў, якія зьвязваюць горад са старымі курортамі на Балтыйскім моры: Цынгстам, Узэдомам, Альбэкам, Мендзыздруем, Сьвінаусьцем. Нават з Раўшэнам (Сьветлагорскам) і Кранцам (Зеленаградзкам) у Калінінградзкай вобласьці Расейскай Фэдэрацыі. Нам усё яшчэ вельмі няпроста гаварыць пра гэты блізкі Ўсход як пра Ўсход лепш нам зразумелы: Стамбул, Анкару, Анталію. Але калі мы ня хочам быць сьляпымі, мы немінуча павінны згадзіцца з тым, што існаваў і нямецкі ўсход. Усход, што знаходзіўся ня ў Індыі і не ля возера Чад, а ў Сярэдняй і Ўсходняй Эўропе. Гэта і стары тчэўскі мост, прускія замкі, Заля стагодзьдзя ўва Ўроцлаве. Гэты Ўсход складаецца з

вакзалаў, якія некалі былі сартавальнымі станцыямі нямецкага вэрмахту, зь месцаў, якія заселі ў нашай памяці дзякуючы масавым забойствам, учыненым зондэркамандамі, а таксама з затанулай Атлянтыды панскіх сядзібаў зь іхнымі фальваркамі і паркамі. Тое, што некалі было нямецкім усходам, вяртаецца, пазбаўленае рэваншызму і несупярэчнае духу часу — як *German Orientalism*.

Горад у горадзе

Недалёка ад самага цэнтру ля Потсдамскага пляцу вырастае Бэрлін, якога мы яшчэ ня ведаем. Некалі-такі нам давядзецца сутыкнуцца зь ім. Пакуль што толькі паветра страсае нетутэйшая гамонка — польская, расейская, латыская, а таксама нейкі афрыканскі дыялект. Ён выходзіць на яву ў разьдзеле абвестак у газэтах. Пункты яго дысьлякацыі лёгка выявіць, калі паблукаць па супэрмаркетах ці дзіцячых пляцоўках. Тое, што ён расьце, відаць па тым, што напярэдадні Калядаў раскупляюцца ўсе квіткі на самалёты з Масквы ды Санкт-Пецярбургу і павялічваецца колькасьць машынаў зь летувіскімі-латыскімі-эстонскімі нумарамі. Мы ведаем ужо даўно, што спасярод нашых сяброў наўрад ці знойдзецца той, хто яшчэ ні разу не наймаў за хатнюю работніцу полькі ці не выклікаў сантэхніка-паляка. У Доме расейскай культуры на Фрыдрыхштрасэ ўвесь час адбываюцца расейскія мерапрыемствы. У горадзе выходзяць два расейскія тыднёвікі, і толькі пытаньне часу, калі зьявіцца расейскі тэатар і кансэрваторыя. Жыдоўская грамада таксама выдае адзін з сваіх часопісаў па-расейску. Немагчыма не заўважыць гэткай колькасьці прыежджых з новага блізкага ўсходу, і ніхто ня ведае, хто зь іх прыехаў на пэўны час, а хто назаўсёды. Існуе лёгіка аселасьці. Турысты стаюцца рэгулярнымі наведнікамі, рэгулярныя наведнікі — сталымі жыхарамі, сталыя жыхары — нашымі суграмадзянамі. Новыя супольнасьці зараджаюцца ў целе даўнейшых. У ценю старога істэблішмэнту вырастае новы, адораны вострым інтэлектам, пра які звычайна гавораць, што ў яго яшчэ ўсё наперадзе.

Metropolitan Corridor

Усе ведаюць пра Бэрлінска-Варшаўскую нізіну, але мала хто

ведае пра *Metropolitan Corridor*, у якім таксама знаходзіцца Бэрлін. Калі глядзець звонку, ён ідзе з захаду на ўсход і расьцягваецца больш як на дзьве тысячы кілямэтраў. Ягоныя найважнейшыя станцыі — Бэрлін—Познань—Варшава—Берасьце—Менск—Смаленск—Масква. Існуе таксама нітка на поўнач, якая дакладна адпавядае старой імпэрскай трасе №1 з Аахену да Кёнігсбэргу/Калінінграду і далей на Мэмэль/Клайпеду, Рыгу, Талін, Санкт-Пецярбург. Яшчэ адна нітка ідзе на поўдзень — праз Уроцлаў у Верхнесылескі індустрыяльны раён, да Кракава, Львова, Браціславы, Вены. Гэта прастора ажыўленага руху, з коркамі ды транспартнымі вузламі. Гэта агромністая транзытная прастора з пунктамі ўзаемаперасячэньня і перасадачнымі станцыямі. Найлепш яе можна пазнаць, калі пералятаеш праз Усходнюю Эўропу ўночы: яна мігціць пасярод раўніны, якая ўся ахутана цемрай. Гарады, што знаходзяцца ў *Metropolitan Corridor*'ы, маюць больш супольнага адзін з адным, чымся з правінцыямі, якія іх атачаюць. Цывілізацыйная розьніца, якую адчуваеш, калі пакідаеш калідор, здаецца большай за адлегласьці паміж гарадамі. У калідоры пануе дзелавое ўзрушэньне. Падарожнічаюць навукоўцы, шукальнікі золата, прафэсіяналы ў турызьме, транспарце, энэргетыцы, сфэры абслугоўваньня, спэцыялісты ў санацыі, аквізытары сыравіны, авантурысты і місіянэры. У калідоры пануе час *CNN*. У Маскве ён той самы, як у Варшаве ці Бэрліне. Там цябе адшукаюць у любы час. Тут працуюць мабільныя тэлефоны, электронная пошта, факс. Калі хто пакідае калідор, выпадае з часу *CNN*. Вярнуцца назад будзе немагчыма, нават пры дапамозе звычайнай пошты, на якую больш нельга спадзявацца. Тут ужо няма аўтабанаў. Магчыма, тут яшчэ ёсьць прыгожыя лясы, але няма ўжо надзеі і пэрспэктыўнай працы.

У калідоры коціцца мірная армада фураў, а ў цемры, што пануе па-за калідорам, сьвеціць месяц. Выпадае раса. Зьбітыя з панталыку буслы вызіраюць на шум з сваіх гнёздаў на тэлефонных слупах. Бэнзазапраўкі ў *Metropolitan Corridor*'ы робяцца месцам сустрэчы вясковай моладзі з далёкім сьветам. За межамі калідору пануе нуда ды лютуе нянавісьць. Пры канцы XX стагодзьдзя нянавісьць правінцыі да гораду вяртаецца ўва ўсходнеэўрапейскую нізіну. Дзякуючы калідорам адбываецца аб'яднаньне цывілізаванай Эўропы, але на яе краёх

назапашваецца зайздрасьць і гнеў адсталых і запозьненых. Гэтая часавая несынхроннасьць нясе большую пагрозу, чымся „*Clash of Civilizations*“, пра які пісаў Сэмюэл Гантынгтан.

Шырокая і вузкая каляіна

Эўропа стала маладушная. Адзіныя, хто яшчэ ня выракся дэвізу „*Think big*“, — гэта вайскоўцы. Яны вядуць вайну ў Эўропе пасьля пяцідзесяцёх гадоў міру. Аб’яднаць вайсковыя адзінкі менш праблематычна, чым збудаваць свабодную асацыяцыю грамадзянскіх супольнасьцяў. Тым часам як цывільная Эўропа досыць бездапаможна й нерашуча гаворыць пра будучыню, да канца не давяраючы сабе, вайскоўцы сьвяткуюць датэрміновы прыём новых сяброў у NATO як крок у новае тысячагодзьдзе. Эўропа, на жаль, марнуе свой інтэлект на мадэлі, ад якіх мала карысьці, і дыскутуе пра ўчорашнія вайсковыя альянсы, бо наўрад ці можа нешта сказаць пра пэрспэктывы сябе цывільнае. Пры гэтым яшчэ вельмі шмат трэба зрабіць. Кантынэнт усё яшчэ не даведзены да ладу. XX стагодзьдзе пакінула пасьля сябе пасярод Эўропы свае раскіданыя гнёзды. На дне Балтыйскага мора з часоў апошняй вайны ляжаць ёмістасьці з атрутнымі рэчывамі, якія вынішчаць усё жывое ў моры, калі соль і іржа разьядуць іх. За Чарнобылем-1 у любы момант можа надысьці Чарнобыль-2 ці 3. Але дагэтуль ня створаныя *Task Forces* для непрадбачаных выпадкаў. Аб’яднаньне кантынэнту — гэта нешта іншае, чымся пасоўваньне NATO ці „пашырэньне Эўрапейскага Зьвязу“. Усталяваньне аднолькавай шырыні каляіны даецца цяжка. Шырыня каляіны — гэта ня проста тэхнічнае пытаньне, гэта пытаньне ідэнтычнасьці. Тая Расея, якая б перайшла на прынятую ў Эўропе шырыню каляіны, ужо не змагла б вярнуцца да ізаляцыі. Кантынэнт ня можа беспакарана доўгі час жыць у дзьвюх розных эпохах, перапады часу могуць прывесьці да небясьпекі. Але для гэтага трэба наважыцца праявіць фантазію і рэалізаваць вялікія пляны. А ў Нямеччыне больш не прынята выбудоўваць вялікіх плянаў, бо ўсё вялікае яна дыскрэдытавала маніяй велічы. Пабудову аўтамагістраляў на ўсход, патрэбу ў якіх адчувалі ўсе, зьдзейсьніў Гітлер „танкавымі гусеніцамі“. Пабудова транспартных артэрыяў у Крым ці Каўказ была дыскрэдытаваная плянамі „Арганізацыі Тодта“ наконт чыгунак

з шырокай каляінай, дыскрэдытаваная вэрмахтам, дэпартацыямі, уцёкамі і выгнаньнямі. XX стагодзьдзе аказалася маладушнае і нялюдзкае. „Інтэграцыя Эўразіі“, „дарогі ў Пэрсію, Індыю, Японію“ — гэтыя выразы гучаць як дарога ў абдымкі імпэрыялізму або ў кірунку Багдадзкага шляху. Таго, хто пралічвае новыя магчымасьці, запісваюць у вар’яты. Прычым гэта пытаньне толькі эканамічнага разьліку, як паказала пасьпяховая дэманстрацыйная паездка хуткага грузавога цягніка па маршруце Находка—Масква—Берасьце. На 10500 кілямэтраў паміж Эўропай і Ціхім акіянам цягніку спатрэбілася толькі 9 дзён, што на 15 дзён менш, чымся морам. Гэта значыць, што фантазія перасялілася зь літаратуры ў аналітычныя цэнтры чыгунак. Банкі, якія вядуць свае апэрацыі ўва ўсім сьвеце, сталі спадкаемцамі касмапалітызму ды інтэрнацыяналізму.

Катлаван на вакзале Лертэр

На паўдарозе між станцыямі „Цоо“ і „Остванго ф“ знаходзіцца станцыя „Лертэр Бангоф“, якой неўзабаве выпадзе гонар быць новым цэнтральным вакзалам. Новай *Central Station* Бэрліна. Зьдзеецца тое, чаго раней ніколі не было ў Бэрліне: усе бакі сьвету сыдуцца ў адным вакзале. Бэрлін зьбірае *membra disiecta* і пераўвасабляе іх. Нідзе трансфармацыя ўнутрыгарадзкой пэрыфэрыі ў новы гарадзкі цэнтар не адчуваецца так моцна і так беспасярэдне, як у цягніку, які рухаецца на трасе, што праходзіць над катлаванам новага цэнтральнага вакзалу. Мы зазіраем у катлаван. Сьпярша ён рос углыб. Цяпер з будоўлі мэтаскіравана вырастае Хрустальны палац у стылі *high-tech*. Паміж Хрустальныым палацам на поўнач ад Шпрэ і шкляным купалам Райхстагу існуе зрокавы кантакт. З вышыні купалу можна няўзброеным вокам назіраць, як разарваныя сувязі зьвязваюцца нанава. Эўропа выпраўляецца ў падарожжа.

Шлюзы часу, новы сяроднеэўрапейскі час

Пэрыфэрыйнае існаваньне Бэрліна, пра якое ўжо гаварыў Карл Шэфлер, ізноў убіраецца ў плоць. Новая Эўропа мае свае гарады, як некалі падзеленая Эўропа мела свае. Пакуль усё паказвае на тое, што Бэрлін і надалей сьніць старыя сны. Яго Хрустальныя і Шкляныя палацы перашкаджаюць яму ўбачыць

сур'ёзнасьць новага палажэньня. Палацы прызначаныя для забаваў і бесклапотнасьці і збудаваныя для эры вечнага міру. Пасьля бамбардаваньняў Бялграду і Новага Саду можна ўявіць сабе, што з тых палацаў было б, калі б тут упала адна-адзіная бомба. Тоны шкла абрынуліся б на зямлю, і ад купалоў не засталося б нічога, апроч сталёвых шкілетаў. Але, мабыць, сапраўдным выпрабаваньнем будзе мір. Для Эўропы, якая ня зводзіцца да тае Эўропы, чые межы праведзеныя паводле Маастрыхцкай дамовы. Для Эўропы, якая дасягне свайго новага адзінства толькі тады, калі адмовіцца ад заходніх і ўсходніх блёкаў і нанава да сябе прыгледзіцца і перабудуе сябе. Бэрліну, як і іншым некалі пэрыфэрыйным местам накшалт Вены, Прагі, Будапэшту, Пецярбургу, Стамбулу, належыцца ў гэтым новая роля. Іхнае існаваньне сьведчыць: тут нічога ня скончылася, тут нешта працягваецца, тут нешта пачынаецца. Існаваньне Бэрліна — гэта вэта на самаабмежаваньне Заходняй Эўропы, магчыма, гэта нават джала ў яе плоці. Пэрыфэрыйнае існаваньне ў гэтым выпадку — перавага Бэрліна. Новаму Бэрліну патрабуецца новая Сярэдняя і Ўсходняя Эўропа. Для гарадоў на ўскрайку сьвету не будуюць такіх цэнтральных вакзалаў. Калі няма будучыні, не будуюць міжнародных лётнішчаў. Інтэнсіўны рух на бэрлінскай акружной сьведчыць, што матор Бэрліна пачаў працаваць. Таму найдаражэйшы досьвед, які можна гэтым часам вынесьці з Бэрліна, палягае ўва ўлоўліваньні таго, як мы пераходзім ад старога сярэднеэўрапейскага часу на новы і са старой Эўропы — у зьмененую. Я ўпэўнены, некалі будка з надпісам „Эўразія" зноў зьявіцца тут.

Тэкст перакладзены паводле
Berlin. Metropole. Kursbuch Heft 137, Berlin: Rowohlt, September 1999.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (15) – 2001

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com**
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **28-04-2001**
[image]

Дэн Якабсан

Літоўская пастараль

ДЭН ЯКАБСАН брытанскі раманіст, эсэіст і крытык. Прэзэнтаваныя тут успаміны пра падарожжа на Літву ўвайшлі ў ягоную кнігу „Heshel's Kingdom" (Hamish Hamilton, 1997).

Няма такога іншага падманліва-нявіннага краявіду, як літоўскі. Я наведаў краіну ў чэрвені, калі лета ў самай сіле і літаральна ўсюды буяе расьліннасьць. Аднак незвычайнае ўражаньне даверлівасьці й адкрытасьці, характэрнае для літоўскага краявіду, стваралася ня гэтым, а, хутчэй, адсутнасьцю штучных разьмежаваньняў прасторы. Па-за межамі гарадоў і вёсак, фактычна не было ні драцяных агароджаў, ні пярэплатаў, ні частаколу, ні муроў, ні нават якіх-небудзь знакаў, якія б сьведчылі пра тое, што маёмасьць адных канчаецца, а іншых — пачынаецца. Тут, здаецца, усе ўпэўненыя, што суседзі ня могуць замахнуцца на іх тэрыторыю, што худоба ня спляжыць пшанічных ды жытнёвых палеткаў, якія, нічым не абароненыя, разьлягаюцца навокал, што чароды козаў не наробяць шкоды гародніне, да якой ім так лёгка даступіцца.

Як такое можа быць? Што тычыцца худобы, усё вельмі проста. У Літве проста няма вялікіх статкаў і чародаў. Тут лічыцца за норму мець адну карову, дзьве-тры казы, а авечак я наагул нідзе ня бачыў. Жывёлу заўсёды трымаюць навязанаю — за слупок або за дрэва — звычайна на двары, як найбліжэй да

сядзібы. Пасьвячыся на сонцы або лежачы ў ценю, яна бездакорна спалучаецца з навакольлем, як на гравюры XVIII ст., прысьвечанай вясковаму жыцьцю. Калі карова выядае траву вакол сябе, хлопчык або дзяўчынка перавязваюць яе пад іншым дрэвам, на нечапаным месцы, і жывёла зноў пачынае скубсьці. Цялятаў не навязваюць наагул. Яны заўсёды трымаюцца паблізу ад сваіх мацярок і йдуць за імі пакорліва дахаты, калі, бліжэй да вечара, тыя цягнуцца туды, дзе іх дояць гаспадыні.
Няма статкаў, няма чародаў, няма патрэбы ў агароджах. Таму краявід тут просты і адкрыты, нібыта гэтую мясцовасьць нейкім дзіўным чынам абмінулі ня толькі камуністычная калектывізацыя, але й даіндустрыяльнае абгароджваньне. Некаторыя землі, як я ўжо казаў, да гэтага часу заставаліся ў калектыўнай уласнасьці, аднак працэс перадачы іх у індывідуальнае карыстаньне ўжо пачаўся, праз што нетутэйшы нізавошта б ня здолеў адрозьніць прыватнай зямлі ад калектыўнай. Нават чыгунка тут рэдка дзе абгароджаная. Калі вы жывяце ў адным з старэнькіх, нібыта скручаных артрытам лясных дамкоў блізка чыгункі і вам заманецца спыніць цягнік, проста станьце каля рэек і махніце рукой. Калі гэта будзе не экспрэс, у якім мой сын і я цяпер знаходзімся, ён спыніцца.
І карова альбо каза ў недалёкім садзе будуць спакойна назіраць за тым, што адбываецца: ім цягнік не здаецца чымсьці небясьпечным, а яны — цягніку.

Перад хаткамі, што туліліся ўзбоч чыгункі, відаць было круглыя цагляныя студні, крытыя гонтай альбо бляхай. Пасьля паказаліся распоўзлыя непрыгожыя вёскі, пабудаваныя збольшага з распаўсюджанай тут цэглы пяшчанага колеру. Пасьля пачаліся неабгароджаныя палі пшаніцы, жыта або ячменю; сады (яблыні, у асноўным); ягадныя кусты, фасоля на тычках, капуста і каляфёры буялі на градах, яшчэ некалькі драўляных дамоў з разнымі застрэшшамі; лугі зь мірыядамі палявых кветак. Гораў тут няма, толькі штосьці кшталту ўзгоркаў, рэкі павольныя, пушчы дрымучыя; сустрэлася немалое абсаджанае дрэвамі возера альбо два — іншымі словамі, чым далей, тым „калярытней“.
Выгінаючыся туды й сюды, западаючы ў неглыбокія даліны і зноў разьбягаючыся на шырокі прастор, абапал дарогі

серабрацца лугавіны ды зьзяюць больш насычанай зелянінай палі; лясы ж стаяць цёмна-зялёныя; чарнеюць сьвежаўзараныя або засеяныя загоны; а гарызонт губляецца ў блакітнай смузе, ледзьве-ледзьве адрозьніваючыся ад блакіту нябёсаў. Скрозь тырчаць тоўстыя сьцябліны дзікага лубіну. Ён цьвіце такімі вялізнымі фіялетавымі сьвечкамі, што мне стала цікава, ці ня быў ён калі-небудзь культурнай расьлінай, якая нейкім чынам зьбегла з садочкаў і зьдзічэла, як трусы ў Аўстраліі або каты на востраве Паўднёвая Джорджыя.
Пушчы і бары аказаліся не такімі цёмнымі і дрымучымі, якімі я іх сабе ўяўляў, — прынамсі, там, дзе пралягаў мой шлях. Дый не такімі разлогімі. Я чакаў, што звонкія бары і сьветлыя беразьнякі будуць цягнуцца на многія кілямэтры. А аказалася, у тутэйшых гаёх ніводная парода дрэваў не дамінуе: шматлікія дубы і клёны шумяць побач зь ліпамі і ясенямі, вольхамі і таполямі. Яны выглядаюць, нібыта дэкарацыі да „Сну ў летнюю ноч“ — нашмат больш дружна і гарманічна, чым падказвалі мне мае дзіцячыя ўяўленьні. Увогуле, лясы, як і ўсё тое, што я бачыў падчас гэтай вандроўкі з акна машыны, цягніка альбо аўтобуса, здавалася мне ахінутым у вераломны літаратурна-маралістычны туман, уяўна-эстэтычную імглу.
Так і людзі на вёсцы, што працуюць. Жанчына нясе ваду са студні ў хату. Мужчына і жанчына разам косяць траву і зграбаюць яе ў падобныя да вульляў капіцы. Мужчына баранує поле канём. Сям’я, укленчыўшы, поле грады. Дзяўчына нясе ў вялікім кашы сьпелую садавіну (ягады?) дахаты. Мужчына сьцябае пугай кабылку, запрэжаную ў трунападобныя калёсы. Жанчына, нібы сьціснутая ральлёй, расьсявае насеньне зь сявенькі на плячы.
Навошта я апісваю гэта? Збочваю з дарогі, кірую ў лес, еду колькі соцень ярдаў лясною дарогай, такой вузкай, што ляшчэвіна і мяккія вееры папараці ўвесь час гладзяць машыне бакі. Пасьля выходжу і йду наперад па зарослай ажынай сьцяжынцы. Апынаюся на парэпанай — у сонечных бліках — абгароджанай прагаліне. На яе ўскрайку стаіць пляскаты камень з мэтар увышкі. У верхнім левым яго куце высечаная зорка Давыда. Ніжэй выбіты надпіс па-габрэйску і па-літоўску з датай, што пазначае дзень, калі ў другую сусьветную вайну габрэяў з Бабцяю і Вандзёгелы прывезьлі сюды і расстралялі. Я стаю і аглядаюся, а птушкі ціўкаюць, сварацца і калышуць

покрыва лістоты.

Іду назад да машыны, вяртаюся на дарогу, еду пару міляў уперад, кірую ў лес, праяжджаю пару заваротаў — і нібыта трапляю на тое самае месца: сонечнае сьвятло, ажыны, птушыныя сьпевы, такая ж сьветлая прагаліна і на ёй камень з зоркай Давыда і надпісамі па-літоўску й па-жыдоўску. Толькі дата крыху іншая, і расстралялі тут габрэяў з Арыягаляю. Вяртаюся на дарогу, еду яшчэ пару кілямэтраў, кірую ў лес... Добра — стоп — годзе — няма чаго хадзіць і глядзець, дзе былі расстраляныя габрэі зь Немакшцяю. Гэтак можна прахадзіць тыдзень, месяц. Я хачу дабрацца да гораду, дзе мой дзед шмат год служыў рабінам. Але напрыканцы мы наведаем яшчэ адно лясное ўрочышча. Той самы плот, што і скрозь, тое самае сонца, пракаветная ціша, якую парушаюць толькі птушкі сваімі сьпевамі й спрэчкамі над галавой і ў падлеску.
Імя нашага гіда супала з маёй колішняй мянушкай, якую я атрымаў ад калегаў па Лёнданскім унівэрсытэце. Зваць яго Шлёма. Невысокі, паўнаваты, дрэнна паголены стары кавалер сярэдніх гадоў, у неадменнай жоўта-белай бэйсболцы, па якой, уласна, я яго і пазнаў пры першай сустрэчы. Ягоная экіпіроўка складаецца таксама з кашулі ў зялёныя і белыя палосы з кароткімі рукавамі, нагавіцаў з востра адпрасаванымі калашынамі і абавязковых красовак. За сьпінаю ў яго на рэмені трымаецца невялікая парусінавая сумка; у задняй кішэні нагавіцаў — партманэ, набітае літоўскімі банкнотамі і візытоўкамі былых кліентаў.
У размове ён шумны і мітусьлівы, рассыпаецца ў шырокіх жэстах, выбухае рыпучым сьмехам. Такая ягоная манера размаўляць, так ён часта распавядае нават пра самыя жахлівыя рэчы. Вымушанае бязьдзеяньне выклікае ў Шлёмы мэлянхолію. Калі сумуе, ён здаецца іншым чалавекам: зморшчыны вакол крыху прыадчыненага роту паглыбляюцца, падбародзьдзе апускаецца, у задуменных карых вачах мільгаюць зеленаватыя сполахі. Ён стаіць у характэрнай паставе: адна рука падпірае локаць другой, сагнёнай, на скручаных пальцах якой задумліва адпачывае падбародзьдзе.
Як амаль усе габрэі, якіх я сустракаў, Шлёма казаў мне, што яго бацькі пасьпелі зьбегчы ўглыб Расеі перад прыходам нямецкага войска. Ягоны бацька ўжо памёр, а маці жыве на

ўскрайку Коўна. Аднойчы, калі мы вярнуліся з нашае экскурсіі пазьней, чым разьлічвалі, я заўважыў, што першай справай Шлёма патэлефанаваў ёй, каб сказаць, што ў яго ўсё добра. Чаргуючы самоту халасьцяцкага становішча з хуткацечнасьцю сваіх працоўных абавязкаў, Шлёма ставіўся да сваёй працы вельмі сур'ёзна. Яго ўлюбёным самавызначэньнем, якое ён часта паўтараў мне, было „пасол да габрэяў". „Пасол ад габрэяў "? — папраўляў я, зьмяняючы фразу. Але ён быў настойлівы: „Не, амбасадар да габрэяў". Я не спрачаўся, аднак ніяк ня мог даўмецца, у адносінах да каго ён выконваў свае, як сам казаў, амбасадарскія абавязкі. Да габрэяў, што зараз жывуць у Літве? Да тых мёртвых, якіх намнога болей за цяпер жывых?

Я падазраваў апошняе. Нават у самых характэрных сваіх рысах Шлёма быў падобны да іншых габрэяў, якіх я сустракаў падчас сваёй вандроўкі. У іх паводзінах заўважалася дзіўная адметнасьць: яны, такое ўражаньне, чулі гукі, нячутныя для іншых, — гэтак чуюць глухія. Яны рухаліся скрозь невядомую пустату, якая, здавалася, знаходзіцца ў іх і, адначасова, належыць да вонкавага сьвету, таму сустрэча зь ёй заўсёды была нечаканай, новай для іх. Нібыта іх заўсёды суправаджала ня толькі сьмерць, але і ніколі-не-нараджэньне: усіх тых, хто мог бы быць іх сучасьнікамі і спадарожнікамі сёньня, мужчынаў і жанчынаў, якім сьмерць не дала ніякіх шанцаў завязацца, нарадзіцца, вырасьці і пасталець.
Так, ён быў несумненна паслом да жыдоў, у тым ліку для мяне і майго сына, і ён даказаў сваю карыснасьць. Ён рабіў сваю працу добра. Хоць да мяне ніхто не прасіў яго звазіць у Варняй, маленькае мястэчка, дзе жыў мой дзед, або Кельме — крыху большае, адкуль быў мой прадзед, Шлёма і там, і там адшукаў „адзінага апошняга жыда", зь якімі мы маглі б сустрэцца па нашай справе. Мы былі на правільным шляху. Безь яго ці знайшлі б мы пры канцы затравелых лясных каляінаў гэтыя абгароджаныя паляны з мэмарыяльнымі дошкамі, кожная зь якіх пазначае, як упарта казаў Шлёма, месца „масавых масакраў"?
Само сабой, ён вымаўляў гэтыя два словы зь цьвёрдай упэўненасьцю, што „масавыя" і „масакры" арганічна спалучаюцца, дзякуючы сваёй аднакарэннасьці. Хто б

наважыўся запярэчыць яму? Або выправіць памылку?
Зноў і зноў, дзе б мы ні вандравалі, я бачыў дарожныя ўказальнікі з назвамі, што часта згадвалі ў размовах мае знаёмыя жыды. Назвы гэтыя заўсёды вымаўляліся з выбачальным гумарыстычным адценьнем, нібыта было нешта абсурднае ў тым, што чалавек мог мець нешта супольнае зь месцам, пазначаным гэтым нагрувашчаньнем іншаземных галосных і зычных: „О, мае дзядуля і бабуля прыехалі з маленькага літоўскага мястэчка, што мае назву Марыямпаль“, „Мае прыехалі з Панявежу“, „Клёкалі, здаецца“, „Штосьці накшталт „Радзівілішкаў“. І гэтак далей.
У Літве я зразумеў, наколькі кожнае з гэтых сьціплых імёнаў, як і іншыя, больш — злою славаю — вядомыя, сымбалізуюць, пазначаюць сабой бяспрыкладную катастрофу, у агні якой згарэлі жыды Ўсходняй Эўропы. Тое самае можна сказаць і пра безьліч іншых назваў, невядомых мне. Тое самае можна сказаць і пра Варняй, мястэчка майго дзеда, хоць побач зь ім і няма месцаў „масавых масакраў“. Ад старой спадарыні, якую я сустрэў — яна была тым самым „апошнім жыдам“ — я даведаўся, што праз колькі тыдняў пасьля нямецкага ўварваньня жанчыны й дзяцей з гораду адвезьлі за многа кілямэтраў на поўнач і там забілі ў лесе, разам з сотнямі іншых, сабраных з усяго раёну. Мужчынаў адвезьлі яшчэ далей, у Цялшай, і там расстралялі.
Немцы ўварваліся ў Літву 22 чэрвеня 1941 году. Напрыканцы жніўня, згодна з „Энцыкляпэдыяй Галакосту“ (1990), „пераважная большасьць габрэяў краю была зьнішчаная“. Гэта азначае, што ў гарадох і вёсках краіны, па плошчы прыкладна роўнай Ірляндыі, габрэяў, што жылі тутака шэсьцьсот год, зьнішчылі за некалькі тыдняў. Мэтадам „ліквідацыі“ быў расстрэл зь вінтовак і кулямётаў. На пачатку сьнежня 1941 году штандартэнфюрэр СС Карл Ягер, начальнік Айнзацкаманды 3, паведамляў сваім камандзірам, што толькі пятнаццаць адсоткаў літоўскіх габрэяў (усе яны называліся „працоўныя габрэі“, большасьць зь іх знаходзілася ў гета ў Коўне й Вільні) яшчэ жывыя. „Сёньня я магу ўпэўнена заявіць, што Айнзацкаманда 3, — пісаў ён, — вырашыла габрэйскую праблему ў Літве“.

Чатыры гады забойстваў яшчэ толькі пачыналіся.

Габрэйскія могілкі ў Варняі знаходзяцца на ўзвышшы наводдаль гораду. Новая агароджа з мэталёвай сеткі з прыгожымі варотамі атачае іх. Я патраціў шмат часу, шукаючы магілу майго дзеда, Рабі Ізраэля Еошуа (Гэшэля) Мэлямэда. Многія камяні зрушаныя зь месца дрэвамі, іншыя, што звaліліся далоў проста ад часу, ляжаць хаатычна, нібы трупы, іншыя хаваюцца ў пышнай траве, такой высокай і густой, што нідзе мае чаравікі не кранаюцца глебы. Пад сёлетняй травой сьцелецца леташняя. Палявыя кветкі ўсюды: крохкія рагулькі з маленечкімі візэрункавымі пялёсткамі, абсалютна белыя рамонкі, плеяды прамяністых дзьмухаўцоў. Абутак вільготны ад расы й соку расьлінаў, у паветры разьліваецца слодыч ад раздушанай травы.

Я хадзіў сюды-туды, часам спыняючыся над шурпатымі надмагільлямі. Сьвет Рыўкаў, Шмуйлаў, Абрагамаў, Фізаў, Залманаў, Сараў, Лазараў. Сьвет яснага сонца і дрыготкіх ценяў; дрэвы стаяць, як калёны, адны зубчастыя, другія гладкія, наводдаль бачная срэбная цыбулінка купалу найбольшага касьцёлу Варняю. А Гэшэля Мэлямэда няма.

Толькі пры ўваходзе — адносна навейшыя надмагільлі, пасьля 1920-га — пасьля сьмерці майго дзеда і выезду сям'і з Варняю. З жахлівай дакладнасьцю ўсьведамляю: пахаваньняў, пазьнейшых за травень 1941 году няма. Разглядаю камяні: на адным зь іх напісана, што пад ім ляжыць 16-гадовы хлопчык, прыгожы й разумны. Як плакалі па ім яго бацькі і сям'я тады, у 1936-м, ня ведаючы нічога пра тое, што чакае іх саміх!

Недалёка ад уваходу — гранітны абэліск з надпісам, адрозным ад тых, якія я бачыў на камянёх такіх памераў і формы ў іншых месцах. Зьверху зорка Давыда, ніжэй — словы па-габрэйску і па-літоўску: „Да 1941 году гэтае месца выкарыстоўвалі як жыдоўскія могілкі Варняю". Я доўга разглядаў надпіс, перш чым зразумеў ягоны сэнс. Насамрэч, гэты камень быў помнікам тым, каго на гэтых могілках няма. Надпіс сьведчыў пра тое, што могілкі тут менавіта „былі" ў прошлым часе, хоць яны й сталіся апошнім прытулкам для шматлікіх пакаленьняў, і майго прадзеда ў тым ліку. Мёртвыя ляжалі тут і цяпер, але гэтае месца больш не ўспрымалася як „жыдоўскія могілкі Варняю". Яно перастала быць ім у 1941-м, са зьнішчэньнем грамады, якая іх „выкарыстоўвала".

У 1941 годзе людзі, пахаваныя тут, знайшлі сваю безназоўную

аднолькавую магілу ў супольных ямах або на вогнішчах, раскладзеных забойцамі.

І нікога пасьля. Вось чаму могілкі ня дзейнічаюць.
Шлёму, мяне і майго сына на могілкі прывяла жанчына з Варняю. Нашы шляхі між магілаў перакрыжаваліся, яна павіталася на ідыш, абвёўшы іранічна-сумным позіркам клады. „Вы бачыце, — сказала яна, — зараз я рабітцэн Варняю“. Рабініха. Першая дама Варняю. Яе словы доўга гудуць у мяне ўвушшу, бо якраз мая прабабка Мэнуга была жонкай сапраўднага рабіна Варняю, чалавека, чыю магілу я акурат шукаю. У яго часы габрэйская грамада гораду налічвала каля 700 асобаў; у іх быў Гэшэль Мэлямэд, іх рабін, сынагога, а таксама два „шціблах“, маленькія малітоўныя дамы, і гэтыя могілкі чакалі іх усіх.
Цяпер яна засталася адна. Яна прадстаўляе ўсіх і адказвае за кожнага. Амэрыканцы, што наведваюць магілы продкаў, ахвяруюць ёй грошы, а яна на гэтыя грошы цягне справу рэстаўрацыі могілак і догляду за імі. Пра яе дзейнасьць сьведчаць новая брама і агароджа; таксама пачалася расчыстка цьвінтарнай тэрыторыі. Ёй за шэсьцьдзесят, вялікія цёмныя прамяністыя вочы пазіраюць з-пад хвалі густых попельных валасоў, зачасаных набок над шырокім ілбом; вузкія іранічныя вусны, зьлёгку падфарбаваныя; выразнае падбародзьдзе; многа вострых зморшчынак вакол роту; цьвёрдыя скулы; магутная шыя. Кожны адведзены позірк, або нечаканы, адкрыты пагляд, або нахіл яе галавы, сьведчыў пра востры, рэдкасны гумар. Яна не цуралася нас, наадварот, проста захаплялася нашай кампаніяй. Сама яна нарадзілася не ў Варняі; ёй удалося зьбегчы ў лес з натоўпу жанчын і дзяцей, якіх зьнішчылі на наступную раніцу, пазьней яна зьведала жахі гета ў Шаўлях, пасьля яшчэ большыя — у Штутгофскім канцэнтрацыйным лягеры. Пра лёс сваіх родных яна не распавядала, а я й не пытаўся. Пасьля ўсяго гэтага яна вывучала матэматыку ў Клайпедзкім пэдінстытуце і, нарэшце, прыехала ў Варняй працаваць у тутэйшай сярэдняй школе.
Цяпер яна ўдава, раней была замужам за літоўцам, старэйшы сын жыве ў Коўне, малодшы — у Вільні. Яна спадзявалася, што апошні наведае яе гэтымі выходнымі, але ён бярэ ўдзел у вялікім турніры па брыджы. Яна кажа гэта адначасова і з

гонарам, і зь зьедлівасьцю ў голасе. Ці то зьедлівасьць была адрасаваная яму (бо абраў брыдж, а не сустрэчу зь ёй), ці сабе (бо ганарыцца яго посьпехамі ў гэтай гульні), цяжка вызначыць. Гэты, які грае ў брыдж, гэта яе „габрэйскі“ сын, кажа яна, і ціха, загадкава пасьміхаецца. Пасьля яна патлумачыць, што яна мела на ўвазе: „У яго валасы цёмныя“ (*Er iz tunkl*).
Яна не была ў Варняі да вайны і ня можа мне нічога распавесьці пра тыя часы. Дзе жыў рабін зь сям'ёю, яна ня ведае; сынагогу, ёй казалі, разбурылі дашчэнту. Я памятаю, мая маці аднойчы расказвала мне, што дом, у якім яна правяла маленства, быў адзінаю двухпавярховаю камяніцаю ў горадзе, але я ўжо пабачыў, што цяпер такіх — сотні і сотні.

Крыху пазьней мы патрапілі на абед да яшчэ аднаго „апошняга жыда Варняю“, пра чыё існаваньне ўжо чулі ад нашай сарданічнай рабітцэн. Могілкі хутка зьніклі з поля зроку.
Я нават ня мог уявіць, што б адчуў, калі б знайшоў надмагільле свайго дзеда. Але не знайшоў то не знайшоў. Дзіва што не знайшоў — сярод гэтых суцэльных руінаў, сярод гэтага мноства помнікаў, сярод цэлай нацыі помнікаў я не знайшоў магілы дзеда. Гэшэль Мэлямэд хаваўся сярод рэшткаў тых, хто лёг сюды на стагодзьдзі раней, і тых, хто прыйшоў сюды пасьля яго; усе яны знайшлі спакой у асобных падпісаных магілах. Ён сам, несумненна, суправаджаў многія сем'і памерлых да гэтага месца і чытаў тут малітвы.
Усё тутака было яму знаёмым. Усё, апроч помніка ля варотаў і жахлівага надпісу на ім.
Іншая (другая апошняя) габрэйка ў Варняі аказалася маладзейшаю за нашую рабітцэн, гаваркою, бяднейшаю, менш адукаванаю. Яе кароткія валасы пафарбаваныя ў ёдзісты колер, паверх сукенкі яна накінула фартух. Яна таксама замужам за літоўцам, які, відаць, яшчэ жывы, але падчас сустрэчы не паказаўся. Яна выставіла на стол — багаты, у расейскім стылі — шматлікія пачастункі: салямі, вэнджанага вугра, селядца, памідоры, цыбулю, хрумсткія марынаваныя гурочкі, аржаны хлеб, варэньне, масла, самаробнае яблычна-малінавае віно (моцнае і салодкае), распушчальную каву. І, паводле ўсходнеэўрапейскага звычаю (які я ўжо аднойчы назіраў), пакроены кавалак чыстага белага сала з тонкай пераросьлінкай барвовага мяса.

Яна сама нічога ня ела, але ўвесь час ускоквала, усім падкладаючы, настойваючы, каб мы зьядалі ўсё, напаўняючы нашыя келіхі яблычна-малінавым віном. У пакоі стаялі тэлевізар, зашклёны сэрвант зь люстэркам на задняй сьценцы за шклянымі ж палічкамі, буфэт для розных глякоў, шклянак, вінных келіхаў і кубкаў, пасярод пакою спачывала вялікая грубка, абкладзеная кахляю, з патынкаваным комінам. У такіх печах паляць дровамі. У іншых пакоях я налічыў на сьценах тры драўляныя расьпяцьці розных памераў, маю ўвагу зьвярнулі таксама прэтэнцыёзнае штучнае дрэва і пара фатаздымкаў у аднолькавых плястыкавых рамках.
За абедам я даведаўся, што нашая гаспадыня нарадзілася ў Варняі. Яна выжыла ў вайну, дзякуючы ксяндзу, які ўзяў яе маці, яе саму і дзьве яе сястры пад сваю апеку. Пра свайго бацьку яна ня згадвала, а я не пытаўся. Чаму ксёндз уратаваў іх, яна не патлумачыла. Ён схаваў іх у сялянскай сям'і, дзе яны й выраслі. Ёй было пяць год, калі прыйшлі немцы. Яна фактычна ня памятала даваеннага Варняю. Калі я спытаўся (не чакаючы станоўчага адказу), ці памятае яна каго-небудзь у горадзе, хто згадваў бы пра сям'ю Мэлямэдаў, яна адказала, што ніколі ня чула такога прозьвішча. Мы пайшлі ад яе, моцна дзякуючы, а яна нас сьціснула на разьвітаньне ў палкіх абдымках. Абдымкі рабітцэн, калі мы расставаліся пазьней, былі больш стрыманымі, ды, як мне падалося, больш сардэчнымі.

Коўна (Каўнас) — другі па значнасьці горад Літвы. Яго Старое Места нашмат меншае, але ня так разбуранае новымі дарогамі й стаянкамі, як адпаведны раён сталіцы, Вільні. Галоўная пешаходная алея гораду забудаваная дамамі, рознымі паводле сваёй архітэктурнай стылістыкі. Найдаўнейшыя адносяцца да XV ст. Ад яе адыходзяць вузкія, абшарпаныя завулкі. Усё расплываецца ў няяркіх фарбах, што нібы пульсуюць у летнім балтыйскім сьвятле, асабліва па вечарах. Грандыёзная Ратушная плошча зь нізкімі тэрасамі будынкаў позьняга Сярэднявечча, нагрувашчаных на адным яе баку. Калі б плошчу і цэрквы паблізу можна было падняць і перанесьці на 500 міляў на захад, там яны, напэўна, круглы год былі б аточаныя кардонамі з турысцкіх аўтобусаў, на бруку ляжалі б, задраўшы ногі, грамады турыстаў, а ў сярэднявечных будынках

гандлявалі б сувэнірнымі торбачкамі зь лявандай, шкляным посудам, вадкім мылам і вязанымі швэдрамі. А так плошча стаіць пустая. Працуе толькі маленькі бар. Дзеці гуляюць у мячык. Звоняць званы. Дзьве хатнія гаспадыні крочаць па плошчы, шоргаючы хатнімі пантоплямі па камянёх. Шпацыруюць два ксяндзы — стары і малады. Клоп-клоп — стукае іх абутак у эклезіястычным танцы.

Апошні наш вечар у Коўне. Плошча засталася ззаду, і мы рушылі да месца, дзе зьліваюцца Вяльля і Нёман. Дамы аддаленай часткі плошчы прыгажэйшыя і, адначасова, больш запушчаныя за тыя, што мы ўжо бачылі. Але яны таксама хутка скончыліся, і пяшчанаю сьцяжынкаю праз бур'ян і кустаўё мы спусьціліся ў абалонь, нізка над самаю вадою. З аднаго боку ў нас засталіся трысьнёг і рэдкія будынкі, зарослы дрэвамі бераг — з другога.

На месцы зьліцьця дзьвюх рэкаў сьцяжынка паварочвае ў бок рэстаўраванай царквы і сярэднявечных цагляных умацаваньняў. Знадворныя будынкі ўмацаваньня і сьцены можна было б прыняць за закінутую фэрму; галоўная вежа круглая, пад прыгожым, нібы капялюш, бляшаным дахам. Дзьве жанчыны крочаць перад намі, адна маладая, адна сярэдняга веку; яны гавораць па-ангельску, хаця адчуваецца, што гэта ня іх родная мова; абедзьве выкшталцона апранутыя, на іх лёгкія блюзы і цёмныя доўгія спадніцы, пэўна што не літоўскай вытворчасьці. Я пачуў, як маладзейшая кажа пра расейскага паэта-эмігранта: „Іосіф Бродзкі таксама ж памёр?"

Нас мінае гурток моладзі, чалавек шэсьць хлопцаў і дзяўчат. Яны сьмяюцца й гучна размаўляюць, аднак яны не настолькі захопленыя самі сабой, каб не заўважыць нашай замежнасьці ці нашай габрэйскасьці, або і таго, і таго. Мы разьмінаемся, праходзім пару мэтраў, і я чую, ня першы раз за час майго знаходжаньня ў Літве, як хтосьці зь іх гучна адхаркваецца.

І каля майго бота прызямляецца смачны плявок. Гэта ўжо нешта новае. Прааналізаваўшы адлегласьць і ведаючы, што той, хто плюнуў, мусіў павярнуцца на 180 градусаў, я магу ўпэўнена сьцьвярджаць — гэта не выпадковасьць.

„Выпендрыўся", — кажа сын. А мне здаецца, што ён зрабіў гэта, бо я габрэй. Або яшчэ таму, што больш за дзьве групы ангельскамоўных іншаземцаў — гэта ўжо занадта для іх тонкіх душаў.

Вяртаемся на плошчу, цяпер зусім пустую. Вяртаемся да грандыёзнае Ратушы. Вядомай (так кажа кніжка пра Коўна) як Белы Лебедзь дзеля сваіх белых сьценаў і элегантнай высокай белай вежы. Іншага кшталту „экскурсійная кніжка“ па Коўне, „Дзёньнік ковенскага гета“ Абрагама Торы, распавядае менш прыемныя рэчы пра тое, як гэты будынак выкарыстоўваўся. Часам.
Таму няма кутка ў гэтай ласкавай прывіднай краіне, на якім не ляжаў бы цень.
З ангельскай пераклаў Андрэй Скурко
паводле Commentaries *Vol.104 /1997.*

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (15) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **01-05-2001**
[image]

Юры Андруховіч

Час і месца, альбо Мая апошняя тэрыторыя

ЮРЫ АНДРУХОВІЧ лідэр новае ўкраінскае літаратуры, аўтар трох паэтычных зборак і трох раманаў, укладальнік некалькіх анталёгій сучаснае ўкраінскае літаратуры, кандыдат філялагічных навук, даследчык творчасьці Багдана-Ігара Антоныча. Жыве ў Івана-Франкоўску, піпер — на стажы ў ЗША. Апошняя кніга — зборнік эсэ „Дэзарыентацыя на

1.

Запрашаючы мяне да ўдзелу ў гэтым сходзе, Яраслаў Грыцак папярэдзіў, што мая прамова мае быць голасам „у абарону постмадэрнізму“, дазволю сабе яшчэ адну цытату, „постмадэрнізму з чалавечым тварам“. Мне не засталося нічога іншага, як прыняць гэтую ідэю й замірыцца з такою не зусім удзячнай задачай. Відавочна, сам прэцэдэнт з’яўлення такой апалагетычнай патрэбы сведчыць пра пэўную знерваванасць, пасеяную ў нашых інтэлектуальных асяродках цягам апошняга дзясятка гадоў, уласна кажучы, з моманту ўводу ўва ўжытак гэтага слізкага панятку. І сапраўды, насталі часы, калі постмадэрнізму ў нас не крытыкуе толькі лянівы альбо мёртвы. Што да мяне, дык я лічу сябе жывым і не лянівым, таму з радасцю далучыўся б да нападнікаў. Пагатоў, тактыка нападу

здаецца мне больш зразумелаю, паслядоўнаю й **мяжу васьці"** пераможнаю. Аднаго разу я паспрабаваў сістэма**(Лінеяр НВ,** пералічыць усе (ці, прынамсі, найчасцей ужываны**2000). Эсэ** абвінавачанні супроць постмадэрнізму, і ў мяне **перакладзена** што ён: **з ласкавага**

1) заняты амаль выключна цытаваннем, калажам**дазволу** дый наагул паразітуе на тэкстах папярэднікаў; **аўтара.**

2) абсалютызуе гульню дзеля гульні, выключыўшы з дыскурсу жывую аўтэнтыку крэацыі, перажыванняў, душэўнага й духоўнага, сур'ёзнасць нарацыі й супернаратаў;

3) падрывае веру ў Прызначэнне Літаратуры (хто б і што б пад тым прызначэннем ні разумеў); вось жа, постмадэрнізм — гэта смерць літаратуры;

4) іранізуе з нагоды ўсяго на свеце, у тым ліку й самой іроніі, адкідаючы якія-колечы этычныя сістэмы (уласна кажучы, ужо толькі „аскепкі этычных сістэмаў") і дыдактычныя ўстаноўкі (дакладней, адно „водгулле гэтых установак");

5) камбінуе параіндывідуальнае аўтарскае „я" з рэштак іншых аўтарскіх светаў; такім чынам, постмадэрнізм — гэта яшчэ раз смерць, смерць аўтара як творцы ўласнага індывідуальнага аўтарскага свету;

6) „карнавальнаю" (а насамрэч, адно пост-карнавальнаю) маскай адмяжоўваецца ад якой-колечы адказнасці перад Навакольным і за Навакольнае;

7) тупа эксперыментуе з моваю (-амі), механічна нарошчвае суму прыёмаў ды сродкаў, а таксама іх камбінацыяў; вось жа, у трэці раз — „з жалем і сумам паведамляем пра смерць"…

8) рабалепна схіляецца перад віртуалам, мультымедыйнымі прорвамі й пачварамі, прагне падпарадкаваць мастацтва электронным імперыям да назаўсёды пахаваць яго дух у іхным інтэрпавучынні;

9) фліртуе з масавай культураю, дэманструючы безгустоўнасць, вульгарнасць, не грэбуючы „сэксам, гвалтам і садызмам ";

10) руйнуе іерархію, падменьвае асновы, пазбаўляе сэнсу, размывае межы, бярэ слова, а разам з тым і саму рэчаіснасць, у двукоссе, хаатызуе й без таго хаатычнае быццё, іранізуе, займаецца цытаваннем, калажам, мантажом… але гэта ўсё ўжо было.

Такім чынам, пра постмадэрнізм застаецца сказаць, што ён:

а) аганізуючы, агнастычны, амбівалентны, амерыканскі, анемічна-ананістычны, анталагічна маргінальны
б) „бязмежна адкрыты глухі кут“, бязважкі, бясплённы
в) варыятыўны, вульгарызатарска-вычварэнскі
г) гермафрадытны, гомаерэтычны, гетэра- (і гэтак далей-) сэксуальны
д) другасны, дыскурсіўна дэфекацыйны
е) езуіцкі, енкаваты, еўнухаморфны
ё) ёрніцкі
ж) жартацэнтрычны, жыдамасонскі
з) закамплексавана звар’яцелы, замбінатыўны, знежывелы, зменлівы
і) імітатыўны, імпатэнтны, інтэртэкстуальны, інцэстуальны
к) кліпавы, калажавы, калаптычны, камбінаторна-кампілятыўны, кампіляторна-камп’ютарны, канфармісцкі, кансумптыўны
л) лабатамічны
м) манерны, маньерыстычны, маньяцкі, млявы, мярцвяцкі
н) надмерны, неанекрафілічны, нованеўратычны, нудны
о) оптава опіумна опусны
п) палімпсэстны, паразітычны, патавы, паталагічна перасычаны, перверсіўны
р) рэкрэацыйны, рэмінісцэнтны, рэнегацкі
с) сітуацыйны, спарахнелы, структуроідны й структураедны, сыты
т) травестыйны, трансвестыйны
у) уранічны
ф) фельетонны, фемінізаваны, фелінізаваны, фрагментарны
х) хваробатворчы, хімерны
ц) цынічны, цытатакратычны
ч) часападсумавальны
ш) шаманічны
э) эгалітарны, энтрапічны, „эліністычны“, эклектычны, эпігонскі
ю) юрлівы, юродзівы
я) ялавы, яшчэ раз іранічны, я-ўжо-сам-не-ведаю-які-яшчэ.
Апрача таго, яго характарызуюць як „посткаланіяльны“ й „посттаталітарны“, але ж гэта амаль нічога не праясняе, асабліва ў нас.
Апрача таго, ён „ніякі“.

Часам кажуць, нібыта штосьці падобнае ўжо бывала: александрыйская эпоха, восень сярэднявечча, *fin-de-siécle*'ўскі дэкаданс, любая спустошаная/перанасычаная культурная фармацыя. Гэта можна пераканаўча прывязваць да заканчэння пэўнага часавага прамежку, напрыклад, да мяжы тысячагоддзяў.
Сёй-той схільны лічыць, што постмадэрнізм пачынаецца там, дзе пачынаецца — даруйце за таўталогію — аўтарская аўтарэфлексія. Там, дзе тэкст перастае быць сродкам і стаецца мэтаю, там межы й заставы постмадэрнізму. Там, дзе аўтар забываецца на вестку, якую мусіць перадаць, і ўпадае ў самазамілаванне, там, дзе з'яўляецца аўтар-нарцыс, там ужо й пачатак канца. А паколькі так здаралася заўсёды, то й постмадэрнізм быў заўсёды, а значыць, ніколі.
Я разгубіўся сярод гэтай разнастайнасці. Мне застаецца шукаць выключна асабістых адзнакаў і азначэнняў. Я аглядаюся вакол сябе — дзе я?

2.
Я жыву ў спакон вякоў падазронай і зняважанай частцы свету. Гэтая частка свету называецца Галіччынаю. Магчыма, таму мне не застаецца нічога іншага, як назваць сябе постмадэрністам. Гэта, безумоўна, жарт, але не надта вясёлы.
Ёсць рэгіёны праўдзівыя, цэласныя нават у сваёй зманлівай ды пачварнасці. Галіччына — наскрозь штучная, сканструяваная (да цэлае белымі ніткамі псеўдагістарычных домыслаў) назва палітыканскіх інтрыгаў. Тысячу разоў маюць рацыю тыя, хто сцвярджае, што Галіччына — гэта толькі тое, што засталося пяцьдзесят гадоў таму прыдумалі некалькі аўстрыйскіх міністраў. Адно маньерыстычна-саладжавая ідэя-фікс пэўных заканспіраваных стратэгаў, якія свайго часу паставілі сабе хімерную мэту працягнуць Еўропу трохі далей на Ўсход. Еўропы ў іх не атрымалася, затое ўтварыўся такі сабе буфер, свайго роду „санітарная зона". Небарака Франко паддаўся на іхную містыфікацыю, адсюль усе яго няшчасці, уся дэзарыентаваная сізіфаўская дзейнасць.
З перспектывы, напрыклад, Палесся гэты край мае досыць карыкатурны выгляд. Палессе, гэтая касмічная паганская калыска, басейн Прыпяці й Дзясны з яго арыйскай чысцінёй

* Сучаснае *санітарнае* (да 1962 г.) *Цывілізаваныя* (*Заўваж. рэд.*)

каранёў і драўлянскаю нескаламучанасцю крыніцаў, з яго вызначальнымі генетычна-культурнымі кодамі, найархаічнейшым фальклорам, эпасам, дыялектамі, азёрамі, тарфянішчамі, гатычнымі хваінамі, з пасткамі на жывёлу й людзей, з падранеными ваўкамі, Палессе — гэта нацыянальны субстрат, гэта чарнобыльскі выбар Украіны, гэта сама рэчаіснасць, гэта тапорная аўтэнтыка й шчырасць, карны паход месіі Анапрыенкі ўздоўж чыгуначных шляхоў ды шашэйных дарог. Палессе — гэта павольнасць ды панурасць, гэта даведзены амаль што да поўнага спынення час, гэта паўзучая камуністычная вечнасць, што з усіх бакоў атачыла зненавідны сораспусны Кіеў, гэта сама глыбінная чорная ўкраінскасць.
З перспектывы Палесся Галіччыны не існуе, дакладней, яна ёсць, але гэты факт нічога не варты. Галіччына — гэта не-Ўкраіна, нейкая там геаграфічная даважка, польская галюцынацыя. Галіччына ўся наскрозь манекенная, лялечная, надзьмутая, ува ўсім і заўсёды яна прагне навязаць Украіне сваю неўкраінскую, настоеную недзе ў патаемных сіёнскіх лабараторыях волю. Галіччына пазбаўленая эпасу, у ёй спакон вякоў пануе анекдот, прычым нізкі. Уласна кажучы, гэта бескаранёвая прастора, зручная для ўсялякага вандроўнага племені — адсюль армяне, цыганы, караімы, хасіды. Галіччына — местачковая бацькаўшчына масонства й марксізму.
Галіччына падманная й фальшывая, гэта смярдзючы звярынец, перапоўнены яхіднамі й хімерамі, у Галіччыне магчымыя адно мяшанцы накшталт Бруна Шульца альбо тыя дробныя станіслаўскія* кафкі, і калі ты не мяшанец, а, напрыклад, Стэфанік, табе застаецца адно співацца ў першым-лепшым Русаве. „Між іншым, цяпер у Івана-Франкоўску геніяў ужо больш, чым у Маскве“, — іранізуе калючы Ігар Клех, таксама галічанін, таксама геній, у сваёй найноўшай маскоўскай кніжцы.
Іранічны тон тут як ніколі дарэчны. Галіччына ўся іранічная й імаральная, адсюль гэтае вечнае адступніцтва й прыстасавальніцтва, перманентнае ўніяцтва, прададзеныя ў Амерыку дзеці. Галіччына — паказная й павярхоўная, як накладныя манжэты, панскасць, фацэтныя расшаркванні ўва ўсе бакі, цалаванне ручак ды прабояў з так і не пазбытым сялянскім прыцмокваннем, гэтыя бясконцыя й напаўсонныя, з цяжкою пасляабеднаю аскомай, размовы пра Эўропу, Еўропу,

Европу, пра еўрапейскасць, еўрапейскае значэнне-прызначэнне, еўрапейскую культуру ды кухню, пра шлях у Еўропу, пра тое, што „мы ў Еўропе“ — у той час як уся г. зв. „духоўная прадукцыя“ Галіччыны здольная змясціцца ў адной-адзінай львоўскай валізцы сярэдніх памераў. Галіччына толькі й можа, што натужліва пераймаць Еўропу, якая, дарэчы, сама па сабе даўно ўжо нічога не можа (Шпэнглер яшчэ калі пра гэта казаў!). Галіччына — гэта плагіят, тым мізарнейшы, што плагіятар абраў для плагіяту найбольш змярцвелы з магчымых аб’ектаў.
Усё іншае — гэтая кава, свойскія лікёры, тарты й печыва, дыктат хатніх гаспадыняў, вышыванне сурвэтак, а таксама павідла й канфіцюры, ручнікі, дываны, безгустоўнасць ды кіч, словам, красаванне галіцкага мяшчанства ў поўны рост.
З перспектывы Палесся Галіччына не проста нікчэмная — яна постмадэрнісцкая.
Але я маю іншую перспектыву. Дакладней кажучы, не маю яе, бо знаходжуся тут, пасярэдзіне, гэта мая тэрыторыя, гэта мой падазроны й зняважаны свет, фартыфікацыйныя муры вакол яго даўно ўжо паваленыя, равы засыпаныя гістарычным хломаздам і культурным смеццем, нейкаю бітаю парцалянай, чорнаю гаварэцкаю керамікай, гуцульскімі кафлямі — гэта мая лінія абароны, гэта я сам, але ў мяне няма іншага выйсця, як адно бараніць гэты шматок, гэты лапік, гэтыя лапікі, што разлазяцца ўва ўсе бакі.

3.

Яны разлазяцца, але я прагну сцягнуць іх у адно, сшыць — няхай нават белымі ніткамі сваіх уласных версіяў і домыслаў. І тут мне патрэбна яшчэ адна тэрытарыяльная эфемерыда, такі сабе геаграфічны прывід, паралельная рэальнасць, яшчэ ўчора модная, а цяпер ужо амаль што выванітаваная на інтэлектуальных фуршэтах — Цэнтральная Еўропа. Не, не Еўропа сама па сабе, не прыцемкі яе, а цэнтр, дакладней, усход, бо ў Еўропе ўсход парадаксальным чынам там, дзе цэнтр. Цэнтральная Еўропа, дзіця Мілаша, Кундэры й Конрада, дзіўная субстанцыя з адных толькі ідэяў, пачуццяў, містыфікацыяў, амерыканская прыдумка некалькіх расчараваных дысідэнтаў. Мы стаім на парозе яе канчатковага

знікнення: вось толькі палякаў з славака-вугорцамі ўлучаць у *NATO*, а потым у Захад, ува „ўласна Еўропу“, а Ўкраіну — у адноўленую славянскую федэрацыю; вось толькі бразнуць замкі на заходніх межах нашай другой паводле значнасці саюзнай рэспублікі й на зноўку ўмацаваныя заставы выйдуць старыя памежнікі з маладымі амбітнымі аўчарамі без намызнікаў.
Вось жа, яе няма, гэтай Цэнтральнай Еўропы, дакладней, амаль што няма, як няма ў ёй Галіччыны. А ўсё, што ёсць, — гэта „амаль што“, суцэльная тэрыторыя постмадэрнізму. Які, здаецца, ніякім чынам не датычыць Ліятара, Дэрыды альбо Саіда, а, можа, іх менавіта й датычыць, але я не пра гэта.
Я пра тое, што менавіта тут, на гэтай тэрыторыі, я бачу пэўныя адзнакі таго, што сам разумею як „пост-мадэрнае“, то бок перадусім „пасля-мадэрнае“ — тое, што прыйшло пасля мадэрнізму з яго сутнасным імкненнем да мадэрнасці, да навізны як адпаведнасці часу, імкненнем, зрэшты, перарваным — брутальна, звонку, з крывёю, попелам і сусветнымі войнамі, а таксама дыктатурамі, канцлагерамі, вялізарнымі этнічнымі чысткамі — так у гэтай частцы свету спынілі, выбілі, пад корань выразалі мадэрнізм, які хочаце — венскі (эталонны), пражскі, кракаўскі, львоўскі, драгобыцкі; наўзамен прыйшла паслямадэрнісцкая паражнеча, вялікая вычарпанасць з бясконца адкрытым патэнцыялам, вялікая шматабяцальная паражнеча.
Я разумею гэтае „пост-мадэрнае“ і як недасфармаваную, але ўжо адчутую пасля-таталітарнасць. Я разумею гэта таксама як заўсёдную пагрозу з боку неататалітарызму, амёбы, што здольная запоўніць сабой кожнага ў прасторы і ўсю гэтую прастору наагул. Гістарычна мадэрнізм фармаваўся адначасна з таталітарнымі палітычнымі сістэмамі, колькі ягоных чорных квадратаў сталіся ўвасобленаю мрояй „новага чалавека“. Постмадэрнізм прыходзіць пасля таталітарызму, ён аморфны, хімерны, ён пачвара, якая адпавядае пераходнаму дэзарыентаванаму стану, разбурае колішнюю вось, пакідае адно фрагменты вертыкалі, а светлую будучыню вынаходліва падменьвае апакаліпсісам.
Існуе яшчэ адно вымярэнне „пост-мадэрнага“ ў нашай частцы свету. Гэта фактар полікультурнасці, пра які гаворыцца шмат, часта й дарэчна — толькі насамрэч гэтая полікультурнасць скіраваная ў мінулае, яна была раней, цяпер яна

пасляполікультурнасць, мы маем адно сляды, адно адбіткі. Мы маем руіны (замкаў, святыняў, фабрыкаў, мастоў, абсерваторыяў, перадусім руіны могілак, бо няма нічога прасцейшага, чым захапіць пакінутыя ўцекачамі памяшканні, але хто будзе даглядаць чужыя магілы?). Мы маем руіны, гэтыя знакі „напластавання культур“, гэтыя знакі „напластавання антыкультур“, гэтыя вымушаныя ландшафтныя калажы, гэты сапраўдны постмадэрнізм, гульню ў цагліны быцця, толькі не мы ў гэтай гульні гульцы.
Мы маем цытаты — з страчаных моваў, пісьмёнаў, дыялектаў, спаленых рукапісаў, урыўкі вершаў — фрагменты страчанай цэласці, толькі не мы жанглюем гэтымі фрагментамі. Мы маем засілле міфалогіі. Бо ў гэтай частцы свету міфалогія кампенсуе гісторыю, сямейныя паданні тут значнейшыя й верагоднейшыя за падручнікі. Зрэшты, сама гісторыя тут не больш чым гатунак міфалогіі.
Нарэшце, я разумею сваё „пост-мадэрнае“ і як правінцыйнае, маргінальнае — у тым сэнсе, у якім Цэнтральная Еўропа ніколі не магла й не хацела быць цэнтрам (што не замінала ёй увесь час апладняць цэнтры сваёю жывою спермай, перакульваць сістэмы вартасцяў, фармаваць плыні свядомасці, але я зараз нават не пра тых бажавольных выскачак, не пра ўоргалаў ды шагалаў), бо „Цэнтральная Еўропа — гэта асаблівы стан душы, асаблівы спосаб стаўлення да свету“, як кажа мой прыяцель Кшыштаф Чыжэўскі. А я адважуся дадаць: гэта такая правінцыя, дзе кожны ведае, што ён напраўду знаходзіцца ў самым цэнтры, бо цэнтр нідзе і ўсюды адначасна, а таму з вяршыняў і нізінаў уласнай майстроўні кожны можа цалкам спакойна глядзець на ўсё іншае, улучна з Нью-Ёркам ці якой-небудзь Масквой. Вось яна — адсутнасць якіх-колечы восяў, вось чалавечы хаатызм быцця, суцэльныя „суплёты“ вертыкальнага з гарызантальным і наадварот.
І гэта мне падабаецца найбольш.

4.

Уласна кажучы, мне глыбока ўсё адно, як гэта называюць. Постмадэрнізм? Няхай будзе так. Напраўду ідзецца пра іншае. Існуе покліч жыцця і покліч смерці, і я рэагую на іх, як магу. Мяне цягне то ў адзін бок, то ў другі, са мною нешта

адбываецца, я сачу змены ў самім сабе, але, на шчасце, не магу імі кіравацца. Больш за тое — я не магу даць сабе з імі рады. Мне застаецца пісаць. Мне застаецца спадзявацца, што ў сваім пісанні я адэкватны сваім рэакцыям — на большае я не прэтэндую. Мне, па вялікім рахунку, не так важна, як называюць, кваліфікуюць і класіфікуюць тое, што ў мяне атрымліваецца… нават калі ў мяне не выходзіць нічога.
Але я ніколі не пагаджуся з тым, што ў гэтым свеце ўсё ўжо адбылося.
Мабыць, акурат гэтая прыкмета дазваляе мне лічыць, што постмадэрнізм (добра, назавем гэта „постмадэрнізмам“!) — гэта там, дзе кожны з нас апынуўся сёння, гэта такая акалічнасць часу і месца, ад якой нам няма куды падзецца, тэрыторыя „паміж“ і „ўсярэдзіне“, нікому-не-належная міжцывілізацыйная, але таксама й па-над-цывілізацыйная прастора, цэнтральная дзірка ў Еўропе, тэктанічны зрух, прадонне, страчаны каментар да Галіччыны, нарэшце, сама Галіччына, расколіна паміж тысячагоддзямі, гэта смецце ўсіх нашых местаў, нашая памяць, нашая надзея, нашая самота — ты застаешся сам-насам са зблытанымі ўрыўкамі, радкамі, словамі, з алкаголем, з гарачкаю, са слэнгам і трасянкай, з усімі мовамі свету, з адной-адзінаю мовай, цябе катуе любоў, нянавісць, адчай, сэкс, ты адкрыты ўсім на свеце чалавечым хваробам і снам, думкам пра смерць, пра час і хаос, табе не менш як дзве тысячы год, і ты ўсё яшчэ не напісаў аніводнай прыстойнай кнігі.
Табе кажуць „гэта — постмадэрнізм“, ты ківаеш у адказ і зноўку занураешся ў чаканне — табе не пашчасціла, гэта вельмі ўразлівая тэрыторыя, гэта сама рэчаіснасць, але яна твая.

Пераклала з украінскай Марына Шода паводле:
Юрій Андрухович. Дезорієнтація на місцевості.
Івано-Франківськ: Лілея-НВ, 1999.
Кніга прадстаўлена ў рэдакцыю аўтарам.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **28-04-2001**
[image]

Андрэй Дынько

Resistant Culture

АНДРЭЙ ДЫНЬКО перакладчык, публіцыст, дырэктар часопісу „ARCHE“ і галоўны рэдактар газэты „Наша Ніва“. Апошні ягоны артыкул у часопісе „ARCHE“ - „Найноўшая гісторыя яцьвягаў (№6-2000).

Чаму беларускую культуру так кепска ведаюць у свеце? Чаму яна застаецца нават для суседзяў такой безаблічнай? Пры словах „польская культура“ адукаваны эўрапеец узгадае Шапэна і Кесьлёўскага, пры словах „нарвэская культура“ — Мунка і Грыга. Пры словах „беларуская культура“ максімум узгадае хіба фольк-рокераў з папулярнага ў савецкі час гурту „Песьняры“, а вось ужо ў бэрлінца найхутчэй увогуле ня ўзьнікне ніякіх асацыяцый, апроч Чарнобылю й Лукашэнкі.

Гісторыя падзелаў

Беларусы распачалі працэс утварэньня сучаснай нацыі пазьней за суседзяў, на пачатку XX стагодзьдзя, калі яны ў цэлым усё яшчэ ўяўлялі сабой традыцыйную аграрную супольнасьць. Нацыянальнае адраджэньне пачалося разам з палавіністай мадэрнізацыяй, якую несьлі расейскія каляніяльныя ўлады. Нацыянальная самаідэнтыфікацыя масы беларусаў была слабою дзеля адсутнасьці нацыянальнай буржуазіі, нацыянальнай школы (ужываньне беларускай мовы было забароненае царскім урадам) ды нацыянальнае царквы (уніяцкая царква, якая б магла адыграць падобную ролю,

пасьля далучэньня беларускіх земляў да Расеі апынулася пад уціскам, пакуль нарэшце ў 1839-м яе канчаткова не забаранілі, а ўніятаў не перавялі сілаю ў праваслаўе). Ідэнтыфікацыю з нацыянальнай супольнасьцю падмяняла „тутэйшасьць“. Горад быў небеларускі. Большасьць насельнікаў гарадоў складалі жыды-ашкеназы, якія амаль ня зьмешваліся з тутэйшым насельніцтвам. Вышэйшыя клясы былі зрусіфікаваныя або спалянізаваныя. Умоваю пад'ёму па сацыяльнай лесьвіцы быў пераход зь беларускае мовы на мову паноўнае культуры (польскую або расейскую). Таму беларуская буржуазія — як і шляхта, клер і чынавенства — выракалася сувязі зь сялянскім „народам“.

У той жа час інтэлігенты-будзіцелі атаесамлялі беларускую нацыю зь сялянствам, а ў разьвіцьці сялянскай культуры бачылі найбольш пэрспэктыўную стратэгію нацыянальнага адраджэньня.

У выніку ўрбанізацыя савецкага кшталту стала сапраўдным выклікам для беларускай сялянскай культуры і паставіла пад сумнеў само існаваньне недааформленае нацыі, нясьпелага нацыяналізму. Беларуская мова і культура сталі выцясьняцца расейскімі.

Суседнія нацыі, больш дынамічныя і агрэсіўныя, аспрэчвалі беларускую культурную спадчыну. У парыскім музэі сучаснага мастацтва *Centre Georges Pompidou* можна знайсьці творы двух вялікіх ураджэнцаў Беларусі — Марка Шагала і Хаіма Суціна. Пад палотнамі першага напісана „нарадзіўся ў Віцебску, Расея“, пад палотнамі другога — „нарадзіўся ў Сьмілавічах, Літва“. Факты кажуць, што Беларусь была таксама бацькаўшчынай лінгвіста, айца сучаснага іўрыту Эліезэра Бэн-Ягуды, клясыка польскае літаратуры Адама Міцкевіча, французскага паэта Оскара Мілаша. Пачуцьцёвая лучнасьць выхадцаў зь Беларусі зь месцамі, дзе яны нарадзіліся, ніколі не перарывалася, іхны сьпіс можна доўжыць а доўжыць, але ўпісаць іх у беларускі культурны кантэкст цяпер нялёгка. Даецца ў знакі і іншая лякуна беларускай гуманістыкі, падарванай гадамі саветчыны: трансфармацыя „ліцьвінскае“ ідэнтычнасьці ў „беларускую“ дагэтуль уяўляецца момантам разрыву, а не пераемнасьці.

Сьлед таталітарызму
і прычыны русіфікацыі

XX стагодзьдзе было для беларускай інтэлігенцыі сапраўды чырвоным — ад пралітай крыві. Краіна пабывала пад пятою нямецкага і расейскага таталітарызму. Паколькі значную долю беларускай інтэлігенцыі складалі жыды, Галакост стаў яе крывавай трагедыяй. Драмай была вымушаная эміграцыя ў Польшчу пасьля другой сусьветнай вайны соцень тысяч беларускіх каталікоў, як этнічных палякаў, так і беларусаў. Самы ж разбуральны ўдар нанесьлі беспрэцэдэнтныя сталінскія рэпрэсіі, мэтай якіх было выкараненьне любых асяродкаў культурнай апазыцыі (у 30-ыя гады 450 беларускіх пісьменьнікаў з 550 было рэпрэсавана, зь іх пераважная большасьць загінула).

Савецкі таталітарызм пакінуў цяжкі сьлед. Пачынаючы з 30-ых гадоў ад дзеячоў культуры пад пагрозай зьняволеньня або забароны на творчасьць сталі патрабаваць пасьлядоўнага саўдзелу ў дзяржаўнай палітыцы. Ішлося ня проста пра цэнзуру ці ідэалягічны кантроль, як гэта было ў краінах так званага „сацыялістычнага лягеру“. Савецкі рэжым у Беларусі ставіў задачу поўнага сьціраньня ранейшае культурнае традыцыі з усімі яе формамі і зьместамі і татальнай падмены яе культурай новага, „сацыялістычнага“ зьместу.

Ад гэтай культуры новага тыпу патрабавалася быць пасьлядоўна прапагандысцкаю, каб гарантаваць нязьменнасьць устаноўленага ладу. Ад яе патрабавалася таксама быць абапертаю на рэфэрэнцыйную расейскую культуру, каб прывязваць нацыянальную ўскраіну да мэтраполіі. Па-беларуску заахвочвалася толькі творчасьць у менш прэстыжных жанрах, тады як больш прэстыжныя жанры, такія, як кіно або опэра, былі амаль выключна расейскамоўнымі. На нацыянальнай мове дазвалялася весьці гуманітарныя навуковыя дасьледаваньні, але ўсе тэхнічныя, дакладныя і прыродныя навукі мусілі быць расейскамоўнымі. Гэтаксама існавала негалоснае вэта на пераклады з сусьветных моваў на беларускую. Кантакт беларускай думкі з сусьветам мусіў адбывацца праз расейскае пасярэдніцтва.

Беларускую культуру рэзэрвавалі для адсталай вёскі і сялянаў, для культурных рытуалаў і „мясцовага калярыту“, тым часам як гарадзкое насельніцтва і ўсе перадавыя і пэрспэктыўныя

сфэры жыцьця мусіла абслугоўваць расейская культура. Такая палітыка паводле задумы мелася прывесьці да поўнай і канчатковай асыміляцыі беларусаў па меры ўрбанізацыі краіны. А ўжо імклівасьць урбанізацыі абумоўлівалі няроўныя пабытовыя ўмовы і магчымасьці для сацыяльнай рэалізацыі ў горадзе й на вёсцы.

Русіфікацыя ў варыянце саветызацыі, паводле афіцыйнай дактрыны, разглядалася як прагрэсіўная зьява. Але, паводле плянаў савецкага ўраду, каб унікнуць пратэстаў і незадавальненьня, яна мусіла быць паступовай і негвалтоўнай. Савецкія ідэалягічная і навуковая дактрыны прадугледжвалі, што беларуская мова і культура мусяць зьнікнуць, замясьціцца расейскімі. „Чым раней мы загаворым па-расейску, тым раней мы пабудуем камунізм“, — заявіў у часе сваёй інспэкцыйнай паездкі ў Менск савецкі лідэр Мікіта Хрушчоў. Гэта спрычыняла псыхалягічны ціск на носьбітаў беларускай мовы і прыводзіла да таго, што ўсё большая колькасьць гараджанаў прымала і засвойвала расейскія культурныя коды. Дзеячы беларускай культуры і мастацтваў, якія паняволі мусілі жыць у гарадох, хоць сваёй творчасьцю і абслугоўвалі вёску, выракаліся на гібеньне ў вечным культурным гета сярод расейскамоўнай гарадзкой стыхіі. Не ўзбагачалася, а няспынна русіфікавалася беларуская мова.

Зь іншага боку, савецкая сыстэма касавала неабходнасьць вывучэньня Беларусі і беларускай культуры за межамі Савецкага Саюзу. У беларусістыцы (як і ў літуаністыцы ці ўкраіністыцы) не было патрэбы, калі была саветалёгія. У выніку на момант распаду Савецкага Саюзу беларускай мовы фактычна ніхто нідзе за межамі славянскага сьвету ня ведаў, беларускай культурай адмыслова не цікавіўся. А на Беларусь (як і на Ўкраіну ці Чачэнію) Захад глядзеў расейскімі вачыма, некрытычна засвоіўшы тэндэнцыйныя імпэрскія канцэпцыі, распрацаваныя расейскімі гісторыкамі і культуролягамі. Беларуская культура, адкрыўшы для сябе на пачатку 90-х прывабны сьвет культуры заходняй, сутыкнулася адначасова зь неразуменьнем і адсутнасьцю зваротнай сувязі. *The opening became a frustrating experience,* кажучы не па-наску.

Нізкі статус беларускае мовы і беларускае культуры быў і застаецца прамым вынікам нізкага статусу беларускамоўных беларусаў у фармальна незалежнай Рэспубліцы Беларусі, як ні

парадаксальна для замежнага вуха гэта гучыць. Афіцыйная прапаганда саветызуючага рэжыму Аляксандра Лукашэнкі паранейшаму выстаўляе беларускамоўную культуру, адноснай незалежнасьці і глыбіннай непрымірэннасьці якой баіцца, як культуру вузкага кола палітычных напаўдысыдэнтаў („або агентаў Захаду, або страшных нацыяналістаў“), загнаных у гета пісьменьнікаў („бяздарных графаманаў“) і адсталай, нецывілізаванай вёскі, у якой няма пэрспэктываў на будучыню. Менавіта гэта вымушае многіх прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі — як беларускамоўнай, так і расейскамоўнай — настойваць на неабходнасьці пазытыўнай дыскрымінацыі расейскамоўных і захадаў у падтрымку беларускамоўнае меншасьці і беларускамоўнае культуры пасьля зьмены палітычнае сытуацыі ў краіне. Толькі такія захады, на іхную думку, дапамогуць спыніць далейшую дыскрымінацыю беларускамоўных і закласьці трывалую базу беларускай дзяржаўнасьці. Падтрымка беларускай культуры была б ня проста сплатай гістарычнага доўгу і аднаўленьнем гістарычнай справядлівасьці, але і важкім унёскам у справу цэмэнтаваньня нацыянальнай ідэнтычнасьці і грамадзянскай супольнасьці ў краіне, мяркуюць яны.

Неадкрытыя здабыткі

XX стагодзьдзе было стагодзьдзем крышталізацыі культурнай ідэнтычнасьці беларусаў, але пры гэтым краіна чатырох ці пяці культураў (беларускай, расейскай, польскай, жыдоўскай плюс украінскай на поўдні) у выніку войнаў і асыміляцый ператварылася ў краіну дзьвюх культураў — беларускай і расейскай. Зрэшты, можна сказаць, што культура тут была адна, „савецкая“, ці, як фармулявала афіцыйная ідэалёгія, „нацыянальная па форме, сацыялістычная па зьмесьце“.
Путы гэтай савецкасьці былі нашмат мацнейшыя для беларускай культуры, чым для расейскай. Многае, што дазвалялася ў мэтраполіі, на нацыянальных ускраінах лічылася ідэалягічным злачынствам. Над беларускімі творцамі вісела абвінавачаньне ня толькі ў магчымым „буржуазным“ ухіле, але і ў сьмерцю караным „нацыяналістычным“, што скоўвала іх творчыя сілы і часта рабіла мастацкія здабыткі анахранічнымі. Ува ўмовах няспыннага адсмоктваньня лепшых творчых сілаў

цэнтрам імпэрыі гэткі падвойны кантроль зусім ніштожыў шанцы беларускага мастацтва на стварэньне сучасных і канкурэнтаздольных твораў. А ўсё канкурэнтаздольнае, звычайна несыстэмнае, супярэчнае афіцыйнай ідэалёгіі, так ці іначай глушылася і не выпускалася на публіку. Калі ж нечага немагчыма было схаваць ад аўдыторыі ў краіне, дык тады гэтага не дазвалялася паказваць за яе межамі — усе кантакты з замежжам ішлі праз Маскву.

Нават самыя гучныя дасягненьні беларускае культуры — такія, як кінафільмы Віктара Турава, раманы Васіля Быкава, эсэ Алеся Адамовіча, балеты Яўгена Глебава, жывапіс Міхала Савіцкага або Ізраіля Басава, габэлены Аляксандра Кішчанкі, песьні рок-гурту „Песьняры“ ці скульптура Андрэя Бембеля — або ня сталіся мастацкай зьяваю сусьветнага маштабу, або застаюцца банальна невядомымі сьвету ў сілу моўнага бар’еру ці іншых прычынаў, пра якія мы згадалі вышэй, або аказаліся прадстаўленыя за мяжою як „савецкія“ ці наўпрост „расейскія“. Найярчэйшы прыклад апошняга — сьпявачка Беларускай опэры Марыя Гулегіна. Калі яна стала салісткаю „*Metropolitan Opera*“ і „*La Scala*“, расейскія мэдыі і музычныя крытыкі сталі аднадушна пісаць пра яе як пра „расейскую сьпявачку“, хоць яна ніколі ў Расеі не жыла і не працавала.

Беларуская культура XX стагодзьдзя, ці дорачы сьвету шэдэўры высокага і чыстага мастацтва, ці паказваючы рэдкія ўзоры сэрвільнасьці, ці, наадварот, даючы незраўнаныя прыклады ахвярнасьці і трагізму, усё адно заставалася культурай, невядомай сьвету.

Яна мае за сьпінай тысячагадовую хрысьціянскую традыцыю, яна багатая спадчынаю Ўсходу і Захаду, а выросла зь перапляценьня лацінскіх, грэка-бізантыйскіх і славянскіх каранёў. Але, на жаль, на Захадзе яе яшчэ занадта часта ўяўляюць сабе як нешта экзатычнае, арыентальнае, этнаграфічнае, а ў Расеі — як нешта лякальнае, раённае ці ўвогуле як „польскую інтрыгу“. Гэтыя розныя прадстаўленьні — два бакі аднаго каляніяльнага падыходу. Тым часам беларуская культура існуе, фармуе дзяржаўніцкую сьвядомасьць, пераадольвае посткаляніяльныя комплексы і гандыкап, што сфармаваўся за гады нацыянальнай несамастойнасьці і камуністычнай дэфармацыі.

„Паэт — гэта стваральнік народу; ён дае яму сьвет для

сузіраньня, трымае ягоную душу ў сваіх руках“, — пісаў Гердэр. Гердэравы словы ўдвая слушнейшыя ў дачыненьні да нацыянальнага разьвіцьця народаў з кароткай дзяржаўнай традыцыяй. Ня толькі ў беларусаў, ува ўсіх нацый Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы, якія пачалі фармавацца запозьнена і на першым этапе нацыятворчасьці ня мелі ўласнай нацыянальнай буржуазіі: украінцаў, беларусаў, славакаў, македонцаў, басьнійцаў — пісьменьнікі, філёлягі, гісторыкі былі кавалямі нацыянальных ідэнтычнасьцяў. У Беларусі, дзе нацыятворчы працэс яшчэ не завершаны, культура адыгрывае цалкам асаблівую, выключную ролю.

Падзеленая нацыя, падзеленая культура

Лякмусавыя паперкі, што выяўляюць гістарычныя і ідэалягічныя падзелы ў сёньняшняй беларускай культуры, — гэта, па-першае, рэакцыя (ухвальная або крытычная) на спробы аўтарытарнае лукашэнкаўскае дзяржавы ўзяць культуру пад свой кантроль, а па-другое, стаўленьне да дзеяньняў у падтрымку беларускамоўнае культуры. Па-над гэтымі дзьвюма сьветапоглядным апазыцыямі паміж „дзяржаўнікамі“ і „незалежнікамі“, „беларусафіламі“ і „беларусафобамі“ існуе і моўны падзел між беларускамоўнаю і расейскамоўнаю культураю.

Беларускамоўная „несавецкая“ традыцыя дэкляруе сваю пераемнасьць з культурай дысыдэнтаў, эмігрантаў, незалежных культурных асяродкаў. Яна найчасьцей карыстаецца так званым „клясычным правапісам“, або „тарашкевіцай“, не прызнаючы зьменаў у літаратурнай норме, уведзеных у савецкі час. Сваю асноўную задачу яна бачыць у паскарэньні нацыятворчага працэсу.

Беларускамоўная „паддзяржаўная“ традыцыя гадуецца пад дахам створаных за сталінскім часам „творчых саюзаў“ і кантралюецца арганізаваным за хрушчоўскім часам Міністэрствам культуры. Яна застаецца вернай „афіцыйнаму правапісу“, або „наркомаўцы“, уведзенаму ў сталінскі час. Гэтая традыцыя бачыць сваю задачу ў абслугоўваньні дзяржаўнай палітыкі, якой бы тая ні была.

Расейскамоўная імпэрская традыцыя трымаецца расейскай нацыяналістычнай ідэалёгіі, існаваньне беларускага народу ня

лічыць дастатковай падставай для самастойнага нацыянальна-дзяржаўнага разьвіцьця, беларускую культуру ігнаруе. Для яе носьбітаў Беларусь — гэта памылка гісторыі, а Расея — скрозь, дзе гучыць расейская мова. Ва ўмовах шырокай экспансіі расейскай культуры носьбіты гэтай традыцыі пачуваюцца ў Беларусі камфортна.

Самая маладая — расейскамоўная беларусафільская традыцыя. Яе носьбіты — беларусы ў сэнсе палітычным (яны стаяць на пазыцыі незалежнасьці Беларусі, для іх дарагія тыя ж гістарычныя сымбалі й міты, што й для беларускамоўных), але ў большасьці сытуацый яны аддаюць перавагу расейскай мове і культуры. У адрозьненьне ад імпэрцаў, яны не сумняюцца ў паўнавартаснасьці беларускай мовы, беларуская культура не выклікае ў іх адпрэчваньня, яны нават пагаджаюцца на дзеяньні ў яе падтрымку, але ў адраджэньне грамадзкай ролі беларускай мовы й культуры ня вераць і лічаць іх каштоўнымі музэйнымі экспанатамі, важнымі сымбалічнымі фігурамі, але ня болей. Лішне казаць пра прыцягальнасьць гэткай культурнай мадэлі для новаўтворанай беларускай чынавенскай і бізнэсовай эліты, часта расейскага паходжаньня.

Уразьлівасьць гэткай пазыцыі — у яе дваістасьці і непасьлядоўнасьці. Слабасьць такога „крэольскага“ сьветапогляду — у тым, што крэольская культура лёгка прыўлашчваецца і размываецца культурай мэтрапольнай. Красамоўны прыклад таму — творчасьць поп-гурту *„Ляпис Трубецкой“*, яркага прадстаўніка крэольскай культуры. „Незалежная беларуская“ і „крэольская“ культурныя мадэлі найбольш папулярныя сярод моладзі. Яны й будуць вызначаць аблічча беларускай культуры заўтра. Ад іх узаемапрызнаньня залежыць пераадоленьне ўнутранага расколу ў грамадзтве. Гэтыя ўзаемапрызнаньне і ўзаемазацікаўленасьць растуць у ходзе супольнага супраціву ўсталяванаму ў краіне аўтарытарнаму рэжыму.

Культура супраціўляецца

Перад сучаснай беларускай культурай стаіць шэраг задач. Задача „разьдзяржаўліваньня“ культуры, падтрымкі незалежнай ініцыятывы. Таксама — праца па запаўненьні лякунаў, што ўтварыліся ў выніку саветызацыі: толькі

карпатлівай будзённай працай, ад перакладу сусьветнай клясыкі на беларускую мову да распрацоўкі новых навучальных курсаў, можна дабіцца культурнай паўнакроўнасьці. Важна таксама пераадолець палітычны нігілізм, тую алергію мастацтва на палітыку, што выпрацавалася як рэакцыя на савецкі ідэалягічны прымус. Нагвалт патрэбна новая ангажаванасьць дзеячаў культуры ў грамадзкія справы. На парадку дня стаіць стварэньне мас-культуры. Ад яе будзе залежаць ня толькі самааздараўленьне культурных мэханізмаў як такіх, унезалежненьне іх ад дзяржаўнага кантролю, але і, напэўна, умацаваньне беларускай дзяржаўнасьці. Разьвіцьцё беларусазнаўства, прамоцыя беларускае культуры ў сьвеце — адна з найважнейшых задач. Актывізацыя дыялёгу зь іншымі культурамі дапаможа адказаць на іншыя выклікі і надасьць упэўненасьці ў сабе, якое сёньня так не стае.

Вяртаючыся да таго, з чаго пачынаўся гэты артыкул, — да пытаньня, з кім жа пэрсанальна асацыюецца новая беларуская культура — нельга не заўважыць, што ўжо сёньня варшаўскі або кіеўскі інтэлігенты згадаюць, верагодна, паэта Славаміра Адамовіча, першага палітвязьня лукашэнкаўскага рэжыму, які прайшоў празь дзьве турмы, абвінавачаны ў тым, што ягоныя вершы зьмяшчаюць „заклікі да замаху на кіраўніка дзяржавы“, мастакоў-пэрформэраў Алеся Пушкіна (таксама „палітычны рэцыдывіст“, абвешчаны ўладамі невыязным) і Артура Клінава, або яшчэ рок-сьпевака Лявона Вольскага, саліста ангажаванай групы „NRM“. Гэта маладыя людзі, народжаныя ў 1960–70-ых, якіх ня душыць цяжар савецкае спадчыны. Яны і ствараюць новае, „чалавечнае“ і прыцягальнае аблічча беларускай культуры. Іх дзейнасьць ва ўмовах ціску аднаго з апошніх у Эўропе аўтарытарных рэжымаў захапляе сваёй сьмеласьцю, вынаходлівасьцю, нонканфармізмам, уключанасьцю ў агульнасусьветны інтэлектуальны кантэкст. І радыкальным непрыманьнем любых праяваў аўтаркіі і шавінізму.

Імёны Быкава і Някляева ў Варшаве і Кіеве цяпер таксама ведаюць ня толькі ў вузкім акадэмічным коле.

Дэманстратыўная эміграцыя патрыярха беларускай літаратуры Васіля Быкава і старшыні афіцыёзнага Саюзу беларускіх пісьменьнікаў Уладзімера Някляева былі актамі пратэсту супраць уціску свабодаў і таталітарных маніпуляцыяў масавай сьвядомасьцю ў лукашэнкаўскай Беларусі. З гэтымі

эміграцыямі беларуская культура пачала вяртаць сабе глыбіннае, прынцыповае адзінства стаўленьня да ключавых праблемаў сучаснасьці.
У змаганьні за дэмакратыю і нацыянальную незалежнасьць, у супраціве абязьлічваньню ў форме русіфікацыі беларуская культура завяршае працэс свайго сталеньня.

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]

№ 1 (15) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: **08-04-2001**
[image]

Сто беларускіх кніг XX стагодзьдзя

Паводле апытаньня чытачоў газэты „Наша Ніва“

Аўтарскія выданьні і творы*

1906
Цётка. Скрыпка беларуская (9)
Цётка. Хрэст на свабоду (17)
1908
Янка Купала. Жалейка (27)
1910
Вацлаў Ластоўскі. Кароткая гісторыя Беларусі (32)
1913
Максім Багдановіч. Вянок (59)
1914
Максім Гарэцкі. Рунь (25)
1918
Алесь Гарун. Матчын дар (18)
Браніслаў Тарашкевіч. Беларуская граматыка для школаў (33)

*** У дужках — колькасьць галасоў, пададзеных за кнігу.**

1919
Максім Гарэцкі. Дзьве душы (18)
Усевалад Ігнатоўскі. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі (31)
Аркадзь Смоліч. Геаграфія Беларусі (30)
1920
Максім Гарэцкі. Гісторыя беларускай літаратуры (16)
1921
Ігнат Абдзіраловіч. Адвечным шляхам (14)
1922
Яўхім Карскі. Беларусы (16)
Янка Купала. Спадчына, 1922–1955 (37)
1923
Якуб Колас. Новая Зямля (47)
1924
Янка Купала. Тутэйшыя (17)
Вацлаў Ластоўскі. Падручны расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік (21)
1925
Якуб Колас. Сымон-музыка (25)
Сьцяпан Некрашэвіч, Мікалай Байкоў. Беларуска-расейскі слоўнік (8)
1926
Максім Гарэцкі. На імпэрыялістычнай вайне (9)
Мітрафан Доўнар-Запольскі. Гісторыя Беларусі (16)
Вацлаў Ластоўскі. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі (18)

1927
Натальля Арсеньнева. Пад сінім небам (28)
Кандрат Крапіва. Байкі (9)
1928
Мікола Шчакаціхін. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва (9)
1929
Андрэй Мрый. Запіскі Самсона
Самасуя (15)
Адам Станкевіч. Родная мова
ў сьвятынях (11)
Аляксандар Цьвікевіч.
“Западно-руссизм” (14)
1930

Янка Маўр. Палескія рабінзоны (29)
1935
Кузьма Чорны. Трэцяе пакаленьне (9)
1936
Максім Танк. На этапах (9)
1937
Францішак Аляхновіч. У кіпцюрох ГПУ (28)
Міхась Лынькоў. Міколка-паравоз (9)
1939
Крапіва Кандрат. Хто сьмяецца
апошнім (8)
1942
Ларыса Геніюш. Ад родных ніў (20)
Язэп Найдзюк і Іван Касяк.
Беларусь учора і сяньня (16)
1955
Якуб Колас. На ростанях (31)
1956
Юрка Віцьбіч. Плыве з-пад сьвятое гары Нёман (19)
1962
Іван Мележ. Людзі на балоце (36)
1964
Янка Брыль. Птушкі і гнёзды (9)
Васіль Быкаў. Альпійская баляда (26)
Уладзімер Караткевіч. Дзікае паляваньне караля Стаха (56)
1966
Максім Гарэцкі. Камароўская кроніка (8)
1968
Уладзімер Караткевіч.
Каласы пад сярпом тваім (51)
1970
Васіль Быкаў. Сотнікаў (33)
1972
Уладзімер Караткевіч.
Хрыстос прызямліўся ў Гародні (33)
1975
Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімер Калесьнік. Я з
вогненнай вёскі (14)
Вядзьмак Лысагорскі. Сказ пра
Лысую гару (12)

1977
Уладзімер Караткевіч. Зямля пад
белымі крыламі (28)
1978
Вячаслаў Адамчык. Чужая Бацькаўшчына (12)
Уладзімер Караткевіч.
Зь вякоў мінулых (11)
1979
Ніл Гілевіч. У добрай згодзе (8)
1981
Алесь Адамовіч. Карнікі (8)
Міхась Раманюк. Беларускае народнае адзеньне (8)
1982
Васіль Быкаў. Знак бяды (46)
Уладзімер Караткевіч.
Нельга забыць (16)
Адам Мальдзіс. Беларусь у люстэрку мэмуарнай літаратуры
XVIII ст. (8)
Алесь Салавей. Нятускная краса (8)
1983
Уладзімер Караткевіч.
Чорны замак Альшанскі (42)

1984
Кастусь Тарасаў.
Памяць пра легенды (28)
1985
Сьвятлана Алексіевіч. У вайны
не жаночае аблічча (17)
Ніл Гілевіч. Родныя дзеці (20)
1986
Кастусь Тарасаў.
Пагоня на Грунвальд (18)
1987
Васіль Быкаў. У тумане (9)
Леанід Дайнека. Меч князя Вячкі (17)
Уладзімер Караткевіч. Вершы (27)
Міхась Стральцоў. Выбранае (17)
Міхась Ткачоў. Замкі Беларусі (18)
1988

Леанід Дайнека. Сьлед ваўкалака (17)
Алесь Разанаў. Вастрыё стралы (17)
Анатоль Сыс. Пан Лес (10)
1989
Васіль Быкаў. Аблава (16)
Мікола Ермаловіч.
Па сьлядах аднаго міту (26)
Сяржук Сокалаў-Воюш.
Кроў на сумётах (10)
Анатоль Цітоў. Гарадзкая геральдыка Беларусі (8)
1990
Сьвятлана Алексіевіч. Цынкавыя хлопчыкі (9)
Ларыса Геніюш. Споведзь (36)
Мікола Ермаловіч. Старажытная Беларусь (42)
Ян Станкевіч. Беларуска-расейскі (вялікалітоўска-расейскі)
слоўнік (9)
Яўген Сямашка. Армія Краёва
на Беларусі (14)
1993
Аўген Калубовіч. Крокі гісторыі (16)
Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША (16)
Янка Купала. Жыве Беларусь (11)
Юры Туронак. Беларусь пад нямецкай акупацыяй (25)
1994
Кастусь Акула. Змагарныя дарогі (19)
Уладзімер Арлоў. Таямніцы полацкай гісторыі (30)
Мікола Гайдук. Паратунак (9)
Язэп Лёсік. Творы (10)
Леанід Прончак.
Беларуская Амэрыка (8)
Вітаўт Чаропка. Імя ў летапісе (32)
1995
Рыгор Барадулін.
Эвангельле ад мамы (10)
Генадзь Сагановіч.
Невядомая вайна (40)
Вітаўт Чаропка. Храм бяз Бога (11)
1996
Вітаўт Чаропка.
Уладары Вялікага княства (15)

1998
Васіль Быкаў. Сьцяна (26)
Уладзімер Жылка. Выбраныя творы (Бел. кнігазбор) (19)
Вітаўт Чаропка. Перамога ценю (9)
1999
Уладзімер Арлоў, Генадзь Сагановіч.
10 вякоў беларускай гісторыі (8)
Кастусь Каліноўскі. За нашу вольнасьць (Бел. кнігазбор) (12)

Калектыўныя выданьні і творы*

*** У дужках — колькасьць галасоў, пададзеных за кнігу.**

Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі (28)
Архітэктура Беларусі. Энцыкляпэдыя (20)
Мысьліцелі й асьветнікі Беларусі (20)
Беларусь. Энцыкляпэдычны даведнік (18)
Этнаграфія Беларусі. Энцыкляпэдыя (14)
Скарына. Энцыкляпэдыя (13)
Ілюстраваная храналёгія гісторыі Беларусі (12)
Статут 1588 году. Сучаснае выданьне (10)
Сто пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі (10)
Археалёгія і нумізматыка Беларусі. Энцыкляпэдыя (9)
Анталёгія беларускай паэзіі (у 3 т.) (8)
Менская вясна–1996 (8)
„Наша Ніва“. Факсыміле (8)
Туга па радзіме. Паэзія беларускай эміграцыі (8)
Энцыкляпэдыя прыроды Беларусі (8)
Беларуская мова. Энцыкляпэдыя (7)
БелЭН (5)
Тлумачальны слоўнік беларускай мовы (у 5 т.) (5)
Тутэйшыя. Творчасьць сяброў таварыства (5)
ЭЛіМБел (5)
Беларускія пісьменьнікі. Даведнік (4)
Замовы. БНТ (4)
Легенды і паданьні. БНТ (4)
Лексычны атлас беларускіх народных гаворак (у 5 т.) (4)
Нарысы гісторыі Беларусі (4)
Сыны і пасынкі Беларусі (4)
Што трэба ведаць кожнаму беларусу, 1918 (4)

Беларускі праваслаўны малітоўнік (3)
Беларускія летапісы і кронікі (Беларускі кнігазбор) (3)
Гарт. Саюз Беларускіх Патрыётаў (3)
Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Т.1–15... (3)
Канстытуцыя РБ (1994) (3)
Кніга жыццяў і хаджэньняў (3)
Купала і яго час. Энцыкляпэдыя (3)
Пагоня ў сэрцы тваім і маім (3)
Памяці Івана Луцкевіча (3)
Этымалягічны слоўнік беларускай мовы (3)
Агледзіны. Зборнік вершаў беларускіх паэтаў (2)
Божым Шляхам. Малітоўнік (2)
Гісторыя беларускага мастацтва (у 6 т.) (2)
Дай божа знаць, з кім век векаваць. Беларуская народная варажба (2)
Земляробчы каляндар БНТ (2)
Круглы год. Хоку беларускіх паэтаў (2)
Курапаты (2)
Людзей слухай, а свой розум май. Казкі (2)
Ня сілай, а розумам. Беларускія народныя казкі (2)
Пазацэнзурны пэрыядычны друк Беларусі 1971/90 (2)
„Першацьвет адраджэньня“ (2)
Першы беларускі каляндар „НН“ на 1910 г. (2)
Працы Акадэмічнай канфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі (2)
Філаматы і філарэты (Беларускі кнігазбор) (2)
Энцыкляпэдыя сельскага гаспадара (2)
Беларуская народная творчасьць (2)

Ад шчырага сэрца (1)
Анталёгія беларускага апавяданьня. 2 тамы (1)
Атлас БССР, 1959, на беларускай мове (1)
Бацькаў дар. Беларускія гераічныя і фантастычныя казкі (1)
Беларуска-расейскі слоўнік, 1988 (1)
Беларуская думка XX ст. (1)
Беларуская навуковая тэрміналёгія (вып. 1–24) (1)
Беларуская савецкая энцыкляпэдыя (у 12 т.) (1)
Беларускі каляндар на 1913 г. (1)
Беларускі каляндар на 1933 г. (1)
Беларускі каляндар на 1992 г. (1)

Блакітная кніга Беларусі (1)
Бог гаворыць да сваіх дзетак. Біблейскія апавяданьні (1)
Геаграфічныя паняцьці і тэрміны. Энцыкляпэдычны слоўнік (1)
Дзень паэзіі'84 (1)
Дзіцячы фальклёр. БНТ (1)
Дыялектычны атлас беларускай мовы, 1963 (1)
Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі (1)
Жалобны фальклёр. БНТ (1)
Жарты, анэкдоты, гумарэскі. БНТ (1)
З гісторыяй на „Вы", 1994 (1)
Загадкі. БНТ (1)
Заклятае возера. Беларускія народныя казкі (1)
Збор помнікаў (у 6 т.) (1)
Зборнік „Наша Ніва", 1920 (1)
Казкі ў сучасных запісах. БНТ (1)
Кніга Беларусі. Даведнік (1)
Кроў кліча да помсты. Зборнік вершаў (1)
Крымінальнае права Беларусі (1)
Нам засталася спадчына. Кніга для дзяцей (1)
Наш Нёман (1)
Ніколі не забудзем (1)
Песьні пра каханьне. БНТ (1)
Песьняры Случчыны (1)
Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэньня (1)
Помнікі мэмуарнай літаратуры Беларусі XVIII ст. (1)
Пяць стагодзьдзяў Скарыніяны (1)
Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча (у 5 т.) (1)
Судовая мэдыцына. Падручнік (1)
Тазік Беларускі (1)
Тураўскі слоўнік (1)
Чарадзейныя казкі. БНТ (1)
Чарнобыль. Погляд празь дзесяцігодзьдзе (1)
4 + 4 + 4 (швэдзкая і беларуская паэзія) (1)
400-лецьце беларускага друку (1)
Юрыдычны энцыкляпэдычны слоўнік (1)

Аўтары найлепшых беларускіх кніг у XX стагодзьдзі

На падставе рэйтынгу ста беларускіх кніг у газэце „Наша Ніва“*

Абдзіраловіч Ігнат 14
Абрамчык Мікола
Адамовіч Алесь 34
Адамовіч Славамір 14
Адамчык Вячаслаў 19
Адамчык Міраслаў
Адважны Вінцук 4
Акінчыц Фабіян
Аколава Валянціна 2
Акудовіч Валянцін
Акула Кастусь 22
Акулін Эдуард
Александровіч Сьцяпан 6
Алексіевіч Сьвятлана 30
Аляхновіч Рагнеда
Аляхновіч Францішак 33
Андраюк Серафім
Антановіч Антон
Аркуш Алесь 2
Арлоў Уладзімер 71
Арочка Мікола 4
Арсеньнева Натальля 37
Арэшка Вацлаў 2
Асіноўскі Сьвятаслаў
Аўрамчык Мікола
Бабкоў Ігар 2
Багадзяж Мікола 3
Багданава Галіна
Багдановіч Максім 62
Багдановіч Янка 2
Байкоў Мікалай 8
Бандарчык Васіль
Баравікова Раіса 2
Барадулін Рыгор 24
Баразна Лявон 2
Бардовіч Марыя
Барскі Алесь
Барышаў Гуры 2

* **Лічба пасьля імя аўтара азначае, колькі разоў гэтае імя згадваецца ў рэйтынгу ста кніг.**
Калі лічбы няма — імя згадвалася аднойчы.

Баханькоў Арцём
Бачыла Алесь
Бельскі Алесь
Бельскі Ўладзімер
Бембель Алег 3
Бергман Аляксандра
Бірыла Мікалай
Бітэль Пятро 2
Бічэль-Загнетава Данута 2
Бобіч Ільдэфонс
Бондар Таіса 3
Броўка Пятрусь 4
Брыль Янка 36
Бугаёў Дзьмітры 2
Буйло Канстанцыя 8
Букчын Сямён
Булыка Аляксандр
Булыка Галіна
Бульба Альгерд
Бураўкін Генадзь
Бутрамееў Уладзімер 7
Быкаў Васіль 209
Бядуля Зьмітрок 16
Васілевіч Алена 2
Васілеўская А.
Васючэнка Пятро 2
Вашко Лявон
Верабей Анатоль 2
Верас Зоська
Весялкоўскі
Віж Мар’ян 6

Вініцкі Арсен 2
Вітан-Дубейкаўская Юліяна 4
Вітка Васіль 3
Віцьбіч Юрка 25
Вішнеўскі Мікола
Вольны Анатоль
Вольскі Віталь 4
Вольскі Лявон

Воўк-Левановіч Іосіф
Высоцкая Надзея 12
Вядзьмак Лысагорскі 18
Вялюгін Анатоль
Вярба Вера
Вярцінскі Анатоль 2
Вячорка Вінцук
Гайдук Мікола 10
Галавач Платон 3
Галубовіч Леанід 7
Гардзей Віктар
Гарошка Леў 4
Гартны Цішка 3
Гарун Алесь 21
Гарэлік Любоў
Гарэцкі Максім 88
Гарэцкі Радзім
Геніюш Ларыса 62
Геніюш Юрка
Гілевіч Ніл 45
Глёбус Адам 21
Гніламёдаў Уладзімер
Голубеў Валянцін
Грамадчанка Таіса
Грахоўскі Сяргей 10
Грыгор'еў Міхась 2
Грыцкевіч Анатоль
Грыцкевіч Валянцін 4
Гумянюк Юры 2
Гурло Алесь
Гуцаў Андрэй
Дайнека Леанід 41
Далідовіч Генрых 17
Дамашэвіч Уладзімер 4
Дзюбайла Павел 2
Дзядзька Квас
Доўнар-Запольскі Мітрафан 18
Драздовіч Язэп
Дранько-Майсюк Леанід 5
Дробаў Леанід 2

Дрозд-Быкоўскі Лявон
Дубавец Сяргей 10
Дубоўка Ўладзімер 15
Дубровіч Алесь
Дубянецкі Міхась
Дудар Алесь
Дудараў Аляксей
Дудзіцкі Ўладзімер 2
Емяльянчык Уладзімер 2
Ермаловіч Мікола 70
Ёрш Сяргей 2
Жаўрук Алесь
Жук Алесь 4
Жук-Грышкевіч Вінцэнт
Жук-Грышкевіч Раіса 2
Жучкевіч Вадзім 2
Жылка Ўладзімер 19
Завальнюк Уладыслаў
Законьнікаў Сяргей
Запруднік Ян 6
Зарэцкі Міхась 6
Звонак Алесь 2
Золак Янка
Зэкаў Анатоль
Зязюля Андрэй
Зянько Ўладзімер
Ігнатоўскі Ўсевалад 31

Ільляшэвіч Хведар
Іпатава Вольга 12
Кавыль Міхась
Каганец Карусь 5
Казлоў Анатоль 3
Казлоў Леў 3
Казьбярук Уладзімер
Казько Віктар 3
Калачынскі Міхась
Калесьнік Уладзімер 19
Калнін Валянцін
Калубовіч Аўген 19

Калюга Лукаш 3
Камоцкі Алесь
Канвіцкі Тадэвуш
Карамазаў Віктар
Караткевіч Уладзімер 277
Карпюк Аляксей 7
Карскі Яўхім 16
Касьцюк Міхась 2
Касяк Іван 17
Каўка Аляксей 6
Кацар Міхаіл 4
Кіпель Вітаўт 17
Кіпель Зора
Кіпель Яўхім 2
Кірвель Анатоль
Кісялёў Генадзь 12
Клышка Анатоль 4
Клышка Міхась 3
Кляшторны Тодар
Колас Якуб 120
Конан Уладзімер 2
Коршунаў Аляксандар
Коўтун Валянціна 4
Крапіва Кандрат 21
Краўцэвіч Алесь 3
Круталевіч Вадзім
Крывічанін Лявон
Кудравец Анатоль
Кузьміч Натальля
Кузьняцоў Ігар
Кулакоўскі Аляксей
Кульбак Майсей
Куляшоў Аркадзь 6
Купала Янка 129
Купрэеў Мікола 5
Кусянкоў Мікола 2
Кухаронак Тацяна
Кушаль Францішак 2
Лабынцаў Юры 2
Ладноў Яўген

Лазука Барыс
Ламека Леанід
Ласкоў Іван 2
Ластоўскі Вацлаў 81
Латышонак Алег
Левановіч Леанід
Лепешаў Іван
Лёсік Язэп 13
Ліпскі Ўладзімер 2
Ліс Арсень
Лобан Мікола
Лойка Алег 12
Лукашук Аляксандар 8
Лукша Валянцін
Луцкевіч Антон 8
Лучына Янка 6
Лынькоў Міхась 15
Лыч Леанід 5
Ляўкоў Ігар 2
Майсейчык Аляксей
Макаёнак Андрэй 7
Максімюк Ян 6
Малецкі Ян 2

Мальдзіс Адам 17
Маракоў Валеры 2
Мартыненка Вітаўт
Марціновіч Аркадзь 3
Марчук Георгі
Масарэнка Алесь 2
Масьляніцына Ірына 3
Матукоўскі Мікола 2
Маўр Янка 38
Мацкевіч Язэп
Машара Міхась
Мележ Іван 55
Мельнікаў Аляксей
Мельнікаў Андрэй
Міклашэўскі Яўген
Мікуліч Барыс 3

Мікуліч Мікола
Мінкін Алег 7
Міронаў Аляксандар
Міхневіч Арнольд
Міхнюк Уладзімер
Мішчанчук Мікалай 2
Мрый Андрэй 15
Мудроў Вінцэсь 2
Мяльгуй Анатоль
Мярляк Кастусь 2
Мясьнікоў Анатоль
Наварыч Алесь 2
Навіцкі Ўладзімер
Навічэнка Леанід
Навуменка Іван
Надсон Аляксандар
Найдзюк Язэп 16
Насевіч Вячаслаў 2
Наўроцкі Алесь 4
Некрашэвіч Сьцяпан 8
Неміроўскі Яўген
Ненадавец Аляксей
Нікалаеў Мікола 4
Нікольскі Мікалай
Новік-Пяюн Сяргей 6
Някляеў Уладзімер 2
Няфёд Уладзімер
Падокшын Сямён 3
Пазьняк Зянон 15
Палуян Сяргей 3
Пальчэўскі Алесь
Пануцэвіч Вацлаў 2
Панчанка Пімен 7
Пархута Яраслаў 2
Пацюпа Юрась 2
Петрашкевіч Алесь
Петручук Васіль 3
Пікарда Гай
Пічэта Ўладзімер
Пранчак Леанід 8

Праскураў Васіль
Процька Тацяна 2
Пташнікаў Іван 7
Пфляўмбаўм Яўгенія
Пушча Язэп 3
Пярловіч Самсон
Пяткевіч Аляксей
Пятровіч Барыс 4
Пятроўскі Ян
Рабкевіч Валянцін 3
Рагач П. (Юрка Станкевіч) 4
Рагойша Вячаслаў 3
Рагуля Барыс 2
Рагуля Васіль 3
Разанаў Алесь 37
Ракуць
Раманава Ларыса
Раманюк Міхась 8

Рапановіч Яўген
Рапэцкі Юрка 2
Рогалеў Аляксандар 2
Рубанаў Уладзіслаў 5
Русецкі Аляксей
Рыбак Алесь
Сабалеўскі Анатоль 2
Саверчанка Іван 7
Савік Лідзія
Савіцкі Алесь
Сагановіч Генадзь 49
Салавей Алесь 10
Салагуб Алесь
Саламаха Ўладзімер
Самойла Ўладзімер
Санько Зьміцер
Саньнікаў Алег
Сапач Тацяна 6
Сахута Яўген
Сачанка Барыс 10
Сваяк Казімер 5

Семашкевіч Рыгор
Семяновіч Антон
Сербантовіч Анатоль 7
Сергачоў
Сільнова Людка
Сіпакоў Янка 3
Сіўчык Уладзімер 2
Скобла Міхась
Скрыган Ян 2
Смоліч Аркадзь 30
Сокалаў-Воюш Сяржук 10
Ставер Алесь
Станкевіч Адам 16
Станкевіч Ян 20
Старычонак Зьміцер 3
Стральцоў Міхась 17
Суднік Міхась
Супрун Васіль 2
Сьцяпан Уладзімер 3
Сыс Анатоль 11
Сысоеў Уладзімер 2
Сыч Пётра
Сяднёў Масей 11
Сямашка Яўген 14
Сяркоў Іван 2
Танк Максім 19
Тарасаў Кастусь 40
Тарасаў Сяргей
Тарашкевіч Браніслаў 33
Таўлай Валянцін
Ткачоў Міхась 21
Трус Паўлюк 7
Тумаш Вітаўт 2
Туронак Юры 25
Улашчык Мікола 12
Уліцёнак Аляксандар 2
Урбан Павал 7
Усікаў Якуб
Федарэнка Андрэй 7
Хадыка Ўладзімер

Харэўскі Сяргей
Хатэнка Антаніна
Хомчанка Васіль
Цьвікевіч Аляксандар 14
Целеш Вячка
Цётка 28
Цеханавецкі Анджай
Цітова А.
Цітоў Анатоль 19
Цэлеш Вячка
Чантурыя Ўладзімер 3
Чарнышэвіч Аркадзь 2
Чарняўскі Міхась 2
Чарняўскі Ўладыслаў
Чаропка Вітаўт 71
Чарот Міхась 5
Чорны Кузьма 20
Чыгрынаў Іван 6
Шакун Леў 2
Шамякін Іван 22
Швед Віктар
Шлег Алесь 2
Шматаў Віктар
Шніп Віктар
Штыхаў Георгі 2
Шупа Сяргей 3
Шушкевіч Станіслаў
Шчакаціхін Мікола 9
Шыбека Захар
Шынклер Хвядос
Шыраеў Яўген 2
Шырма Рыгор
Юрэвіч Лявон 2
Юстапчык (Антон Адамовіч)
Юхнавец Янка 5
Юхо Язэп 9
Ядвігін Ш. 9
Якімовіч Алесь
Ялугін Эрнэст 2
Янішчыц Яўгенія 5

Янкоўскі Фёдар 9
Яновіч Сакрат 8
Ярош Міхась
Яскевіч Алена 2

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by
[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 1 (15) – 2001
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 01-05-2001
[image]

Юрась Пацюпа

Мэзальянсы, або Юрлівыя санэты

ЮРАСЬ ПАЦЮПА паэт, суўкладальнік і суаўтар анталёгіі паэзіі „Лябірынты прывіднага замку" („Бязьмежжа", Беласток, 2000), выкладчык катэдры беларускае культуры Гарадзенскага універсытэту, працуе над дысэртацыяй, прысьвечанай творчасьці Максіма Багдановіча. Жыве ў Горадні.

Кожны, хто закаханы ў санэт, ведае, што гэта найбольш складаная, дасканалая і выкшталцоная форма вершу. Але мала хто задумваецца над тым, што санэт паводле свае прыроды і найпарадаксальнейшы жанр. Эстэтычныя рэчы, супраць этычных, як ведама, імкнуцца да разнастайнасьці. Санэт жа, наадварот, у самой сваёй існасьці абапіраецца на норму. І невыпадкова першым аўтарам санэту быў нататычнае. Як жа ў такім разе ён спраўджвае сваё эстэтычнае наканаванне? Ёсьць два спосабы разьвязаньня парадоксу. Першы — эсэнцыялісцкі, плятонаўска-картэзіянскі. Пісьменьнік-эсэнцыяліст імкнецца стварыць чысты, абсалютны санэт. Можна сказаць, што ў зямных умовах ён намагаецца дасьціць самую ідэю санэту. І, натуральна, гэта яму не ўдаецца. Але кожная чарговая спроба доўжыць літаратурны ланцуг. Другі спосаб — наміналістаўскі, кінічна-бэркліянскі. Пісьменьнік-наміналіст ня верыць у існаваньне ўнівэрсаліі формы, санэт для яго цікавы толькі ў адхіленьнях ад нормы. І ён множыць бясконцыя кшталты адхіленьняў.

Пры першым спосабе існуе небясьпека скаціцца да шаблёну, трывіяльнасьці, пры другім — разбурыць сам інстытут санэту, спляжыць усякую граніцу паміж санэтам і несанэтам. І ўсё ж — я выбіраю другі, небясьпечны, але квяцісты і вясёлы шлях. Тэма каханьня і юру ў дачыненьні да санэту невыпадковая. Ёсьць нешта супольнае паміж санэтам і каталіцкаю строгасьцю маралі. Мне даспадобы жорсткія клямары каталіцкага шлюбу. Кожны, хто мае на тое адвагу, можа даваць волю юрлівым памкненьням, але не павінен забывацца, што над ім зьзяе карны меч. Пагрозьлівы меч маралі надае трагічнае харство кожнаму адступу ад нормы. Калі ж гэтае нормы няма, то нормаю становіцца слотная, шэрая і нудная мешаніна ўсёдазволенасьці, усяцечнасьці. Яна шмат нуднейшая за аднастайную ўсёпавіннасьць гэтаксама, як разьлезлыя вэрлібры нуднейшыя за клясычныя формы вершу.
Юрлівыя санэты — гэта туга па беларускім барока, ракако, клясыцызьме. Нездарма падставовымі імёнамі тут выступаюць Францішак Князьнін і Якаў Княжнін — польскі і расейскі паэты, якія паходзяць зь беларускае віцебска-смаленскае шляхты.
Аўтар

1. ДА ГРАЦЫЯЎ
канспэкт[*]

О грацыі! няўлоўныя сястрыцы,
жывой лістотай з вамі Гай шуміць,
бяз вас Краса — пакутніца ў пляніцы,
адно ёй прыдавацца і хлусіць:
усьмешак перад люстрамі вучыцца,
наводзіць бель і з ружамі ляпіць,
хаваючы на скуры ластаўніцы
і жылачак танюсенькую сіць.
Майстэракаў усіх на пасьмяяньне
ёсьць правіла у вас дзеля пісаньня:
„Красуйся, замілоўвай, захапляй“;
але, каб мэты гэтае дабіцца,
Рыторыка! ты, пэўна, выбачай:
нам трэба пацерак тваіх пазбыцца.
20 жніўня 1998 г.

[*] **У санэце заканспэктаваны верш Я. Княжніна „Тры грацыі“.**

2. ЭПІКУРЭЙСТВА
санэт-газэль-туюг

Дом на юру, вятры цалуюць юр,
у ціхім доме піша вершы Юр.
Ён наталіцца славаю пасьпеў,
ён славіць краскі, харaство і юр.
Сьцямнела. Песьню жаваранак сьпеў,
над ружай салаўя прачнуўся сьпеў,
паўнюткі сад жамчужнае расы,
дзе ўчора яблык, нібы месяц, сьпеў.
Вось за акном скрабецца дождж касы,
ідзе праз двор, што пад лязом касы
прычэсаны, і ў доме давідна
ліецца дождж расплеценай касы.
А дзе краса, дзе келіхі віна —
ня сьпее ў сэрцы горкая віна.
27 верасьня 2000 г.

3. АРАБЭСКІ
цэнтон[*]
...καί δίς γάρ, ὅ δεῖ, καλόν έντιν ένισπεῖν.
*ЕМРЕΔОКLЕО*ΥΣ[**]

У чарах млее ноч. За рэчкаю ў аддалі
гамоняць радасна паміж сабой кусты
па той бок. Што па той? І ўжо зьнікаеш ты.
Так многа шчасьця, хоць яго было так мала.
О, сэрца, ты ня плач! — яшчэ не перастала
нясьцішна гаманіць у часе цемнаты.
Пільнуеш, быццам сьмерць, гадзіны, дні, гады,
калоціцца агонь, што губіць і ўздымае.
Шкада разьбітых мар. На цёмным дне жыцьця
мінулае сваё прыпамінаю я
і кожны трэск, і стогн, і звонкі птушак сокат…
Прыходзь у гэты лес, паветра тут глытай —

[*] **Аўтары, радкі якіх скарыстаныя ў цэнтоне: М.Багдановіч (10, 11) А.Гарун (12); М.Грамыка (6);**

у хвалях возера разьліта пазалота:
Само-Сіерра, Рэйн, Аара, По, Дунай!
2 кастрычніка 2000 г.

К.Кірэенка (4);
В.Ластоўскі (14);
Г.Леўчык (5);
А.Моркаўка (7);
А.Паўловіч (1);
А.Разанаў (3, 8);
Хв.Чарнышэвіч (2, 13
Янук Д. (9).

** **… тое, што варта, можна сказаць двойчы.**
Эмпэдокль.

4. ШЧАДРЫЦА
санэт-брахікалян
…дань медовую на себе брати и уживати.
З даўнейшых актаў
…медок и гор*и*лочку дюбали.
„Прамова Мялешкі“

Сплаў
сот —
даў
мёд.
Слаў! —
год,
спраў
сплёт.
Прэч
з плеч
жаль!
Лепш
цеш
жарсьць…
4 кастрычніка 2000 г.

5. ДЗІКАЯ РУЖА

На моих глазах
сечена девица,
вопервых
розгами, потом
шиповником…
Г. Конисский
… загадалі яму трымаць за ногі Магда
каторая ўвесь
час, як яе білі,
плакала,
паказваючы яму
ўсе свае
„сакрэты“.
А. Абуховіч

Маркіз дэ Сад укладваў каталёг
сухіх мэтафізычных экзэкуцый
і так у працу дзікую залёг,
перабіраючы даўнейшыя паскудствы
усіх краёў, народаў і эпох,
што нават ён, дазнаны ў той навуцы,
прызнаны мэтр, стаміўся ды зьнямог
і меўся ўжо спаліць натхненьне ў грубцы…
Аднак — архіў тутэйшы напаткаў,
і сьлёзы пацяклі ў яго, а сьліна
юрлівая сачылася між спраў.
Эстэцтвам і эротыкай ліцьвінаў
захоплены — маркіз адно шаптаў:
„О, Беларусь, мая шыпшына!..“.
26 верасьня 2000 г.

6. МАК
аплікаваны санэт

Ночь
сладострастия
тебе даёт

* **Першы і чатырнаццаты радкі ўзятыя зь вершу Ц.Гартнага „Чырвоны мак“,**

призр*а*ки **прысьвечанага**
И н*е*ктаром **пралетарскаму**
любви кропит **змаганьню.**
ленивы маки.
К. Н. Батюшков

Чырвоны мак палае у гародзе
і расьсяе саромлівыя сны,
а месяц разьлівае па падлозе
жаночы пах, салоны і п'ян*ы*.
Дарма філёзаф духам цела глодзіць,
грызуць яго юрлівасьці асны,
і марыць ён аб тайнае гасподзе,
дзе тонкі лёд шаўковай прасьціны.
Ён прыйдзе зь нецярплівасьцю салодкай
і зловіць подых скіненай сарочкі
і начавое трапятаньне ласк.
А потым раптам спыніцца гадзіньнік,
і, быццам нетутэйшае адзеньне,
абойме кветам махравістым мак.*
9 кастрычніка 2000 г.

7. АТРУТНЫ МЁД

Кветкі азаліі і
балотнага
верасу даюць
„п'яны" мёд.
Ксэнафонт
Атэнскі ў
„Анабазысе"
піша, як гэтакім
мёдам у
Кальхідзе ледзь
не патруцілася
цэлае войска
элінаў.

О, небясьпечная жанчына,
як мёд з халоднага ляза!

Хто б на цябе што ні казаў,
мне ўсё адно, дзе ты грашыла.
Хоць ты маіх трывог прычына —
паэты любяць кветы зла.
Чым вінаградная лаза —
п'яней атрутная крушына.
Ад ягад тых гусьцеюць сны,
вядуць у нетрах карані
свой дзікі і хтанічны танец.
А калі зробіцца відно
ды ўсё на месцы свае стане —
яд ператворыцца ў віно.
8 кастрычніка 2000 г.

8. ПАЦАЛУНАК

Да ў гародзе
пастарнак,
салодка
карэньне,
Да хто ж мяне
пацалуе, вяліка
спасеньне.
*З „Курніцкага
зборніка"*

Спачатку ластаўкай мільгне,
пасьля крыху кране укусам —
і пакаштуюць вуснаў вусны:
віно чырвонае ў віне.
Ён будзе віцца клубам зьмей
праз мора дотыкаў, як вусень,
паўзьці ў нязмушаным прымусе…
Усё мацней, мацней, мацней!
І ты, ўвесь выпіты дазваньня,
пасьля абложнай навальніцы
вяртацца мусіш зноў і зноў.
Пасьля ж, караны расставаньнем,
адзін, ці ў кельлі, ці ў вязьніцы,

ад Бога меціме ш кляйно.
4 кастрычніка 2000 г.

9. САНЭТ XVIII СТАГОДЗЬДЗЯ

Я трызьніў вечным хараством прыроды,
пакуль цябе ў свой дух не залучыў
і стаў адтульным, страціўшы ключы
ад вечнасьці, спакою і свабоды.
Цкуюць мяне хваробы і нягоды,
сьцігуюць людзі, радасна б'ючы
кіём ці словам, а ў адказ: маўчы! —
такія за пачуцьці ўзнагароды.
Жыву, нібы сьляпы сярод сьляпых,
дзе кветы здрадаў, хцівасьцяў і пых,
адной шчасьлівы ружаю, табою.
Аднак я ўбогай долі не аддам,
каб заўтра і паўстаў анёл з трубою
і мне сказаў: — Вяртайся ў рай, Адам.
25 травеня 1982 г.;
16 кастрычніка 2000 г.

10. ПАРСУНА

Bożek miłości na
wąsach siadał.
F. D. Kniaźnin
…грудь твоя,
открыта мне
И только розою
одною
защищенна.
Я. Б. Княжнин

Амуры, стрэлы, ружы і лілеі
спачылі пад музэйным крышталём,
і толькі пчолы сінія ў алеі
зурну вядуць між яваю і сном.

Напісаны зарніцаю, бялее
каханы твар. Муры зрасьлі быльлём.
Агонь мяча ды ветранасьць кудзелі
хавае куфар і стары альбом.
Але бажок на вуснах — памяць збудзіць:
вось ты сукенку ўпартаю рукой
трывожна папраўляеш, вось на грудзі
зірнуў прамень і, згасшы за ракой,
пачуў, што ў ноч паціху і з запалам:
„Ах, дзейся воля Бога“, — ты сказала.
2, 10 кастрычніка 2000 г.

11. САМНАМБУЛІЗМ
драпа-санэт

Блыск урочлівы
сплываў
з прастораў на
зямлю.
К.Сваяк

Белы бэз Бэтховэна
і язьмін Вівальдзі —
хваль іх холад схованы
ў начавым паглядзе.
Ловяць кроплі ластаўкі
перад люстрам лісьця,
з млечным млівам макаўкі
дрэў пераплялiся.
У пляскатай плешчацца
шыбе шыла пчолкі,
ды блакітнай блешняю
бляск пярсьцёнка волкі.
Льецца, ліпне з ласкаю
яркая, як яшчарка.
23 чэрвеня 1999 г.;
23 кастрычніка 2000 г.

* **Чытаецца спачатку першы слупок, потым другі, а потым першы і другі ўзапар.**

** **Кажу дваяка…**
Эмпэдокль.

СЛОЎНІЧАК

асён (*мн.***асны**) вялікі асьцюк
глодзіць не даваць есьці
драпа від старажытнаісляндзкае алітэрацыйнае паэзіі
ластаўніца рабацінка
меч і кудзеля у мове сярэднявечча — мужчынскі і жаночы пачаткі
парсуна адмена партрэту
пышы калючыя выросты на расьлінах
пляніца прылада для лавеньня птушак
сьцігаваць чыніць перасьлед
туюг форма ўсходняга вершу ў выглядзе чатырохрадкоўя з трыма аманімічнымі рыфмамі
цэнтон верш, зьлеплены з вяршоўных радкоў розных твораў розных аўтараў
юр 1. узвышша;
2. поўнае імя (Юр);
3. пажадлівасьць, жартаўлівасьць

Галасуй за **ARCHE** :)
ацані… 5 - файна 4 - добра 3 - так сабе 2 - блага 1 - …
br.by

Copyright © 1998-2001 ARCHE "Пачатак" magazine. Рэдакцыя:
analityka@yahoo.com
дызайн: **mk** майстраваньне: Макса Плакса
Апошняе абнаўленьне: 04-05-2001
[image]